Вольная Беларусь салютуе Салдату Перамогі!

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 МАЯ 2010 г.
АЎТОРАК
№ 89
(26697)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ПЯЦЬ СТАЛІЧНЫХ САЛЮТАЎ

Асноўныя мерапрыемствы па святкаванні 65-годдзя Перамогі разгарнуліся ў Мінску, дзе ва ўрачыстасцях прынялі ўдзел Прэзідэнт Беларусі, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, ганаровыя госці, прадстаўнікі дзяржаўных органаў улады, ветэранскіх, грамадскіх і міжнародных арганізацый, дыпламатычнага корпусу замежных дзяржаў.

З 12.00 на працягу гадзіны каля 350 тысяч чалавек сузіралі на скрыжаванні праспектаў Пераможцаў і Машэрава парад войскаў Мінскага гарнізона і спартыўна-моладзевае шэсце. На пляцоўцы каля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі а 14-й гадзіне пачаўся святочны канцэрт майстроў мастацтваў. Прыкладна ў той жа час на ўзбярэжжы ракі Свіслач і праспекце Пераможцаў, ля Палаца спорту праходзіла народнае гулянне «У пасляваенным Мінску». Увечары на пляцоўцы каля Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета адбыўся канцэрт-баль «Майскі вальс». У 20.30 ля абеліска «Мінск — горад-герой» каля 40 тысяч мінчан і гасцей горада далучыліся да сімфанічнага канцэрта «Салют пераможцам», які завяршыўся сапраўдным святочным салютам. Дарэчы, салют быў дадзены ў пяці пунктах сталіцы.

Не зусім удалае надвор'е не перашкодзіла жыхарам і гасцям Мінска атрымаць задавальненне ад святочнай дзеі. У гарадскіх і раённых мерапрыемствах узялі ўдзел больш як 500 тысяч дарослых і дзяцей.

Святлана МАРОЗАВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

УЛАДЗІМІР МАКЕЙ УЗЯЎ УДЗЕЛ У СВЯТОЧНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАХ У СЕВАСТОПАЛІ

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей сумесна са сваімі ўкраінскім і расійскім калегамі -- кіраўнікамі прэзідэнцкіх адміністрацый Сяргеем Левачкіным і Сяргеем Нарышкіным 9 мая ў Севастопалі ўзялі ўдзел ва ўрачыстых мерапрыемствах з нагоды 65-годдзя Вялікай Перамогі. Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта Украіны.

Кіраўнікі адміністрацый усклалі кветкі да абеліска Славы на мемарыяльным комплексе «Сапун-гара», прысутнічалі на ваенным параде ў Севастопалі, пакантактавалі з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны на Прыморскім бульвары.

Уладзімір Макей, Сяргей Левачкін і Сяргей Нарышкін правялі таксама рабочую нараду, падчас якой абмеркавалі ход падрыхтоўкі сустрэчы прэзідэнтаў Украіны, Расіі і Беларусі на стыку межаў трох дзяржаў. Акрамя таго, бакі абмеркавалі пытанні паляпшэння ўзаемадзеяння паміж прэзідэнцкімі адміністрацыямі.

Напярэдадні 9 мая ў Маскве адбыўся нефармальны саміт кіраўнікоў — дзяржаў СНД з удзелам прэзідэнтаў Беларусі, Расіі і Украіны Аляксандра Лукашэнкі, Дзмітрыя Мядзведзева і Віктара Януковіча. У сувязі з 65-годдзем Вялікай Перамогі кіраўнікі дзяржаў у прысутнасці ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны трох брацкіх краін адкрылі памятны знак у гонар гарадоў, удастоеных ганаровага звання Расійскай Федэрацыі «Горад вайсковай славы».

Прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч, звяртаючыся да прысутных на мерапрыемстве ветэранаў і беларускага і расійскага прэзідэнтаў, запрасіў іх у бліжэйшы час наведаць помнік Народу-Вызваліцелю, які адкрыўся напярэдадні на стыку межаў трох дзяржаў.

Людміла СЦЯПНОВА, БЕЛТА.

Прамая лінія

АБ СПРАВАХ САРДЭЧНЫХ

мы пагаворым на нашай чарговай «прамой лініі», у якой возьмуць удзел **загадчык інфарктнага аддзялення № 2 10-й мінскай гарадской клінічнай бальніцы Наталля Якаўлеўна ПАЛЯЎКОВА** і **ўрач-кардыёлаг таго ж аддзялення Ірына Віктараўна ГРЫШЫНА.** У нашых гасцей вы зможаце запытаць пра хваробы, звязаныя з артэрыяльным ціскам, пра тое, як папярэдзіць інфаркты і інсульты, пра лячэнне гэтых паталогій і рэабілітацыю пасля іх.

«Прамая лінія» адбудзецца СЁННЯ з 16.00 да 17.30 па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.

ISSN 1990 - 763X

ПАСЛУГІ СЯДЗЕЛКІ АДЗІНОКІМ ВЕТЭРАНАМ ВАЙНЫ — БЯСПЛАТНА

У Беларусі прапрацоўваецца пытанне аб аказанні бясплатных паслуг сядзелкі адзінокім ветэранам Вялікай Айчыннай вайны.

БЕЛТА.

ПАДЗВІГ САВЕЦКАГА НАРОДА ЗАЎСЁДЫ БУДЗЕ ШАНАВАЦЦА Ў БЕЛАРУСІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 9 мая прыняў парад войскаў Мінскага гарнізона ў азнаменаванне 65-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і паглядзеў спартыўна-моладзевае шэсце. Святочныя мерапрыемствы, што праходзілі каля стэлы «Мінск — горад-герой», сабралі ў агульнай колькасці амаль 350 тыс. мінчан і гасцей сталіцы.

Упершыню падчас ваеннага парада была аб'яўлена нацыянальная мінута маўчання. На 60 секундаў усе дзяржаўныя і прыватныя беларускія тэлеканалы і радыёстанцыі спынілі вяшчанне, каб ушанаваць памяць загінулых у гады вайны.

Прэзідэнт таксама наведаў Свята-Духаў кафедральны сабор, дзе па традыцыі паставіў свечку ў памяць аб загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Выступленне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Рыгоравіча ЛУКАШЭНКІ на парадзе войскаў Мінскага гарнізона ў азнаменаванне 65-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 9 мая 2010 года

Фота БЕЛТА.

Дарагія ветэраны!

Таварышы салдаты, сяржанты, прапаршчыкі, афіцэры і генералы!

Паважаныя суайчыннікі і замежныя госці!

Сардэчна віншую вас з 65-й гадавінай Вялікай Перамогі.

Кожны год у святы для нас дзень 9 мая мы аддаём даніну вялікай павагі бяспрыкладнаму подзвігу савецкага народа. Нізка схіляем галовы перад загінулымі на палях бітваў і тымі, хто быў закатаваны ў канцлагерах. Ушаноўваем і славім усіх, хто ўнёс свой уклад у пазбаўленне чалавецтва ад нацызму.

У памяці народнай назаўсёды застануцца самаадданасць і мужнасць тых, хто вытрымаў цяжэйшыя выпрабаванні і перамог у самай бязлітаснай вайне мінулага стагоддзя.

Значэнне той Перамогі для ўсяго чалавецтва будзе вечным. Яна стала сімвалам перамогі жыцця над смерцю, свабоды над рабствам, гуманізму над расізмам. Здзейсніла справядлівую адплату агрэсіі і насіллю. Вынесла суровую ацэнку неразумным амбіцыям і ідэям аб сусветным панаванні.

Для беларускага народа Дзень Перамогі мае лёсавызначальнае значэнне. Наша рэспубліка ў ваеннае ліхалецце пацярпела як ніводная краіна ў свеце. У выніку бесчалавечнага генацыду краіна страціла трэць свайго насельніцтва. Была знішчана ўся інфраструктура, аб якой нагадваў толькі попел спаленых вёсак і руіны некалі квітнеючых гарадоў.

Нямала краін удзельнічала ў бітве супраць агрэсара. Але гістарычная праўда ў тым, што вырашальную ролю ў антыфашысцкай барацьбе адыграў Савецкі Саюз. Менавіта ён стаў той сілай, якая змяніла характар Другой сусветнай вайны, прадвызначыла яе вынік. Вырашыла лёс не толькі нашай Радзімы, але і многіх іншых дзяржаў і народаў, па сутнасці — усёй міжнароднай супольнасці.

На жаль, усё часцей знаходзяцца людзі, якія аплачаную мільёнамі жыццяў праўду імкнуцца падмяніць сурагатамі, прыніжаючымі значэнне Вялікага Подзвігу нашага салдата і партызана-падпольшчыка, ачарніць патрыётаў, якія змагаліся за вызваленне сваёй краіны. Яшчэ горш, што такія спробы сталі перарастаць у палітычную тэндэнцыю.

Сёння неабходна зрабіць усё магчымае, каб спыніць рэвізію гісторыі.

Тады, у сорак першым, адбылося не проста сутыкненне дзяржаў і вялікіх ваенных патэнцыялаў. Гэта была ўсёабдымная бітва розных палітычных сістэм, процілеглых маральных і духоўных каштоўнасцяў. І мы атрымалі ў ёй перамогу.

На абарону Айчыны ўзняўся ўвесь народ. Менавіта таму гэта вайна навекі ўвайшла ў гісторыю як Вялікая Айчынная вайна.

Важнейшы складнік перамогі — моцнае братэрства савецкіх людзей розных нацыянальнасцяў. 9 мая — агульнае свята для Беларусі, Расіі, Украіны, усіх краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў. І сёння ў парадным страі ў Мінску, Маскве і Кіеве плячо ў плячо стаяць ваеннаслужачыя брацкіх славянскіх краін.

Памяць пра гераічны подзвіг — свяшчэнная. Аднак, каб пазбегнуць трагічных памылак, з вопыту мінулага неабходна зрабіць правільныя высновы.

Мы заклікаем усе краіны свету не ігнараваць новыя выклікі і небяспечныя тэндэнцыі, якія пагражаюць нашай бяспецы.

Дарагія суайчыннікі!

Складаная сучасная абстаноўка прад'яўляе павышаныя патрабаванні да ўмацавання абараназдольнасці нашай дзяржавы. Для гэтага мы зробім усё неабходнае. Асноўная ўвага — забеспячэнню высокага ўзроўню развіцця Узброеных Сілаў.

Памятаючы ўрокі вайны, мы ўсведамляем, што для нас няма нічога важнейшага, чым забеспячэнне міру, дабрабыту народа і незалежнасці нашай дзяржавы. Менавіта на гэта накіравана наша палітыка.

Дарагую спадчыну — свабоду і незалежнасць — трэба не толькі шанаваць, але і абараняць ад палітычных і эканамічных пагроз любымі сродкамі.

Дарагія сябры!

Усе нашы планы накіраваныя на дасягненне асноўнай мэты — стварэнне ўмоў для дастойнага жыцця беларускага народа.

Нам не патрэбна чужога, свой дабрабыт мы створым самі. Толькі працай, упартай, штодзённай і плённай, мы зробім родную Беларусь моцнай і квітнеючай дзяржавай.

Трэба верыць у свае сілы, умацоўваць адзінства нацыі і з'яднаць грамадства. Толькі так дасягаецца перамога. Гэта і ёсць праява вышэйшага маральнага духу непакоранага і паважаючага сябе народа!

Аптымізм і кансалідацыя сілаў — ключ да поспеху. Гэты дэвіз пакалення пераможцаў заўсёды будзе актуальны і запатрабаваны.

Пашана і слава абаронцам Радзімы!

Вялікі дзякуй вам, дарагія ветэраны, за тое, што падарылі нам жыццё. Вы можаце быць упэўненыя, што ў Беларусі нязгасны подзвіг савецкага народа будзе шанавацца заўсёды.

Здароўя, міру, шчасця і дабрабыту ўсім, дарагія сябры.

Няхай жыве наша Айчына — Рэспубліка Беларусь!

Ура, таварышы!

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«МЫ НЕ ПАВІННЫ ДАЗВОЛІЦЬ АДНЯЦЬ ПЕРАМОГУ Ў СВАЙГО НАРОДА»

Вытокі адзінства Еўропы — у Перамозе 1945 года. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на ўрачыстым сходзе, прысвечаным 65-й гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў сусветнай гісторыі нямала памятных дат і падзей. Многія з іх, якія здаваліся важнымі іх удзельнікам і сучаснікам, сцерліся і пацьмянелі як старыя манеты. Але ёсць тыя, якім наканавана было стаць водападзелам у развіцці чалавечай цывілізацыі і ператварыць свет. У старажытнай гісторыі такой падзеяй стала ўзнікненне хрысціянства. У навейшай гісторыі — Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне.

«Вялікая Перамога» — так назвалі яе шэсць з паловай дзесяцігоддзяў таму мільёны жыхароў Еўропы, якія са слязьмі на вачах сустракалі вызваліцеляў.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, Вялікая Перамога прынесла доўгі і трывалы мір. Літаральна на вачах адбылося тое, што можна лічыць цудам гісторыі. Еўропа, на тэрыторыі якой тысячы гадоў бесперапынна вяліся сотні вялікіх і малых войнаў, ракой цякла кроў, нечакана прымірылася і супакоілася. Гістарычныя ворагі сталі калі не сябрамі, дык, прынамсі, партнёрамі. Нацыі, якія сотні гадоў змагаліся адна з адной, пачалі будаваць агульны еўрапейскі дом.

«І сёння тыя, хто ганарыцца адзінствам Еўропы, павінны разумець: вытокі адзінства ў Перамозе 1945 года», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Мільёны савецкіх салдатаў, мільёны беларусаў, якія змагаліся і палі ў Вялікай Айчыннай, не проста выратавалі ўсіх нас, не проста вызвалілі свет ад нацысцкай поскудзі — менавіта яны далі магчымасць Еўропе стаць такой, якая яна ёсць сёння, спакойнай і паспяховай.

65 гадоў на землях Германіі, Францыі, Брытаніі, Швецыі, Польшчы і іншых еўрапейскіх краін не грыміць канапада, не рвуцца бомбы і не льецца кроў. «І гэта — заслуга нашага салдата і партызана, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мы не проста вызвалілі Еўропу — мы прынеслі ёй мір на дзясяткі гадоў. Нам, нашчадкам Перамогі, пераемнікам мужнасці мінулых пакаленняў, трэба ганарыцца гэтым і, самае галоўнае, зберагчы каштоўную спадчыну».

Беларусь не павінна дазволіць адняць Перамогу ў свайго народа, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што апошнім часам тэма Другой сусветнай вайны знаходзіцца ў цэнтры ўвагі палітычных лідараў і прэсы. І кожны спрабуе з гісторыі атрымаць максімальную выгаду для сябе. Трактуюць падзеі так, што быццам бы Захад і ЗША выйгралі вайну і з'яўляюцца гарантамі глабальнай бяспекі на працягу дзесяцігоддзяў. Яшчэ горш, што спробы быццам бы пераасэнсавання гісторыі робяцца ў «незалежных» беларускіх «газецінах» і «свабоднымі дзеячамі культуры».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Не будзем прымяншаць заслуг ні адной з дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі. Але і адняць Перамогу ў сябе і свайго народа таксама не дазволім», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, нельга забываць, на каго быў накіраваны і хто адбіў асноўны ўдар фашысцкай агрэсіі. Гітлераўская Германія абрушыла на Савецкі Саюз гіганцкую моц. Працягласць савецка-германскага фронту ў чатыры разы пераўзыходзіла ўсе заходнія франты разам узятыя. Нямецкія салдаты ведалі: Усходні фронт — гэта пекла, з якога вяртання і выратавання няма. Менавіта на яго прыпала 72 працэнты людскіх стратаў вермахта і СС.

Толькі ў Брэсцкай крэпасці гітлераўцы страцілі столькі ж жывой сілы, колькі ў час усёй французскай кампаніі. Бой каля Брэста стаў пачаткам бітвы за Берлін. У радах Чырвонай Арміі змагаліся 1,3 млн ураджэнцаў Беларусі. Амаль паўтысячы сталі Героямі Савецкага Саюза.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўнікальнай з'явай, якая не мае аналагаў у гісторыі, з'явіўся рух супраціўлення ў Беларусі. Так званы другі фронт быў адкрыты не ў 44-м годзе і не ў Нармандыі, а значна раней, у беларускіх лясах і балотах, куды змагацца за Радзіму ішлі цэлымі сем'ямі.

На ўсёй тэрыторыі вялікага Савецкага Саюза было каля 1 млн партызан. Пры гэтым толькі ў Беларусі — больш як 800 тыс. народных мсціўцаў. 27 красавіка 1943 года Гітлер аб'явіў партызанам вайну і загадаў лічыць барацьбу з імі раўназначнай баявым дзеянням на франтах. За гады акупацыі беларускія партызаны знішчылі больш як 500 тыс. салдатаў і афіцэраў праціўніка — прыкладна столькі ж склалі страты гітлераўцаў у баях пасля адкрыцця другога фронту ў Еўропе.

Рэйкавая вайна, якая разгарнулася на беларускай зямлі, амаль удвая скараціла пастаўкі германскіх войскаў і стала залогам поспеху буйных наступальных аперацый Савецкай Арміі 1943—1944 гадоў, якія адкрылі шлях да поўнага вызвалення прыгнечанай, зняважанай і пастаўленай да таго часу на калені Еўропы. «Ці гэта не адказ тым пісакам, якія спрабуюць ачарніць партызанскія старонкі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны!» — сказаў Прэзідэнт.

СТАР. 2

«МЫ НЕ ПАВІННЫ ДАЗВОЛІЦЬ АДНЯЦЬ ПЕРАМОГУ Ў СВАЙГО НАРОДА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Набліжалі агульную перамогу над ворагам і працаўнікі тылу. У ваенным сорак другім завод «Гомсельмаш» выпускаў прадукцыі ў 6 разоў больш, чым напярэдадні вайны. А ў сорак трэцім перасягнуў гэты ўзровень ужо ў 14 разоў.

Вялікая Перамога — вечная крыніца нацыянальнай гордасці, апора ідэалогіі і дзяржаўнасці, тая знакавая гістарычная падзея, якая аб'ядноўвае пакаленні, заявіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што «такога адзінства», святога брацтва і веры, як у гады вайны, яшчэ не ведала гісторыя». Героямі станавіліся не толькі асобныя людзі, але і цэлыя населеныя пункты. Агульнанародны подзвіг вырашыў зыход Другой сусветнай вайны.

«Спіс пацярпелых нашых землякоў асобна вылучаецца на кантыненце, таму што такога страшэннага ўрону не пацярпела ні адна еўрапейская дзяржава, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мы помнім пра ўсіх: пра тых, хто змагаўся ў акопах, партызаніў, змагаўся ў падполлі, хто самаадданa працаваў на працоўным фронце, хто зведаў жахі канцлагераў».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, памяць аб той вайне мацнейшая за час. «Можа, таму, што шматпакутная Беларусь страціла кожнага трэцяга свайго жыхара, а таксама з-за абвостранага пачуцця справядлівасці і сумленнасці, якія ўласцівы нашай нацыі, яшчэ паўтара дзесяцігоддзя таму, у гады палітычных смутаў і звяржэння ідэалаў, наша краіна першай на ўсёй постсавецкай прасторы ўзняла тэму непарушнасці і святасці памяці аб народным подзвігу», — адзначыў беларускі лідар.

Беларусь можа адказаць усім, хто робіць замах на інтарэсы краіны, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сёння поспехі Беларусі раздражняюць некаторых. «Усё, чаго мы дасягнулі, далёка не ўсім падабаецца, нават нашым блізкім сябрам, суседзям, — падкрэсліў беларускі лідар. — Зайздрасць — гэта страшная сіла, яна раз'ядае найбольш. Гэта адна з прычын таго націску на Беларусь, які адчуваецца сёння».

«Калі пачаўся сусветны крызіс, я першы і да гэтага часу, напэўна, адзіны кіраўнік дзяржавы, які адкрыта сказаў: крызіс — гэта вынік сусветнай карупцыі, — падкрэсліў Прэзідэнт. — У мяне няма фактаў, каб сказаць, што прычына гэтага крызісу — жаданне перадзяліць свет. Але тое, што адбываецца сёння, у гэтыя крызісныя гады, месяцы, сведчыць пра гэта. Трэба было прыбраць да рук краіны, якія сталі на шлях развіцця, пачалі набіраць сілу. Гэта не падабаецца вы ведаеце каму, у каго свярбяць рукі, у каго жыццёвыя інтарэсы па ўсёй планеце. У іх і ў Беларусі жыццёва важныя інтарэсы. У іх ва Узбекістане, Туркменістане, Таджыкістане, Афганістане, Пакістане, на Блізкім Усходзе, у Лацінскай Амерыцы іх жыццёвыя інтарэсы».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што «заўсёды задаваўся пытаннем: а дзе нашы жыццёвыя інтарэсы і тых народаў, якія там жывуць».

«Гэта галоўная прычына таго, што адбываецца сёння. І гэты перадзел не абавязкова павінен быў адбывацца сілай, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Метады розныя».

Паводле слоў Прэзідэнта, «свет сёння настолькі рушыў наперад, што перарабіць яго можна без вайны». «Там, дзе не атрымліваецца без вайны, там пачынаюць ваяваць. Колькі сёння ў свеце гарачых пунктаў і колькі гатовых узнікнуць, і ў якіх месцах, вы ведаеце, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — І тыя, хто сёння, закасаўшы рукавы, узяўся за перадзел свету, разумеюць, што такія, як Беларусь, а іх шмат, могуць адказаць, непрымальна адказаць. І мы адкажам, калі трэба будзе. Мы павінны абараніць сваю зямлю».

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ДЗЕЦІ ХОЧУЦЬ ВЕДАЦЬ ПРА ВАЙНУ

УВЁСЦЫ Парэчча Пухавіцкага раёна ўстаноўлены ўнікальны помнік Праведнікам Народаў свету. Да помніка вядзе сцежка, высыпаная шчэбнем, а абапал яе 40 падсвечнікаў. Падсвечнікі сімвалізуюць 40 выратаваных душ. Менавіта столькі яўрэйскіх дзяцей падчас Вялікай Айчыннай вайны хавалі ў сваіх хатах мясцовыя жыхары.

За пару дзён да поўнага знішчэння Мінскага гета некаторым дзецям удалося ўцячы адтуль. Некалькі дзён малыя хаваліся ў трубах Мінскага вакзала, пасля рушылі да магілёўскай шашы. Групу вывеў 13-гадовы хлопчык, які ведаў, што ў Пухавіцкім раёне дзейнічае партызанскі атрад імя Кутузава. Тут разглядалася ідэя аб стварэнні партызанскага дзіцячага дома. Але гэта мог быць вельмі небяспечны прыстанак для малых, бо партызаны вялі жорсткія баі з карнікамі. Вырашана было звярнуцца па дапамогу да вяскоўцаў з невялікай вёскі Парэчча. Малых проста выстраілі парамі і павялі па вёсцы. З хат выходзілі людзі і моўчкі разбіралі дзяцей: хто аднаго, хто двух, а хто і трох.

— Калі мы толькі пачыналі збіраць інфармацыю пра вёску Парэчча, тэма Халакосту яшчэ не была такой вядомай як цяпер. Гэта ў сучасным падручніку па гісторыі Беларусі можна пачытаць пра паняцце Праведнік народаў свету. Прысваеннем гэтага звання займаецца Ізраільскі мемарыяльны інстытут катастрофы і гераізму «Яд Вашэм». У Беларусі многа праведнікаў, якія ў гады вайны рызыкавалі сваім жыццём дзеля выратавання яўрэяў. У Парэччы такое званне было прысвоена шасці жыхарам, і гэта толькі тым, па кім удалося сабраць дакументы, сведчанні аб выратаваных душах, — расказвае настаўніца гісторыі сярэдняй школы №1 пасёлка Дружны Ірына Шаўчонак. — Безумоўна, парэчанцы моцна рызыкавалі і сваім жыццём і жыццём сваіх дзетак, прымаючы такую вялікую колькасць яўрэйскіх малых на акупаванай тэрыторыі. Мы гутарылі з адным з жыхароў вёскі, якому было гадоў пад 90, і ён узгадваў ваенныя гады. Распавядаў, што калі ў вёсцы даведваліся, што тут павінны з'явіцца немцы, малых, каб яны не патрапілі фашыстам на вочы, на лодках перапраўлялі праз рэчку ў партызанскі атрад.

Адну са сваіх вучаніц, якая зацікавілася тэмай «Старонкі гісторыі Пухавіцкага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны праз гісторыю помнікаў», Ірына Валер'еўна садзіла на ўласную машыну, і яны ехалі на месца, фатаграфавалі помнікі, шукалі сведкаў. Так яны пабывалі ў Парэччы, у Прыстані (вёсцы, якую фашысты спалілі ў вайну), Вузлянах (дзе 49 гвардзейцаў-артылерыстаў амаль тры гадзіны стрымлівалі нямецкія войскі, якія хацелі вырвацца з «Мінскага катла»)... Дзяўчынка, якая ўзялася распрацоўваць гэтую тэму, тады вучылася ў восьмым класе і гэты перыяд гісторыі яшчэ не вывучала ў школе. Матэрыял збіраўся па крупінках: з краязнаўчай літаратуры, з публікацый мясцовых газет, з асабістых даследаванняў. Падчас якіх, дарэчы, было заўважана, што ўжо цяпер ваенная гісторыя пакрысе пачынае забывацца. Пра пэўныя ваенныя падзеі могуць згадаць у асноўным людзі, што жывуць там, дзе ўсё адбывалася, а калі ад'ехаць кіламетраў на 20—30, ніхто нічога не раскажа.

— Для многіх сучасных дзяцей што Другая сусветная вайна, што вайна 1812 -га — проста старонкі гісторыі, аднолькава нешта далёкае. Пакаленне, якое вучыцца цяпер, ужо эмацыйна не адчувае Вялікай Айчыннай вайны, мала ў каго засталіся ў жывых дзяды і прадзеды, якія ім могуць расказаць пра яе. І сёння, каб да дзяцей дайшло гэтае разуменне вайны, мы імкнёмся знайсці новыя метады працы, ладзім гістарычныя вечары, запрашаем ветэранаў, адшукваем факты, якія могуць зачапіць. Калі праз эмоцыі, праз сябе дзеці будуць прапускаць гэтую інфармацыю, яны будуць лепей разумець гісторыю. А што, як не мясцовы матэрыял, падыходзіць да гэтага лепей?

І гэта дзейнічае. І дзеці хочуць ведаць пра вайну. Яны гатовыя прыходзіць на дапамогу ветэранам, якіх, дарэчы, у самім пасёлку Дружны вельмі мала. Напрыклад, яшчэ перад Вялікаднем школьніцы наведвалі адну бабулю-ветэрана і не проста распытвалі пра вайну, а імкнуліся быць карыснымі: прыбралі дом, схадзілі ў краму, прыгатавалі ежу... У школе захоўваюцца папкі са школьнымі работамі пра вайну, хлопчыкі і дзяўчынкі запісвалі ўспаміны сваіх сваякоў, якія перажылі ваеннае ліхалецце. Адчуваецца, як дзецьмі перажываецца гэтая інфармацыя. Такая праца мяняе адносіны дзяцей не толькі да гісторыі — да свайго краю, да родных, да жыцця наогул.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРЫНЯЎ УДЗЕЛ У НЕФАРМАЛЬНЫХ СУСТРЭЧАХ КІРАЎНІКОЎ ДЗЯРЖАЎ — ЧЛЕНАЎ АДКБ І КІРАЎНІКОЎ ДЗЯРЖАЎ — УДЗЕЛЬНІЦ СНД

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 8 мая, знаходзячыся з рабочым візітам у Расійскай Федэрацыі, прыняў удзел у нефармальных сустрэчах кіраўнікоў дзяржаў — членаў АДКБ і кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц СНД.

У расійскай сталіцы прайшлі таксама мерапрыемствы, прысвечаныя 65-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Аляксандр Лукашэнка разам са сваімі расійскім і ўкраінскім калегамі Дзмітрыем Мядзведзевым і Віктарам Януковічам прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця памятнага знака ў гонар гарадоў, удастоеных ганаровага звання Расійскай Федэрацыі «Горад воінскай славы». Цырымонія адбылася ў Аляксандраўскім садзе.

Выступаючы на цырымоніі, Прэзідэнт Беларусі назваў гэта мерапрыемства вельмі сімвалічным. «Гэта прадаўжэнне слаўных традыцый на святым месцы ў памяць Вялікай Перамогі», — падкрэсліў ён.

Кіраўнік беларускай дзяржавы заявіў, што прэзідэнты трох краін поўныя рашучасці захаваць памяць пра подзвіг у гады Вялікай Айчыннай вайны. «І што мы сёння разам — сведчанне таго», — дадаў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі свята шануюць памяць аб тых гадах. «Мы заўсёды пасля распаду СССР на самым высокім узроўні адзначалі гэта свята, — сказаў ён. — Хачу запэўніць усіх расіян, усіх украінцаў, маіх калег з Расіі і Украіны: вы заўсёды можаце разлічваць на беларусаў. Калі мы разам — мы непераможныя, як бы гэтага каму ні хацелася».

Звяртаючыся да прысутных на цырымоніі ветэранаў з Беларусі, Расіі і Украіны, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «А вам адзін загад: жыць як мага даўжэй. Са святам Вялікай Перамогі!»

Пасля завяршэння цырымоніі прэзідэнты трох краін усклалі кветкі да памятных знакаў 12 гарадоў-герояў.

У гэты ж дзень у Маскве адбыўся нефармальны саміт АДКБ. На разгляд прэзідэнтаў былі вынесены пытанні па абстаноўцы ў Кыргызстане, а таксама аб сітуацыі ў сувязі з падпісаннем дагавора паміж Расіяй і ЗША аб мерах па далейшым скарачэнні і абмежаванні стратэгічных наступальных узбраенняў.

Як лічыць беларускі бок, АДКБ праявіла недастатковую кемлівасць, рэагуючы на падзеі ў Кыргызстане. У складаны момант члены Арганізацыі не змаглі сабрацца і выказаць кансалідаваную думку наконт гэтых падзей.

На думку беларускага боку, менавіта тут павінен быў праявіць сябе Сакратарыят Арганізацыі, які не ў поўнай меры задзейнічаў існуючыя ў яго магчымасці. Толькі пасля заяўленай кіраўніком беларускай дзяржавы пазіцыі па гэтым пытанні Сакратарыят правёў 27 красавіка пасяджэнне Групы высокага ўзроўню, на якім, аднак, нягледзячы на прапановы беларускага боку, так і не былі выпрацаваны агульныя падыходы адносна калектыўнага рэагавання на сітуацыю ў Кыргызстане.

Беларускі бок выказаў меркаванне аб неабходнасці ўвесці сітуацыю ў Кыргызстане ў прававое рэчышча. Пры гэтым беларускі бок лічыць, што нармалізацыя абстаноўкі ў Кыргызстане, вяртанне яе ў прававыя рамкі павінны праводзіцца выключна мірнымі палітычнымі спосабамі і сродкамі.

Беларусь разглядае Курманбека Бакіева легітымным прэзідэнтам Кыргызстана, пакуль у краіне не будуць праведзены прэзідэнцкія выбары або іншым легітымным чынам адбудзецца адстаўка дзейнага кіраўніка дзяржавы.

Беларускі бок настойвае на прыняцці мераў па павышэнні эфектыўнасці АДКБ. Далейшыя перспектывы гэтай важнай рэгіянальнай арганізацыі цесна звязаны з яе здольнасцю своечасова і эфектыўна рэагаваць на выклікі і пагрозы, узнікаючыя ў зоне яе адказнасці.

Пасля заканчэння саміту прэзідэнты прынялі заявы па пытаннях, што абмяркоўваліся на сустрэчы.

«Мы, кіраўнікі дзяржаў — членаў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, з занепакоенасцю ўспрынялі падзеі красавіка гэтага года ў Кыргызскай Рэспубліцы, якія прывялі да неканстытуцыйнай змены ўлады, — гаворыцца ў заяве. — Разглядаючы гэтыя падзеі як унутраную справу Кыргызскай Рэспублікі, мы выказваем глыбокае шкадаванне і спачуванні ў сувязі са шматлікімі чалавечымі ахвярамі, а таксама матэрыяльным уронам, нанесеным у выніку названых падзей».

Кіраўнікі дзяржаў — членаў АДКБ звяртаюцца да народа Кыргызстана і заяўляюць аб неабходнасці найхутчэйшага мірнага вяртання ў прававое рэчышча грамадска-палітычнага жыцця Кыргызстана і яго нармалізацыі, недапушчэння насілля, вяртання правапарадку, забеспячэння правоў і свабод чалавека ў гэтай рэспубліцы, а таксама легітымізацыі інстытута ўлады.

Прэзідэнты лічаць неабходным аказаць народу Кыргызстана гуманітарную і іншую дапамогу для больш хуткай стабілізацыі абстаноўкі ў краіне.

Прэзідэнты пацвердзілі стратэгічны курс на ўсебаковае развіццё саюзніцкага супрацоўніцтва ў рамках АДКБ з актыўным удзелам Кыргызстана.

Што ж датычыцца падпісанага Расіяй і ЗША дагавора аб мерах па далейшым скарачэнні і абмежаванні стратэгічных наступальных узбраенняў, кіраўнікі дзяржаў — членаў АДКБ разглядаюць яго як важны элемент архітэктуры міжнароднай бяспекі, што адлюстроўвае істотны ўклад Расіі і ЗША ў справу ядзернага раззбраення і нераспаўсюджвання.

Дзяржавы — члены АДКБ падкрэслілі важнасць пацвярджэння ў сумеснай заяве Расіі і ЗША ад 4 снежня 2009 года гарантый бяспекі Беларусі, Казахстана і Украіны, зафіксаваных у Будапешцкіх мемарандумах ад 5 снежня 1994 года.

Дзяржавы — члены АДКБ выходзяць з таго, што новы дагавор будзе садзейнічаць умацаванню рэжыму нераспаўсюджвання ядзернай зброі, пашырэнню працэсу ядзернага раззбраення, наданню яму ў перспектыве шматбаковага характару.

Дзяржавы — члены АДКБ заклікаюць усе краіны, якія валодаюць ядзернай зброяй, далучыцца да намаганняў Расіі і ЗША і больш актыўна ўносіць уклад у працэс раззбраення.

У Маскве таксама прайшла нефармальная сустрэча кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц СНД. У час гэтай сустрэчы Аляксандр Лукашэнка заявіў аб тым, што лічыць эканамічны складнік галоўным ва ўзаемадзеянні СНД.

Вітаючы кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў краін СНД, Дзмітрый Мядзведзеў падзякаваў ім за тое, што яны прыехалі ў Маскву, каб разам адзначыць 65-годдзе Перамогі над фашызмам.

Прэзідэнт Расіі са шкадаваннем заўважыў, што эканомікі краін Садружнасці пакуль яшчэ не ў поўнай меры адышлі ад эканамічнага крызісу.

Неабходна адзначыць, што па ініцыятыве Беларусі ў 2009 годзе быў прыняты План па рэалізацыі антыкрызісных мераў у рамках СНД. Аднак краіны — удзельніцы Садружнасці не ў поўнай меры скарысталіся прапановамі беларускага боку, што не дало магчымасці прыняць больш рашучыя сумесныя меры па барацьбе з наступствамі крызісу.

У наступным годзе Садружнасць Незалежных Дзяржаў будзе адзначаць сваё 20-годдзе — гэта важны этап у развіцці СНД і сур'ёзная падстава ацаніць пройдзены шлях, намеціць новыя перспектывы. У юбілейным 2011 годзе Беларусь гатова правесці саміт кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц СНД у Мінску, дзе размешчана штаб-кватэра СНД.

Садружнасць стала асновай для фарміравання іншых інтэграцыйных аб'яднанняў: Еўразійскай эканамічнай супольнасці, АДКБ, Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі. Беларускі бок лічыць, што неабходна мудра і эфектыўна распарадзіцца існуючым патэнцыялам Садружнасці, выпрацаваць прагматычную мадэль узаемадзеяння СНД з іншымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі.

Беларусь таксама лічыць, што, нягледзячы на змяненні, якія адбываюцца на постсавецкай прасторы, Садружнасць сёння па-ранейшаму застаецца важнай інтэграцыйнай структурай, якая дае магчымасць не толькі эфектыўна і сумесна вырашаць многія актуальныя для народаў гэтых краін пытанні, але і захоўваць тое лепшае, што было накоплена за гады сумеснай гісторыі.

Сустрэча кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц СНД прайшла напярэдадні 65-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэта гістарычная падзея нагадвае пра вялікую значнасць адзінства і з'яднанасці народаў у дасягненні Вялікай Перамогі.

Беларусь, страціла ў Другой сусветнай вайне амаль трэць свайго насельніцтва, ніколі не ўспрыме ніякія спробы перапісаць гісторыю і прынізіць уклад шматнацыянальнага савецкага народа ў агульную Перамогу над фашызмам.

Беларускі бок лічыць, што, нягледзячы на эканамічныя цяжкасці, неабходна зрабіць усё магчымае для забеспячэння дастойнага жыцця тых, хто набліжаў Вялікую Перамогу на франтах і ў тыле. Акрамя таго, прэзідэнты краін СНД павінны прыкласці максімум намаганняў, каб забяспечыць мір і стабільнасць у агульным рэгіёне, умацаваць дух даверу і супрацоўніцтва паміж краінамі і народамі.

Як лічыць беларускі бок, залогам жыццяздольнасці Садружнасці ў цэлым будзе разумнае сумяшчэнне нацыянальных інтарэсаў і агульных для СНД мэтаў, аператыўнасць рэагавання на выклікі сучаснасці.

Беларусь па-ранейшаму выступае прыхільніцай умацавання цесных інтэграцыйных сувязяў. На думку беларускага боку, дзякуючы Садружнасці ўдалося забяспечыць устойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё дзяржаў — удзельніц, тэхналагічнае адзінства транспартнай і энергетычнай інфраструктур, сумеснае процідзеянне арганізаванай злачыннасці і тэрарызму. У рамках СНД ствараецца агульная гуманітарная прастора шляхам рэалізацыі сумесных доўгатэрміновых праграм у галіне культуры, аховы здароўя, навукі і адукацыі.

Гэта арганізацыя застаецца важнай дыскусійнай пляцоўкай для разгляду пытанняў шматбаковага і двухбаковага супрацоўніцтва.

Асаблівую важнасць мае пашырэнне кааперацыі паміж прадпрыемствамі краін СНД. На парадку дня таксама стаіць пытанне аб інавацыйным пераўзбраенні такіх галін, як энергетыка, транспарт, прамысловы комплекс. Беларускі бок лічыць, што значны патэнцыял у вырашэнні гэтага пытання мае выкарыстанне адпаведных фінансавых інструментаў, уключаючы развіццё міжнароднага лізінгу.

Беларусь таксама выступае за інтэнсіфікацыю міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, паколькі менавіта прамыя кантакты рэгіёнаў і іх суб'ектаў гаспадарання найбольш эфектыўныя.

Краінам СНД удалося прыняць і выконваць План рэалізацыі сумесных мераў па пераадоленні наступстваў сусветнага крызісу. На думку беларускага боку, важна прадаўжаць актыўныя дзеянні па рэалізацыі гэтага плана, што дасць магчымасць не толькі змякчыць негатыўныя тэндэнцыі апошніх гадоў, але і стварыць неабходны запас трываласці нацыянальных эканомік дзяржаў-удзельніц.

Пакет ініцыятыў, прадстаўлены Расіяй як старшынёй у Садружнасці, супадае з чаканнямі беларускага боку. У гэтым пакеце арганічна ўвасоблены канцэптуальныя ідэі, выпрацаваныя яшчэ беларускім старшынствам у 2008 годзе. Рэалізацыя гэтых ініцыятыў цалкам адпавядае інтарэсам усіх без выключэння членаў СНД. У сваю чаргу гэта датычыцца забеспячэння эфектыўнай тарыфнай палітыкі, фарміравання міжнародных транспартных калідораў, стварэння лагістычных цэнтраў, партнёрства ў галіне распрацоўкі і ўкаранення інавацыйных тэхналогій.

Прэзідэнты краін СНД прынялі сумесны Зварот кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў да ветэранаў фронту і працаўнікоў тылу ў сувязі з 65-й гадавінай Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Зборная Беларусі абыграла каманду Казахстана ў стартавым матчы чэмпіянату свету па хакеі

Зборная Беларусі з валявой перамогі з лікам 5:2 над камандай Казахстана пачала 9 мая выступленне на 74-м чэмпіянаце свету па хакеі, які праходзіць у Германіі, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Замест Андрэя Мезіна, які адчуў недамаганне, у вароты быў пастаўлены яго напарнік Віталь Коваль. І работы ў яго хапала ўжо з першых хвілін. Беларусы грашылі вялікай колькасцю памылак у сярэдняй зоне, вынікам чаго станавіліся небяспечныя атакі, якія раз-пораз накатваліся на вароты Віталя Коваля. І калі б не яго ўпэўненасць, то ўжо першы перыяд мог завяршыцца на карысць азіяцкай каманды. Зрэшты, сваю перавагу казахстанцы ўвасобілі ў галы ў другім перыядзе.

Да гонару нашага капітана Руслана Салея, ён актыўна ўзяўся за рэабілітацыю. Не прайшло і дзвюх хвілін, як ён выступіў адным з асістэнтаў Дзмітрыя Мялешкі, які ў большасці скарацію разрыў у ліку. А на 51-й хвіліне ўжо сам Руслан Салей, і зноў у большасці, дазволіў партнёрам і балельшчыкам упершыню ў гэтым матчы ўздыхнуць з палёгкай, магутным далёкім кідком паразіўшы чужыя вароты і ўстанавіўшы даволі камфортную перавагу сваёй дружыны — 4:2.

А між гэтымі шайбамі былі яшчэ два эфектныя галы. Спачатку 20-гадовы Міхаіл Сцефановіч, адгукнуўшыся на дасціпны пас з адскокам ад борта ад Яўгена Кавыршына, уварваўся ў чужую зону і стрымана перайграў спрактыкаванага вартавога Віталя Ерамеева, а затым Аляксей Калюжны, атрымаўшы перадачу праз пяўпляцоўкі ад Мікалая Стасенкі, пабег адзін на адзін са сваім аднаклубнікам па маскоўскім «Дынама» і стаў аўтарам пераможнай шайбы.

Нябачны кісцевы кідок з-пад абаронцы ў выкананні Сяргея Дзямагіна за паўтары хвіліны да сірэны стаў кантрольным стрэлам і паставіў кропку ў валявой перамозе беларусаў.

Футбол. Чэмпіянат краіны

«БЕЛШЫНА» НЕ ЗДАЛАСЯ ПАСЛЯ 4 ВЫДАЛЕННЯЎ

А «Партызану» нарэшце ўдалося забіць гол

Згуляныя матчы восьмага тура чэмпіянату краіны ў вышэйшай лізе. Большасць паядынкаў аказалася надзвычай выніковымі, у туры забіта 25 мячоў. А матч у Бабруйску, дзе мясцовая «Белшына» прымала наваполацкі «Нафтан», вызначыўся аж чатырма выдаленнямі ў бабруйчан, прычым на чале з галоўным трэнерам.

За спрэчкі з рэзервовым арбітрам Аляксандр Сяднёў пакінуў трэнерскую лаўку на 79-й хвіліне, а ў дабаўлены час «Белшына» ўвогуле засталася ўвасьмёх. Спрэчкі, дарэчы, былі выкліканыя за сумніўны пенальці, прызначаны галоўным арбітрам матча Антуанам Маёравым у вароты «Белшыны». Рэалізаваць пенальці навапалачане не змаглі. Каманда Аляксандра Сяднёва праявіла характар, які ў сукупнасці з выдатна праведзенай гульнёй варатара Логвінава дазволіў перамагчы 1:0. І застацца на другім радку турнірнай табліцы. Праўда, за паводзіны балельшчыкаў, якія зневажалі галоўнага арбітра сустрэчы Антуана Маёрава, цалкам верагодна, што «Белшыне» давядзецца заплаціць штраф.

Узначальвае ж турнірную табліцу чэмпіён барысаўскі БАТЭ, які разграміў магілёўскі «Днепр» — 3:0. На трэцім месцы пакуль ідуць падапечныя Юрыя Пунтуса. Брэсцкае «Дынама» забіла пяць мячоў «Віцебску», на якія ён здолеў адказаць толькі двума. Услед за брэсцкімі аднаклубнікамі ідзе сталічнае «Дынама».

Нарэшце сталічнаму «Партызану» ўдалося забіць гол і зарабіць першае турнірнае ачко. Пасля сямі сухіх пройгрышаў у матчы з жодзінскім «Тарпеда» падапечныя Людаса Румбуціса забілі два мячы і маглі нават выйграць, але жодзінцы давялі матч да нічыёй — 2:2. Пасля двух паражэнняў «Мінск» абгуляў (3:1) гродзенскі «Нёман».

Алена КРАВЕЦ.

«ДАРОГАЙ СЛАВЫ»

БРЭСТ заўсёды адзначае свята Перамогі на зямлі легендарнай крэпасці. Але гэтым разам урачыстыя мерапрыемствы распачаліся на плошчы Леніна, дзе ветэраны разам з гараджанамі, гасцямі аддалі належнае Дзяржаўнаму гербу і Дзяржаўнаму сцягу. Потым прайшоў парад, прысвечаны 65-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. І адсюль, з плошчы, усе рушылі ў крэпасць. А на шляху — «Дарозе славы» — арганізатары свята ўсталявалі шэсць сцэнічных пляцовак, на якіх у храналагічным парадку адлюстравалі ўсе этапы вайны.

У крэпасці ля галоўнай скульптурнай кампазіцыі быў устаноўлены святлодыёдны экран, на ім дэманстравалася ваенная кінахроніка, а падчас мітынгу транслявалі выступоўцаў. Яно і да месца, бо на плошчы Цырыманіялаў сабраліся дзясяткі тысяч людзей, і ўсім, хто не наперадзе, трыбуну не было відаць. Губернатар Брэстчыны Канстанцін Сумар у сваёй прамове падкрэсліў, што Брэсцкая крэпасць мільёнамі людзей успрымаецца не толькі як месца гераічнага адпору фашыстам, але і як першы прадвеснік будучай перамогі.

Галоўнымі героямі святкаванняў былі, вядома ж, яны — ветэраны, вызваліцелі, пераможцы. Варта адзначыць, што ў Брэсцкай вобласці пражывае крыху больш за 5800 ветэранаў вайны, у абласным цэнтры — каля дзвюх тысяч. На свята ў крэпасці сабралася больш за 500 ветэранаў. Адна з іх, Марыя Пятроўна Разанцава, прайшла ўсю вайну ад званка да званка медсястрой пятай танкавай арміі, скончыла баявы шлях у Берліне і, як яна падкрэсліла, «распісалася на Рэйхстазе». Былая медсястра — чалавек надзвычай актыўны, вялікі жыццялюб. Яна расказала, што ў святочныя дні пабывала на розных мерапрыемствах. Адно з іх праходзіла ў Кобрыне, і ветэрана ўразіў гэты прыгожы, чысты, расквечаны яркімі клумбамі горад. «Які Дом культуры, — не хавала сваіх эмоцый Марыя Пятроўна, а парк — лепшы, чым наш, брэсцкі!» Яшчэ былы франтавік засталася вельмі задаволеная ад сустрэч са студэнтамі на факультэце замежных моў Брэсцкага ўніверсітэта і з вучнямі старэйшых класаў у абласным ліцэі. «Яны вельмі ўдумлівыя, разумныя, мяркуючы па тых пытаннях, што задавалі. Нам ёсць на каго пакідаць краіну», — зрабіла выснову ветэран.

У Міхаіла Іларыёнавіча Краюшкіна столькі баявых узнагарод, што на юбілейныя не хапае месца: тры ордэны Чырвонага Сцяга, ордэн Айчыннай вайны I ступені, медалёў не пералічыць. Афіцэр-мінамётчык прайшоў усю Еўропу, удзельнічаў у штурме Кёнігсберга. Калі б не вайна, вельмі верагодна, што Міхаіл Краюшкін стаў бы вядомым спартсменам і праславіў краіну. А так сваю даўнюю мару — Мінскі інстытут фізкультуры — удалося скончыць толькі ў 60-х гадах. Больш за дваццаць гадоў выкладаў фізкультуру ў навучальных установах Брэста. І цяпер ветэран у свае 86 гадоў кожную раніцу гадзіну займаецца фізічнымі практыкаваннямі, падцягваецца 15 разоў. Хоць франтавая рана апошнім часам усё болей дае пра сябе знаць, ветэран не паддаецца хваробам.

А танкіст Аляксей Фёдаравіч Акружны вельмі ганарыцца тым, што стаў сведкам гістарычнай падзеі. Падчас падпісання Акта аб капітуляцыі Германіі ў Карлсхорсце акрамя ўдзельнікаў працэдуры прысутнічала не болей за сто чалавек. Адным з іх быў брастаўчанін Аляксей Акружны.

* * *

Мерапрыемствы ў крэпасці доўжыліся амаль цэлы дзень. Было шмат гасцей з іншых краін, найбольш з Расіі: з С.-Пецярбурга, Чачні, Ямала-Ненецкай аўтаномнай акругі. Але некаторыя людзі прыязджалі не ў складзе дэлегацый альбо арганізаваных груп, а самі, па сваёй ініцыятыве. Напрыклад, усе спыняліся ля незвычайнай машыны «Урал», на якой можна прачытаць ледзь не ўсю геаграфію Расіі з захаду на ўсход. Аказалася, што група аматараў-энтузіястаў праехала на гэтым аўто з Петрапаўлаўска-Камчацкага да Брэста. 11 800 кіламетраў прайшоў аўтамабіль-герой. Герой, бо машына два гады хадзіла па дарогах вайны, затым паўтара дзясятка гадоў «служыла» ў вайсковай часці. Апошні яе шафёр Васіль Драгайцаў разам з маладымі аднадумцамі праехалі такую адлегласць да самага Брэста, каб прыцягнуць увагу на сваім шляху да важнасці Перамогі і выказаць да яе свае ўласныя адносіны. У крэпасці гэты ваенны рарытэт з мноствам надпісаў найперш апанавала дзятва: усім хацелася пасядзець у кабіне «Урала», націснуць на сігнал, сфатаграфавацца на памяць. Людзі хадзілі па мемарыяльным комплексе сем'ямі. Нават маці-ігумення жаночага манастыра, які дзейнічае ў крэпасці, была заўважана ў святочным натоўпе разам з сёстрамі. Урачыста-ўзнёслыя ўсмешкі асвятлялі твары манахіняў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

АДНОЙ СЯМ'ЁЙ

УДЗЕЛЬНІКІ першых баёў за Гродна з Расіі, Украіны, Польшчы прыехалі ў горад над Нёманам, каб разам з намі, можна сказаць, адной сям'ёй адзначыць 65-годдзе Перамогі. На святкаванне прыбылі таксама дэлегацыі з Калінінградскай, Валагодскай, Наўгародскай абласцей, Паўночна-Заходняй адміністрацыйнай акругі Масквы, Акцюбінскай вобласці Казахстана, Вінніцкай вобласці Украіны, Вільнюскага, Марыямпальскага і Алітускага паветаў Літвы.

Тым часам гродзенец, палкоўнік у адстаўцы Мікалай Васільевіч Кісялёў, які пачынаў вайну ў 1944-м вадзіцелем танка, ваяваў за Кёнігсберг, Латвію, накіраваўся ў складзе беларускай дэлегацыі ветэранаў у Маскву для ўдзелу ў ваенным парадзе. А Яўген Рыгоравіч Чэбурэеў і Леў Міхайлавіч Мяшчэрскі, якія вызвалялі ад фашыстаў Украіну, удзельнічалі ў святочных мерапрыемствах у Кіеве.

На жаль, стан здароўя не дазволіў паехаць у расійскую сталіцу ўдзельніку першага парада Перамогі на Краснай плошчы ў 1945-м, ганароваму грамадзяніну Гродна, Герою Савецкага Саюза Івану Данілавічу Лебедзеву. Аднак некалькі дзён таму 94-гадовы ветэран правёў сваю чарговую сустрэчу з моладдзю, на гэты раз з вучнямі ліцэя №1 у абласным цэнтры.

Святочныя мерапрыемствы 9 мая распачаліся ў Гродне з мітынгаў ля помнікаў і воінскіх пахаванняў, а затым ветэранаў віталі ў «Жывым калідоры», які быў утвораны школьнікамі горада ад вуліцы Савецкай да плошчы Леніна, дзе адбыліся мітынг і парад войскаў Гродзенскага гарнізона. А потым — канцэрты, тэатралізаваны паказ, гульня-падарожжа па музеі пад адкрытым небам «Швейцарская даліна», кірмаш народных майстроў. Заключным акордам свята сталі агульнагарадская акцыя «Спяём мы «Дзень Перамогі» разам» і святочны салют.

Чарговая гадавіна Дня Перамогі засталася ў гісторыі, але праца па ўвекавечанні подзвігу пераможцаў у самай кровапралітнай у гісторыі чалавецтва вайне не скончаецца. Да сёлетняга свята ў гродзенскай сярэдняй школе № 37 адкрылі музей гісторыі Фолюша з успамінамі і фатаграфіямі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, макетам вайсковай аперацыі «Багратыён», а таксама з экспазіцыяй, якая прысвечана памяці вязняў лагера для савецкіх ваеннапалонных Шталаг № 324, што размяшчаўся ў гэтым раёне горада.

Працягвае працу і 52-і асобны спецыялізаваны пошукавы батальён Міністэрства абароны Беларусі. За перыяд з 1992 года толькі на тэрыторыі Гродзеншчыны вайскоўцы гэтага ўнікальнага на прасторы былога СССР падраздзялення выявілі і перадалі для перапахавання астанкі больш чым двух тысяч абаронцаў Айчыны. Знойдзена каля шасцідзесяці салдацкіх медальёнаў, па якіх удалося ўстанавіць прозвішчы загінулых. Сярод іх — зніклы без вестак у чэрвені 1941-га чырвонаармеец Ахмет Ігембердыеў, які 6 мая, у прысутнасці ягоных сваякоў з Кыргызстана, урачыста перапахаваны ў брацкай магіле ў вёсцы Плаўскія Азерніцкага сельсавета на Слонімшчыне. Было ўстаноўлена прозвішча і яшчэ аднаго з дваццаці вайскоўцаў, чые астанкі дзякуючы мясцовым жыхарам і пошукавай групе «Бацькаўшчына» былі знойдзеныя каля вёскі Ермалоўшчына Слонімскага раёна — гэта чырвонаармеец Іван Іванавіч Нікулін, ураджэнец Волхаўскага раёна Ленінградскай вобласці.

Задача 52-га батальёна на сёлетні пошукавы сезон на тэрыторыі вобласці — праца на 25 пакуль яшчэ няўлічаных вайсковых пахаваннях, інфармацыя пра якія паступіла ў ваенныя камісарыяты.

Ваенны камісарыят вобласці звяртаецца да жыхароў Гродзеншчыны з просьбай паведаміць звесткі, успаміны відавочцаў пра невядомыя нам пахаванні абаронцаў Айчыны. Інфармацыю можна дасылаць па адрасе: Гродна, вул. 1 Мая, д. 8, альбо патэлефанаваць па нумары «гарачай лініі» 74 44 58.

Барыс ПРАКОПЧЫК.


Фота Яраслава ВАНКОВІЧА.

Санітарка Надзея БАРАНОЎСКАЯ:

«АДЗІН КРЫЧЫЦЬ: РАТУЙ МЯНЕ, ДРУГІ — ДАБІ МЯНЕ!»

Аляксандру Сямёнавічу Васільеву сёлета — 90, хоць выглядае не больш чым на 70. Вайну ён закончыў у званні старшыны. На яго грудзях — ордэн Чырвонай зоркі, Вялікай Айчыннай, шматлікія медалі. А пачынаў былы вайсковец сваю вайну з прарыву Ленінградскай блакады.

— Я ўдзельнічаў у прарыве блакады, далей быў Пскоў. А потым прымаў удзел у вызваленні Беларусі, Польшчы, Германіі. Дзень Перамогі мы чакалі ўсе. А сустракаць давялося разам з англічанамі. Вельмі радасна было, што засталіся жывыя.

Іх становіцца менш і менш літаральна з кожным днём. На афіцыйных звестках, на Гомельшчыне зараз жыве толькі каля 3,5 тысячы непасрэдных удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Але яны ўпарта прыходзяць, калі сілы дазваляюць, на святкаванне самага галоўнага дня іх жыцця — Дня Перамогі. Каб расказаць, што бачылі на свае вочы, што перажылі за тыя чатыры гады вайны. У кожнага — свая вайна, свая гісторыя, свая праўда, свае ацэнкі мінулага і сучаснага жыцця, але Перамога — яна адна на ўсіх нас. У тым ліку і тых, хто ведае пра Другую сусветную толькі па фільмах. Ускласці кветкі да брацкай магілы савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў прыйшла і былая санітарка Надзея Фёдараўна Бараноўская. Яна ўспамінае:

— Адзін крычыць: ратуй мяне, другі — дабі мяне. У шпіталі, дзе я працавала, людзі крывёю сцякалі, а ў мяне слёзы, што ім дапамагчы немагчыма. А мы ж засталіся жывыя. Каб, дзеткі, нам больш такога не бачыць.

Мерапрыемствы, прысвечаныя Перамозе, маюць традыцыйны рытуал. Ён не мяняецца і ў 65-ю, юбілейную, гадавіну заканчэння вайны: святочнае шэсце ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, кіраўніцтва вобласці і горада, прадстаўнікоў працоўных калектываў, грамадскасці і моладзі, урачысты мітынг, ускладанне вянкоў... Праўда, ветэранаў у калоне ўсё менш: яны едуць на аўтамабілях, стылізаваных пад ваенныя. Удзельнікі вайны, якія паміж сабой бачацца не так ужо і часта, часам збіваюць заведзены рытм: побач з помнікам і высокім начальствам абдымаюць адзін аднаго, разумеючы, што, магчыма, у апошні раз... І ўспамінаюць, успамінаюць... У званні малодшага лейтэнанта сённяшні палкоўнік у адстаўцы Барыс Мікалаевіч Афанасьеў закончыў вайну. «Пашанцавала» прадстаўляць пяхоту. Узнагародам на яго грудзях цесна:

— Прайшоў праз Украіну, Венгрыю, Румынію, Чэхаславакію і закончыў вайну пад Прагай. А дзень Перамогі мы сустракалі агнём гармат. На нашым участку група Шэрнера адмовілася здавацца і нам яшчэ 3 дні пасля афіцыйнай Перамогі прыйшлося ваяваць — да 12 мая. Я жадаю, каб ніхто з гэтага пакалення не ведаў, што такое вайна.

Пасля афіцыёзу прыйшоў час выканаць каманду «вольна» і стаць удзельнікамі тых мерапрыемстваў, якія праходзілі літаральна ў кожным куточку Гомеля. Песні ваенных гадоў ліліся з перакрыжаванняў вуліц, на імправізаваных пляцоўках танцавалі, прадстаўлялі мастацкія выставы. Можна было паласавацца стравамі палявой кухні — але ж гэта больш цікава для тых, хто не ведае сапраўднага смаку салдацкай кашы.

На тэатралізаванае свята ў Гомель запрасілі сталічных артыстаў, якія выступалі на асноўных пляцоўках у цэнтры горада. У канцэрце «Салют Перамозе!» прынялі ўдзел Нацыянальны акадэмічны народны хор імя Г. Цітовіча, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Мікалай Скорыкаў, Аляксандра Гайдук, узорны аркестр Узброеных Сіл Беларусі, лепшыя творчыя калектывы Гомеля.

Між тым, святочныя мерапрыемствы адзін дзень умясціць не могуць, і таму напярэдадні ў Навабеліцкім раёне ўрачыста адкрылі памятны знак «Пабег з пекла». Ён прысвечаны подзвігу 10 вязняў сакрэтнага фашысцкага канцлагера. Сярод іх быў ураджэнец Гомеля Уладзімір Немчанка, які таксама трапіў у сакрэтны канцлагер КЦ-4 на нямецкім востраве Узедам, дзе праводзіліся выпрабаванні ракет ФАУ-2. Маладыя людзі змаглі ўцячы, захапіўшы нямецкі самалёт. У гады вайны дзевяць з іх загінулі. Гэтая гісторыя вядомая нашчадкам па кінастужках. Унук аднаго з загінулых вязняў за асабістыя сродкі да 65-годдзя Вялікай Перамогі замовіў 10 помнікаў, якія ўсталёўваюцца цяпер на радзіме герояў. Дзевяць з іх — у краінах былога СССР, у тым ліку і ў Гомелі, адзін — у Германіі. Сваякі Уладзіміра Немчанкі, які загінуў у 1945 годзе, таксама прынялі ўдзел у адкрыцці стэлы.

Ну а адкрыццё культурна-спартыўнага аб'екта ў адным з мікрараёнаў Гомеля стала падарункам для нашчадкаў ветэранаў Вялікай Айчыннай — усіх жыхароў амаль паўмільённага абласнога цэнтра. У Савецкім раёне распачаў працу «Універсальны сезонны каток», пабудаваны за кошт сродкаў абласнога бюджэту. Плануецца, што з кастрычніка да красавіка на яго арэне будуць трэніравацца прыхільнікі катання на каньках. Праўда, у летні час яго прызначэнне не спартыўнае, а культурна-гандлёвае. Тут будуць праводзіцца выставы-кірмашы і іншыя мерапрыемствы.

Піратэхнічная феерыя, якая праходзіла не толькі ў цэнтры горада над Сожам, але і ва ўсіх яго раёнах, завяршыла гэты цудоўны святочны дзень, які ў другой палове толькі на паўгадзіны быў перарваны кароткім, але моцным дажджом. Яго, між тым, у Гомелі вельмі чакалі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

ДА ЮБІЛЕЮ ПЕРАМОГІ — РЭКАНСТРУЯВАНАЯ ПЛОШЧА

Вельмі знакавай падзеяй для Віцебскай вобласці на святкаванне юбілею Перамогі стала адкрыццё ў абласным цэнтры адноўленай плошчы Перамогі. Па сваёй тэрыторыі яна адна з самых вялікіх у свеце: паводле самых сціплых падлікаў, — гэта 30 гектараў. Сімвалічнай падзеяй стала і адкрыццё новага парку — Пераможцаў. У прыватнасці, адкрылася алея баявой славы, дзе прадэманстраваны ўнікальныя экспанаты — савецкая баявая тэхніка часоў Вялікай Айчыннай. Яшчэ раней плошча Перамогі атрымала статус цэнтральнай у Віцебску, адпаведна, ва ўсім Прыдзвінскім краі.

Фота Сяргея САВЕЛЬЕВА.

На плошчы, якая афіцыйна пасля поўнай рэканструкцыі адкрылася 8 мая, на працягу двух дзён прайшлі маштабныя мерапрыемствы. Раніцай у дзень афіцыйнага адкрыцця плошчы тут арганізавалі ўрачыстую цырымонію. Ветэраны вайны, старажылы горада рады прыемным пераменам. Успаміналі, як летам ужо далёкага 1974 года на плошчы быў збудаваны мемарыял, галоўным элементам якога з'яўляюцца тры абеліскі-трапецыі вышынёй 56 метраў. Ля падножжа манумента гарыць вечны агонь. Абеліск прывялі ў парадак, усталявалі новыя сучасныя фантаны. Рэканструкцыю плошчы правялі ў рэкордны тэрмін — менш чым за год. Новыя фасады ўпрыгожылі і жылыя дамы, якія выходзяць на плошчу. Рэканструкцыя фактычна стала народнай будоўляй. У прыватнасці, падчас апошняга суботніка тысячы гараджан бралі ўдзел у добраўпарадкаванні плошчы.

— Дарагія ветэраны Вялікай Айчыннай вайны! Мы шчыра вам удзячныя. Плошча Перамогі — гэта вам падарунак да Дня Перамогі. Гэта падарунак і для вас — маладога пакалення, — звярнуўся падчас цырымоніі адкрыцця плошчы да ветэранаў, жыхароў горада **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр КОСІНЕЦ**.

Пераацэнка гісторыі Вялікай Айчыннай вайны недапушчальная, падкрэсліў ён. «Сапраўдныя пераможцы фашызму — нашы ветэраны. Гэта ў іх на грудзях медалі «За вызваленне Варшавы», «За вызваленне Бялграда», «За ўзяцце Будапешта», «За ўзяцце Берліна», — сказаў губернатар. Дата 9 мая 1945 года ўвайшла ў сусветную гісторыю і мае вялікае значэнне для дзясяткаў краін і народаў. Для нашай дзяржавы яна азначае свабоду і незалежнасць.

Воіны вайсковых часцей, якія дыслакуюцца ў Віцебску, прайшлі ў святочным маршы па адноўленай плошчы. Ветэраны шчыра выказвалі прадстаўнікам мясцовых уладаў словы ўдзячнасці. І з задавальненнем прайшліся па алеі баявой славы, на якой можна ўбачыць легендарны танк «Т-34», які з баямі вызваляў Віцебшчыну, не меней вядомую самаходную ўстаноўку «СУ-100». Дзятва адразу ацаніла магчымасць залезці на той жа танк, каб сфатаграфавацца на памяць. Губернатар вобласці, адказваючы на пытанні журналістаў, падкрэсліў, што калекцыя ўнікальнай тэхнікі будзе папаўняцца і за лік ваенных самалётаў. А яшчэ ў парку Пераможцаў адчыняць ціры, сярод якіх будуць і сучасныя — з «электронікай», у парку таксама можна будзе скокнуць з парашутнай вышкі, тут усталююць кола агляду.

На жаль, не ўсе ветэраны змаглі на свае вочы ўбачыць добрыя перамены. Карэспандэнт «Звязды» наведаў Ганну Яфімаўну Спаткай. Гэтым летам ёй споўніцца 90 гадоў! Яна ў гады вайны была ваенным фельчарам. Дэмабілізавалася ў званні старшага лейтэнанта.

— Заяваць я пайшла літаральна ўжо праз паўгадзіны пасля абвяшчэння вайны прама з віцебскага радзільнага дома, дзе я працавала акушэркай. Што, дарэчы, запомніла на ўсё жыццё, за дзяжурства 22 чэрвеня 1941 года прыняла 22 немаўлят. Гэта было непрывычна шмат. Шмат хлопчыкаў нарадзіліся прама перад вайной, — успамінае ветэран. — Заявала я ў 1941—1943 гадах, пакуль мяне не параніла. У Казані ляжала ў шпіталі, і мяне там прасілі дапамагаць падчас аперацый. Пасля вайны працавала памочнікам эпідэміёлага ў Мінску на гарадской санітарнай станцыі. Потым гадоў дваццаць дыетычнай сястрой у Віцебску. Муж Ганны Яфімаўны, які, на жаль, памёр, таксама заяваў — шмат выпрабаванняў выпала на ягоную долю. У мірны час прысвяціў сябе любімай журналістыцы — быў першым кіраўніком віцебскай студыі тэлебачання.

9 мая дзясяткі тысяч гараджан выйшлі на святочнае шэсце. Выкладчыкі, медыкі, прадстаўнікі прадпрыемстваў і арганізацый ішлі дружным строем у прыгожа афармленых калонах. Воіны віцебскага гарнізона з падраздзялення ганаровай варты пад бурныя апладысменты публікі паказалі свой клас майстэрства ў страі са зброяй у руках. Верталёты здзівілі сваімі «трукамі» і зладжанасцю палёту над эпіцэнтрам святочных падзей.

8 і 9 мая на новай плошчы прайшлі канцэрты, забаўляльныя праграмы для моладзі. Пасля завяршэння апошніх увечары фактычна новую плошчу асвяцілі мільёны зорачак феерверку і салюту. Юбілей Перамогі запомніцца надоўга.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ШЭСЦЕ ГЕРОЯЎ

БОЛЬШ за тысячу магілёўцаў бралі ўдзел у святочным шэсці, прысвечаным 65-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Ад плошчы Леніна па цэнтральнай вуліцы горада Першамайскай рушыла калона ветэранаў, кіраўніцтва рэгіёна, замежных дэлегацый, прадстаўнікоў працоўных калектываў і грамадскасці.

У шэсці бралі ўдзел ваенны аркестр, спартсмены, а таксама творчыя калектывы, якія паказалі тэатралізаваныя пастаноўкі, стылізаваныя пад ваенныя часіны. Не забыліся магілёўскія акцёры пра легендарных асобаў у гісторыі вайны ў Магілёве: напярэдзе ўзвода чырвонаармейцаў ехаў на грузавіку з блакнотам і «лейкай» у руках спецыяльны карэспандэнт Канстанцін Сіманаў, які апісаў гераічную абарону горада ў 1941 годзе.

Назірала за святам мноства гараджан, а школьнікі, паводле традыцыі, дарылі ветэранам веснавыя кветкі. **Аляксандр Малахавіч ЦЫРУБА** штогод бярэ ўдзел ва ўрачыстым шэсці і, нягледзячы на сталыя гады, ідзе праз святочны цэнтр пешшу: «Я яшчэ моцны!»

У гады вайны Цыруба служыў у пяхоце, быў прызначаны камбатам. Аляксандр Малахавіч і два яго браты нарадзіліся і выраслі ў вёсцы Цітаўка Клімавіцкага раёна. Аднак — іронія лёсу! — усіх братоў запісалі пад рознымі прозвішчамі. І ніхто не верыў Аляксандру Малахавічу, калі ён казаў пра брата Дзмітрыя Цырубіна, Героя Савецкага Саюза. Прозвішчы трохі рознымі, але яны сапраўды родныя людзі. І вайну заканчвалі побач, у Прусіі.

— Я святкаваў Дзень Перамогі ў нямецкім горадзе Брандэнбургу, і там на радасцях выпіў першую ў сваім жыцці чарку гарэлкі! — узгадвае сёння ветэран, які мае рэдкі ордэн Аляксандра Неўскага.

Фота Ірыны САВОСІНАЙ.
ЦИРУБИН Д.М.

«Галоўнае — засталіся жывыя»

9 мая на Савецкай плошчы ў Магілёве адбыўся ўрачысты мітынг, людзі ўсклалі кветкі і вянкі да мемарыяла. Хвілінай маўчання ўшанавалі магілёўцы памяць ахвяраў Вялікай Айчыннай вайны.

— Вашы галовы даўно сівыя, але ў вачах паранейшаму ўсё тое, чым мы ганарымся — вера і мужнасць, — сказаў у сваім выступе ветэранам **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр РУДНІК**. — Я шчыра рады, што сёння вы з намі ў адным страі. Заставайцеся ў ім як мага далей. Нізкі паклон вам за Вялікую Перамогу.

Клопат пра ветэранаў улады аб'явілі галоўнай справай. Цяпер на Магілёўшчыне жыве 3990 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Самаму маладому з іх — 84 гады. Толькі летась ветэранская арганізацыя недалічылася 958 удзельнікаў вайны. Нашы ветэраны забяспечаныя ўсім, што ім належыць па законе, лічыць **старшыня савета абласной арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў Анатоль ЛЮБЧАНКА**.

Напярэдадні свята Пётр Руднік пабываў у шпіталі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і запэўніў, што грамадства ў Беларусі ніколі не пакіне ветэранаў сам насам са сваімі праблемамі.

Розныя арганізацыі правялі акцыі падтрымкі ветэранаў. Напрыклад, хрысціянская дабрачынная арганізацыя «Табея» даставіла святочныя падарункі для ўдоў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

У кожным кутку вобласці прайшлі самыя розныя мерапрыемствы, прысвечаныя 65-годдзю Перамогі. Напярэдадні майскіх святаў у Чавусах адбылася сустрэча ветэранаў з кіраўніцтвам горада: юбілейныя медалі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-45 гг.» уручалі ў раённым краязнаўчым музеі. Патэфон шчымліва граў песні маладосці ветэранаў, а працягнуў імправізаваны канцэрт гарманіст у вобразе салдата. Ветэраны расказвалі, за што атрымалі свае ваенныя ўзнагароды. «Але самая галоўная ўзнагарода для ўсіх нас — гэта, вядома, тое, што мы засталіся жывыя», — шчыра сказаў адзін з удзельнікаў сустрэчы ў Чавускім музеі.

Падзяка беларускім партызанам

Святочны дзень быў запоўнены ўспамінамі пра гады вайны і Перамогу. Вось адзін з іх. Татарын **Равіль ЛАТЫПАЎ** пайшоў на фронт у 17 гадоў. Ён браў удзел у вызваленні Беларусі. Свой першы бой Равіль Нагімавіч памятае добра: ўначы партызаны правялі праз глухі лес і балоты на тэрыторыю Беларусі. Урэшце праваднікі вывелі вайскоўцаў на дарогу, дзе яны сустрэлі і атакавалі калону нямецкай тэхнікі. Праўда, бой аказаўся няроўным, але падаспелі аўтаматчыкі, і рота Латыпава зламала супраціўленне немцаў і ўрэшце захапіла палявую кухню.

— Там былі каша і суп, і ўпершыню за доўгі час мы ўсе наеліся дасыта, — усміхаецца сваім непрадным успамінам ветэран. — Таму што ўбогі паёк нам выдавалі адразу на 3 дні, а мы яго з'ядалі за 5 хвілін.

Потым Латыпаў прайшоў палову Еўропы, вызваляў Варшаву, быў паранены і ўзнагароджаны за фарсіраванне Буга. Ён сустрэў Дзень Перамогі ў нямецкім горадзе Ростак: вадзіцель Равіль вёз байцоў на аўтобусе, калі пачуў хаатычныя стрэлы. Першы сустрэчны старшына на пытанне пра шум экспрэсіўна адказаў абсалютна нецэнзурнай, але радаснай лаянкай. Калі зразумелі, што ў страшнай вайне здабыта нарэшце Перамога, то салдаты плакалі наўзрыд.

— Але я на ўсё жыццё захаваў пачуццё ўдзячнасці беларускім партызанам, якія зберагліі нам жыццё той ноччу перад першым боем, — гаворыць Равіль Нагімавіч. — Нам бы ніколі не перайсці самім балоты: яны былі такія глыбокія, што ў маёй кішэні аказалася жабка... Дарэчы, мая будучая жонка Любоў тады была таксама ў партызанах. Але сустрэліся мы толькі пасля вайны на Урале, потым прыехалі жыць у Магілёў і разам ужо 60 гадоў!

Пераможцы танцуюць

Свята працягнулася ўрачыстымі гуляннямі ў Пячэрскім лесапарку. Канцэрт, салдацкая каша, танцы — традыцыйныя забавы магілёўцаў на Дзень Перамогі.

Увечары ў скверы, прысвечаным 40-годдзю Перамогі, адбылося выступленне аркестра і артыстаў. Людзі танцавалі пад песні ваенных гадоў. Ветэран **Пётр Віктаравіч АСМАЛОЎСКІ**, нягледзячы на свае 90, актыўны ўдзельнік летніх вечарын з танцамі.

Вайну ён сустрэў курсантам Смаленскага ваенна-палітычнага вучылішча, ваяваў на фронце, быў паранены, узнагароджаны за гераізм медалямі і ордэнамі.

— Маладыя людзі на сустрэчах звычайна пытаюцца, ці было страшна на вайне, — расказвае ветэран. — Спачатку страшна, а калі пачынаеш весці бой, то забываешся. Трэба перамагчы праціўніка. Інакш табе не мінуць ліха.

Цяпер баявы палкоўнік Асмалоўскі захапляецца танцамі: «Чаму тут здзіўляцца? Мы перамаглі ў той вайне, таму і танцуем!»

Дастойным фіналам святкавання Дня Перамогі ў Магілёве стаў салют, які гараджане назіралі з набярэжнай Дняпра.

Ілона ІВАНОВА.

У АДНЫМ СТРАІ



БЕЛАРУСКІЯ ваенныя ўпершыню прайшлі парадным маршам па Чырвонай плошчы Масквы. Яны прынялі ўдзел у святочным парадзе ў гонар 65-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, перадае карэспандэнт БЕЛТА. Беларусь дэлегавала ў расійскую сталіцу эліту сваіх Узброеных Сілаў — 75 байцоў 5-й асобнай брыгады спецназа Паветрана-дэсантных войскаў. Парадны разлік, наперадзе якога развяваўся дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь, узначаліў падпалкоўнік Валерый Кучараў.

У гэтым юбілейным парадзе ўпершыню прынялі ўдзел ваенныя з 13 краін, у тым ліку з дзяржаў СНД — Беларусі, Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Таджыкістана, Туркменістана і Украіны, а таксама дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі — ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі і Польшчы.

Як адзначыў у сваім выступленні на парадзе Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў, удзел замежных ваенных у агульным парадным страі — сведчанне агульнай гісторыі. «У 1945 годзе атрымана не толькі ваенная, але і вялікая маральная перамога, за яе змагаліся ўсе народы былога СССР і набліжалі нашы саюзнікі. Адзіны строй — сведчанне нашай агульнай гатоўнасці абараняць свет, не дапусціць перагляду вынікаў вайны, не дапусціць новых трагедый», — падкрэсліў ён.

А ў Мінску ў парадзе прынялі ўдзел ваеннаслужачыя з Расіі і Украіны.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Вялікая Айчынная: НЕ ДАПУСЦІЦЬ ФАЛЬСІФІКАЦЫІ ГІСТОРЫІ

Угады Вялікай Айчыннай вайны Беларусь страціла амаль трэць насельніцтва і больш за палову свайго нацыянальнага багацця. Фашысты знішчылі 9 200 населеных пунктаў, 209 гарадоў і раённых цэнтраў. 627 вёсак падзялілі лёс спаленай разам з жыхарамі Хатыні. Звыш паўтара мільёна жыхароў Беларусі былі эвакуяваныя ва ўсходнія рэгіёны Савецкага Саюза. Загінула 2 мільёны 200 тысяч беларусаў, 380 тысяч было загнана ў Германію. На беларускай зямлі было створана 260 канцэнтрацыйных лагераў і 110 гета. На 1 красавіка 2010 года ў Беларусі пражывалі 42 220 ветэранаў, з іх 30 566 узялі непасрэдны ўдзел у вайне як франтавікі, партызаны, падпольшчыкі. Сярэдні ўзрост ветэранаў 83—85 гадоў. Сваімі разважаннямі пра ўрокі гісторыі, пра тое, як жывуць ветэраны ў Беларусі, падзяліўся старшыня Рэспубліканскага грамадскага саюза ветэранаў Анатоль НОВІКАЎ.

— Анатоль Мікалаевіч, на фоне заклікаў аб пераглядзе вынікаў Другой сусветнай вайны ў РФ прынята рашэнне аб стварэнні Камісіі па супрацьдзеянні спробам фальсіфікацыі гісторыі на шкоду інтарэсам Расіі. Ці робяцца падобныя захады ў Беларусі?

— Так, мы не павінны пасіўна глядзець на тое, якім чынам інтэрпрэтуюцца ваенныя падзеі ў іншых краінах, а часам і ў нас. У апошні перыяд спробы адкрытага перапісвання гісторыі, на жаль, набіраюць абароты. Самае ганебнае ў гэтых «новых гістарычных адкрыццях» тое, што яны не арыгінальныя, а амаль даслоўна паўтараюць устаноўкі гітлераўскай прапаганды і сваёй мэтай ставяць апраўданне зверстваў фашызму, адраджэнне нацысцкай ідэалогіі. А заявы пра тое, што на тэрыторыі Беларусі быццам бы мела месца не ўсенародная вызваленчая барацьба, а грамадзянская вайна паміж абаронцамі савецкай улады і прыхільнікамі «новага еўрапейскага парадку» з'яўляюцца проста блюзнерскімі.

Нам, на шчасце, не трэба ствараць спецыяльных камісій па захаванні гістарычнай памяці. Таму што мы нікому ў свой час не дазволілі ўзняць руку на нашу Перамогу, на ветэрана з ордэнскімі планкамі, на чалавека ў ваеннай форме. У нашай краіне адной з першых на постсавецкай прасторы быў прыняты «Закон аб ветэранах», у якім прадугледжаны канкрэтныя меры сацыяльнай падтрымкі франтавікоў, партызан, падпольшчыкаў, вязняў фашызму і працаўнікоў тылу. Былі таксама ратыфікаваныя ўсе пагадненні, што датычацца гэтай катэгорыі грамадзян у рамках СНД. Дзяржава робіць усё магчымае, каб выхаваць адукаваных, духоўна багатых, думаючых, стваральных, вартых пераемнікаў герояў Вялікай Айчыннай вайны. Ідэалогія высокага патрыятызму — вось краевугольны камень у падмурку сучаснай Беларусі. Прагрэсіўная будучыня немагчымая без трапяткога і паважлівага стаўлення да гісторыі. Беларусь сёння з'яўляецца адзінай краінай на постсавецкай прасторы, дзе ў школах, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах вывучаецца курс «Вялікая Айчыннай вайна». Ужо адзін гэты факт гаворыць сам за сябе.

— А якія канкрэтныя меры сацыяльнай падтрымкі ветэранаў прадугледжаны ў Беларусі?

— У нашай краіне дзяржаўныя сацыяльныя льготы, правы і гарантыі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны даюцца ў адпаведнасці з законамі «Аб ветэранах», «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян». У сувязі са святкаваннем 65-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ветэранам і асобным катэгорыям грамадзян, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, аказана разавая матэрыяльная дапамога ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта, такая ж матэрыяльная дапамога аказана і да 65-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Рэалізуецца Рэспубліканская праграма сацыяльнай падтрымкі пажылых людзей, ветэранаў і асобаў, якія пацярпелі ад наступстваў войнаў.

Ветэранам даюцца льготы па лекавым забеспячэнні, па забеспячэнні тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, па санаторна-курортным лячэнні і аздараўленні, па праездзе на пасажырскім транспарце, па аплаце жыллёва-камунальных паслуг і паслуг сувязі, а таксама льготы, прадугледжаныя падатковым, мытным, зямельным, працоўным і пенсійным заканадаўствам.

Завяршылася выплата матэрыяльнай дапамогі ветэранам. Яе атрымалі каля 90 тыс. жыхароў краіны. Упершыню выдзяляецца дапамога былым вязням фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета і былым няпоўнагадовым вязням іншых месцаў прымусовага ўтрымання, створаных фашыстамі і іх саюзнікамі ў гады вайны.

Улічваючы асаблівы статус ветэранаў, да іх працоўнай пенсіі вызначаныя адпаведныя павышэнні ў памеры ад 50 да 500 працэнтаў мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце. З 32 036 удзельнікаў вайны, франтавікоў, партызан і падпольшчыкаў звыш 19 тысяч па іх просьбе атрымалі медыцынскую дапамогу, звыш 90 працэнтаў былі забяспечаны санаторна-курортным лячэннем. Надомныя сацыяльныя паслугі атрымліваюць 3949 адзінокіх ветэранаў і 730 сем'яў загінулых.

Ва ўсіх рэгіёнах арганізавана і праводзіцца абследаванне ўмоў жыцця інвалідаў і ўдзельнікаў вайны, членаў сем'яў загінулых у гады вайны. Падчас гэтай работы выяўляюцца патрэбы і запыты згаданых катэгорый грамадзян, робяцца дзейныя захады для аператыўнага вырашэння ўзніклых праблем.

— Нямала людзей працавала ў тыле на карысць перамогі. Такія заслугі адзначаюцца?

— Балючую тэму закранулі. Згодна з расійскім заканадаўствам, у катэгорыю ветэранаў вайны ўваходзяць асобы, якія не менш за 6 месяцаў працавалі ў гады вайны. У нас да гэтай катэгорыі грамадзян прылічваюцца толькі тыя, хто быў узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Што датычыцца льгот, то існуе размежаванне на ветэранаў вайны і ўдзельнікаў. Думаю, гэта справядліва. Безумоўна, работнікі тылу таксама цярпелі нягоды, але іх жыццё кожную секунду не падвяргалася небяспецы. Адпаведна, ільгот у іх крыху менш.

— Як вядзецца работа па долгадзе вайсковых помнікаў, пахаванняў? Ці вядуцца пошукавыя работы?

— Сёння ў краіне працягваецца работа па ўвекавечванні памяці загінулых у гады вайны, прыводзяцца ў парадак вайсковыя пахаванні і абеліскі славы, якіх у нашай краіне восем з паловай тысяч. Пошукавыя групы актыўна супрацоўнічаюць з калегамі ў СНД. Наша моладзь бярэ самы актыўны ўдзел у рабоце па пошуку і ўстанаўленні асобаў загінулых на палях бітваў, добраўпарадкаванні помнікаў баявой славы, ваенных могілак, брацкіх магіл. Дзясяткі тысяч піянераў і членаў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі па добрай волі дапамагаюць ветэранам, падтрымліваюць парадак на мемарыялах і ў месцах вайсковых пахаванняў, удзельнічаюць у патрыятычных акцыях, на мой погляд, у гэтым ёсць магутны выхавацўчы момант.

На гэтым фоне да глыбіні душы выклікае абурэнне прынятае грузінскімі ўладамі ў мінулым годзе рашэнне аб зносе Мемарыяла вайсковай славы ў Кутаісі, прысвечанага загінулым у Вялікай Айчыннай вайне. Відаць, яны зусім забыліся пра тое, што ў гады вайны загінулі і памерлі звыш 300 тысяч грузінаў, з іх каля 80 тысяч вайскоўцаў палі смерцю храбрых, абараняючы агульны дом — Савецкі Саюз.

— На жаль, XXI стагоддзе так і не прынесла чалавецтву пазбаўлення ад жахаў вайны. У Латвіі паліцыя ахоўвае шэсце эсэсаўцаў і разганяе антыфашысцкія пікеты. У Эстоніі 9 мая не з'яўляецца святочным днём, а мемарыялы ўзводзяцца ў гонар карнікаў. Нават у Германіі неанацысты выйшлі на вуліцы, афіцыйна абвясціўшы аб сваім існаванні. Што на ваш погляд неабходна зрабіць у нашай краіне, каб не дапусціць паўтарэння гісторыі?

— Павага да мінулага Айчыны, непарыўная сувязь і пераемнасць пакаленняў — вось тыя традыцыйныя ўстоі, на якіх трымаліся і трымаюцца стабільнасць і дабрабыт Беларусі. І гэта дазволіць нам не дапусціць паўтарэння. Нам таксама неабходна прыкласці ўсе намаганні па недапушчэнні адраджэння смяротных дактрын. Як сенатар, я ўпэўнены, што гэтай мэты будзе служыць і мадэльны закон «Аб барацьбе супраць рэабілітацыі нацызму, фашызму і ідэалогіі фашызму і нацысцкай сімволікі», які распрацоўваецца Міжпарламенцкай асамблеяй СНД, а таксама шэраг іншых заканадаўчых актаў.

Сёння наспела неабходнасць стварэння закона, які рэгламентуе прыцягненне да адказнасці за размяшчэнне ў СМІ паклёпніцкай інфармацыі аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны, і гэта павінна датычыцца не толькі СМІ. Гаворка ідзе ўжо пра стварэнне законапраекта па ўвекавечванні памяці аб вайне. І гэта не будзе парушэннем правоў чалавека, нацызму ў свой час была дадзена адпаведная ацэнка.

Вы толькі ўдумайцеся, калі б не фашызм, на тэрыторыі Беларусі пражывала б больш за 30 млн чалавек. Але на працягу больш як паўстагоддзя нам не ўдаецца аднавіць панесеныя людскія страты. Мы толькі цяпер падыходзім да таго, каб колькасць насельніцтва не скарачалася, а расла.

А за мінулы год у краіне пайшло з жыцця 8,5 тыс. ветэранаў, сведак тых страшных падзей. Тыя, хто застаўся жывы, могуць з першых вуснаў расказаць праўду пра вайну, і гэта магутная зброя ў барацьбе з фальсіфікатарамі, а для моладзі вывучэнне гісторыі стане захапляльным. Вывучэнне гісторыі павінна быць праўдзівай і паважлівай размовай пра тое, як вялізная краіна вырашала — вядома ж, праходзячы праз памылкі і праблемы — свае жыццёва важныя задачы ў гэтым няпростым свеце. Наўрад ці без гэтага магчыма фарміраванне ў нашых дзяцей і ўнукаў пазітыўнага стаўлення да сябе, сваіх бацькоў і сваёй краіны. Я ўпэўнены, новае пакаленне беларусаў мае актыўную грамадзянскую пазіцыю і здольнае даць рашучы адпор прапагандыстам неанацысцкіх і расісцкіх поглядаў. Мы ніколі не змірымся з тым, што дзесьці ў суседніх краінах ушаноўваюць фашысцкіх памагатых як герояў. Гэта нязмыўная ганьба для любой нацыі.

Настасся ЗЯНЬКОВІЧ. БЕЛТА.

Дванаццаць імгненняў вайны

Асабісты пастфактум

МНОГІЯ БЕЛАРУСКІЯ ГЕРОІ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ЯК НАЛЕЖЫЦЬ ПАКУЛЬ НЕ ЎШАНАВАНЫЯ

Дзявятага мая з усіх каналаў, усіх радыёпрыёмнікаў грымелі падзякі ветэранам за Вялікую Перамогу, гучалі франтавыя песні. Але праз некалькі дзён падзякі і песні заціхнуць.
У пачатку мая газеты былі запоўненыя расказамі пра ветэранаў, але пасля Дня Перамогі гэта зноў жа заціхне...
Не хачу крыўдзіць нікога са сваіх калегаў-журналістаў, але гэта праўда. Займацца тэмай Другой сусветнай вайны, ды яшчэ цягам некалькіх месяцаў, я і блізка не збіраўся. Стракатыя і часам не вельмі шчырыя газетныя палоскі напярэдадні 9 Мая яшчэ ў мінулыя гады выпрацавалі адмоўны імунітэт. Хоць і мой дзед Васіль дайшоў да самага Берліна.
Тэма зацікавіла ў пачатку снежня, калі нечакана патэлефанаваў фотограф Саша Абуховіч:
— Жэня, глядзеў «Еўраньюс», памёр апошні ўдзельнік Першай сусветнай вайны. І ўсё, пустэча. Давай адздымем для гісторыі нашых ветэранаў, тых, якія сапраўды ваявалі...

Каб паказваць дзецям сапраўдных герояў вайны, я сфатаграфаваўся з адважнай мінскай падпольшчыцай Настассяй СОПАТАВАЙ.

Саша — не з тых фатографаў, хто працуе выключна за грошы. Рэдкі чалавек, для якога мастацтва і аб'ектыўнасць — гэта прыярытэт. Так распачаўся праект «Дванаццаць імгненняў вайны».

Хоць на афіцыйных лічбах ветэранаў у краіне болей як 40 тысяч чалавек, сапраўдных франтавікоў засталося няшмат. Ваяры, якія прайшлі праз агонь, ваду і медныя трубы, папярэдзілі нас адразу: *«Многія вешаюць на сябе малазначныя медалі, якія атрымалі пасля вайны, прыпісваюць сабе подзвігі, а самі нават акопнага пылу не панюхалі...»* Мы прыклалі ўсе намаганні, каб не натыкнуцца на такіх і не вынесці ў тэксты сфальсіфікаваныя подзвігі.

Аказалася, што сапраўдныя франтавікі не надта гаваркія, неахвотна распісваюць свой гераізм. Так, кавалер Зоркі Героя лётчык Міхаіл Шаціла доўга-доўга распавядаў, дзе і як на вайне кармілі, як яго ледзь не павялі на расстрэл і гэтак далей. І калі б не Зорка Героя, то паспрабуй разбярыся, што пра гэтага чалавека можна пісаць бестселер...

Здзіўленыя мы былі і тым, што не кожнаму ветэрану сёння жывецца раскошна. Некаторыя ў даволі цяжкім фінансавым становішчы. Калі мужчыны-франтавікі пасля вайны рабілі афіцэрскую кар'еру і маюць добрую пенсію, то шараговыя салдаты вайны і жанчыны — выключэнне.

— Калі ты быў кадравы вайскавец, то маеш добрую пенсію, калі звычайны салдат, то ледзь-ледзь зводзіш канцы з канцамі, — пажалілася вайсковая медсястра Валянціна Неафітава, блакадніца Ленінграда. У час блакады выжыла толькі 3 % яе аднагодак. *— Я кандыдат навук. Сёння атрымліваю мінімальную пенсію, плюс да гэтага — ветэранскія дадаткі. І ў выніку грошай маю менш за тое, што я атрымлівала б, калі б не была ветэранам, а проста працавала ўвесь час. А адна чыноўніца, калі я да яе звярнулася, кажа: «Вы ж калі ваявалі, не сплочвалі грошы ў пенсійны фонд».*

Некаторыя факты, пра якія расказвалі франтавікі, раней друкаваць у газетах было не прынята. У праект «Дванаццаць імгненняў вайны» трапілі каштоўныя цікавосткі. Гэта і тое, што сярод немцаў таксама былі добрыя людзі, што медсёстры не аказвалі дапамогу параненым у кароткіх спадніцах, а партызаны хоць і адыгралі ў вайне выключную ролю, але і сярод іх былі зладзеі — як і ў жыцці... Усе гэтыя непрыгладжаныя факты трэба ведаць. Уся праўда пра важныя гістарычныя падзеі павінна быць адкрытая.

Школьнікі і гімназісты, перад якімі мне часам даводзіцца выступаць, пытаюцца: *«Якія моманты праекта ўразілі вас найбольш?»*

Гэта размова з адным героем-пехацінцам (не буду называць яго прозвішча). Калі мы прыехалі, пабачылі свежую рану на галаве ветэрана. Можа, ён выпадкова ўпаў і траўмаваўся, а, можа...

Уразіла мінская падпольшчыца Настасся Сопатава, якая падкладала міны пад фашысцкія эшалоны, узрывала бензавозы, вербавала ў партызаны жывую сілу, абдурвала немцаў у іх пад носам. Я кажу дзецям, што нават амерыканскі кінагерой Рэмба выглядае побач з Настассяй Адамаўнай немаўляткам. Я не стрымаўся і папрасіў фатографа Аляксандра Абуховіча зрабіць для мяне фотаздымак на памяць разам з гэтай адважнай падпольшчыцай, каб паказваць калі-небудзь сваім дзецям...

Не ведаў я да праекта належным чынам і пра стваральніка першага партызанскага артада Васіля Каржа, які знішчыў больш за 20 тысяч гітлераўцаў. Аўтарытэт гэтага военачальніка быў настолькі высокі, што яго не змаглі рэпрэсаваць у 30-х. Корж сябраваў з маршалам Перамогі Канстанцінам Жукавым і не адвярнуўся ад таварыша, калі на маршала пачаліся ганенні.

На жаль, помніка Каржу ў сталіцы няма. Затое на праспекце Незалежнасці стаіць помнік савецкаму дзеячу Калініну, чыю жонку выслалі ў сталінскія лагеры, а «герой» за яе нават не заступіўся. Няўжо на фоне гэтых помнікаў няма месца беларускім ваярам?

У праекце «Дванаццаць імгненняў вайны» мы паспрабавалі паказаць непрычасаныя франтавыя гісторыі, без цэнзуры і прыдумак, зрабіць свой дробны ўнёсак у гістарычную справядлівасць...

Фотаздымкі праекта на гэтым тыдні можна паглядзець у Музеі Акадэміі мастацтваў (Мінск, Сурганава, 14 а).

Яўген ВАЛОШЫН.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

НА ШАХЦЕ «РАСПАДСКАЯ» ЗАГІНУЎ 31 ЧАЛАВЕК

Колькасць загінулых у выніку двух выбухаў на шахце «Распадская» ў Кемераўскай вобласці працягвае расці. Загінуў сама меней 31 чалавек, у тым ліку 18 горнавыратавальнікаў. Пра чыннікі аварыі афіцыйна не паведамляецца.

Раней кіраўнік МНС Сяргей Шойгу заявіў пра 30 загінулых. Лёс 60 чалавек учора заставаўся невядомым. Учора Шойгу заяўляў, што ў выратавальнікаў засталося 48 гадзін, каб падняць тых, хто выжыў, на паверхню. Пазней у шахце выявілі цела яшчэ аднаго загінулага горнавыратавальніка.

У шырока маштабнай пошукава-выратавальнай аперацыі бралі ўдзел спецыялісты 30 аддзяленняў выратавальнікаў з Растова, Масквы, Новасібірска, Томска, Хакасіі.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і ад сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі Дзмітрыю Мядзведзеву, а таксама ўсім родным і блізкім загінулых у выніку выбуху метану на шахце «Распадская» ў Кемераўскай вобласці.

THE GUARDIAN: ПУЦІН ЗНЯВАЖЫЎ ПРЫНЦА ЧАРЛЬЗА І ВІЦЭ-ПРЭЗІДЭНТА ЗША, НЕ ПУСЦІЎШЫ ІХ НА ПАРАД У МАСКВУ

Кіраўнік расійскага ўрада Уладзімір Пуцін не дазволіў прынцу Чарльзу і віцэ-прэзідэнту ЗША Джозафу Байдэну прысутнічаць на Парадзе Перамогі на Чырвонай плошчы, сцвярджае брытанская газета The Guardian са спасылкай на ўласныя крыніцы. Такім чынам Пуцін нібы «пакараў» Вялікабрытанію за адмову выдаць Расіі ўцекача Беразоўскага, а ЗША — за падтрымку Грузіі.

Раней Расія запрасіла на імпрэзы ў Маскву прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі Гордана Браўна і іншых кіраўнікоў дзяржаў. Але Браўн адмовіўся ад паездкі з-за ўсеагульных выбараў, і МЗС Вялікабрытаніі прапанавала кандыдатуру прынца Чарльза.

«Аднак на пазамінулым тыдні прынца паволі абышлі запрашэннем, калі Пуцін выразна даў зразумець, што не хоча яго прыезду — відаць, у знак неаслабнай незадаволенасці тым, што Брытанія не экстрадзіруе ў Расію Барыса Беразоўскага», — піша выданне.

«Пуцін таксама пагардліва абышоўся і з Байдэнам: апошні планаваў наведаць Маскву, але быў змушаны мучыцца чаканнем у Брусэлі», — піша газета, заўважаючы, што Байдэн знаходзіцца ў цесных адносінах з прэзідэнтам Грузіі Саакашвілі. Самога Саакашвілі Пуцін раней, паводле чутак, пагражаўся «павесіць за яйцы», нагадвае брытанская газета.

У ЛАТВІІ З'ЯВІЛІСЯ Ў ПРОДАЖЫ «ПАЛІТЫЧНЫЯ ПРЭЗЕРВАТЫВЫ»

У сталіцы Латвіі сталі прадаваць прэзерватывы, на ўпакоўках якіх намаляваны вядомыя латвійскія палітыкі. Пра гэта паведамляе DELFI са спасылкай на тэлеканал LNT.

Для афармлення былі скарыстаны, у прыватнасці, малюнкі лідара апазіцыйнай Народнай партыі Андрыса Шкеле, мэра Рыгі Ніла Ушакова, лідара партыі ЛПП/ЛЦ Айнара Шлесерса, былога міністра фінансаў Атыса Слактэрыса і былога кіраўніка ўрада Айгара Калвіціса.

На ўпакоўках утрымліваюцца адмысловыя інструкцыі. Так, прэзерватывы пад назвай «Nasing specal» (скажонае Nothing special) рэкамендуецца выкарыстоўваць пасля ўрокаў англійскай мовы. Фраза «Nothing special», нагадаем, стала ў Латвіі крылатай пасля таго, як яе выкарыстаў міністр фінансаў Атыс Слактэрыс у інтэрв'ю, апублікаваным у разгар эканамічнага крызісу ў канцы 2008 года (такім чынам чыноўнік адказаў на пытанне «Што адбылося з латвійскай эканомікай?»). Нагодай для жартаў таксама стаў не занадта высокі ўзровень валодання англійскай мовай, які прадэманстраваў чыноўнік.

Звесткамі пра вынікі продажаў палітычных прэзерватываў журналісты не валодаюць.

У БРЫТАНІІ СКЛАЛІ РЭЙТЫНГ СЭКСУАЛЬНАГА ТРАЎМАТЫЗМУ

Брытанскія сацыёлагі склалі рэйтынг сэксуальнага траўматызму, выявіўшы, што бурная ноч кахання прыносіць пакуты кожнаму трэцяму брытанцу, паведамляе NEWSru Israel.

40 % рэспандэнтаў прызналіся падчас тэлефоннага апытання, што толькі на раніцу яны звярнулі ўвагу на тое, што былі вельмі неасцярожныя ўначы. У 60 % выпадкаў пакалечаныя палюбоўнікі прызнаваліся, што ў запале ім было не да болю ў спіне ці локцевых суставах. Каля 5 % брытанцаў паведамілі, што траўмы, атрыманыя на любоўным ложы, вымусілі іх звярнуцца да медыкаў за бюлетэнем, піша The Daily Telegraph.

Адным з самых небяспечных месцаў для заняткаў сэксам з'яўляецца канапа. Не самымі зручнымі месцамі для занятку сэксам таксама прызнаны: лесвіцы і пад'езды, сямейныя аўтамабілі, душавыя кабінкі, крэслы, кухонныя сталы, прыбіральні і ўбудаваныя шафы ў офісе. Кожны дзясяты рэспандэнт распавёў пра тое, што ён сам ці яго партнёрка калі-небудзь валіліся з ложка, а кожны 50-ы брытанец падаў з пральнай машыны.

Самыя распаўсюджаныя траўмы падчас любоўных гульняў — гэта расцяжэнне мышцаў ці сухажылляў, траўмы спіны, «дывановыя апёкі» (ранкі, якія ўзнікаюць ад моцнага трэння цела аб падлогавае пакрыццё), спазмы мышцаў шыі, пашкоджанні локцяў і каленных суставаў, удар пляча, вывіх калена, траўмы запясця ці шчыкалаткі.

Паводле меркавання медыкаў, ёсць тры асноўныя прычыны сэксуальнага траўматызму: малавопытнасць, неўтаймаванасць і празмерная вынаходлівасць, злучаная часта з імкненнем партнёраў (ці аднаго з іх) «рабіць, як у кіно».

Рэгіёны Расіі — у Беларусі: Курганская вобласць

Сумесны беларуска-расійскі інфармацыйна-інтэграцыйны праект Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь і рэдакцыі газеты «Звязда»

Алег БАГАМОЛАЎ: «КРОПКІ СУДАКРАНАННЯ ЁСЦЬ»

Гістарычна склалася, што беларускі і расійскі народы маюць агульныя карані. Абодва народы — славянскія, трымаюцца праваслаўя, маюць агульнае мінулае. У гады існавання Савецкага Саюза вялося актыўнае эканамічнае супрацоўніцтва, паміж арганізацыямі і прадпрыемствамі была цесная кааперацыя. На жаль, з распадам СССР большасць сувязяў паміж Рэспублікай Беларусь і рэгіёнамі Расіі разбурылася. Сусветны фінансава-эканамічны крызіс дыктуе вострую неабходнасць аднавіць страчанае — наладжваць новыя сувязі, адкрываць рынкі збыту, умацоўваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва. Менавіта з гэтай мэтай па запрашэнні прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь С.С. Сідорскага ў Мінск з Расіі прыбыла дэлегацыя Курганскай вобласці на чале з губернатарам Алегам Аляксеевічам Багамолавым, які напярэдадні адказаў на некалькі пытанняў «Звязды».

Нагадаем, што Курганскую вобласць многія называюць заўральскім краем, бо гэты рэгіён размешчаны на стыку Урала і Сібіры. Па плошчы ён пераўзыходзіць некаторыя еўрапейскія краіны, а насельніцтва складае каля мільёна чалавек. Галоўным прыродным багаццем Заўралля з'яўляецца ўрадлівая зямля. Сельскагаспадарчыя ўгоддзі займаюць тут больш за 60 працэнтаў плошчы рэгіёна, а пятую частку — лясы. Сёння Курганская вобласць вырабляе ў агульнарасійскім аб'ёме 30 працэнтаў пажарных машын, амаль трэць — антыбіётыкаў, чвэрць — маставых металаканструкцый, 17,5 працэнта аўтобусаў.

— Алег Аляксеевіч, і ў Курганскай вобласці, і ў Заўраллі надаюць нямала ўвагі інтэграцыяналізацыі дзелавога супрацоўніцтва з замежнымі краінамі. Але фінансавы і эканамічны крызіс, безумоўна, не можа не адбіцца на рэалізацыі намечаных планаў міжнароднага гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння. Як дзейнічаць у такіх умовах?

— Сённяшнія цяжкасці не павінны прыводзіць да поўнай адмовы ад рэалізацыі сумесных праектаў і развіцця міжрэгіянальнага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Менавіта цяпер сумесная карпатлівая работа, накіраваная на дасягненне канкрэтных вынікаў, набывае асаблівую важнасць. Своечасовае вырашэнне любых узнікаючых пытанняў і дакладнае прытрымліванне дасягнутым дамоўленасцям дазволяць не толькі пераадолець крызісныя з'явы ў эканоміцы з мінімальнымі стратамі, але і стварыць усе ўмовы для далейшага развіцця партнёрскіх сувязяў.

— Як развіваліся адносіны Курганскай вобласці з Рэспублікай Беларусь у апошнія гады?

— Па выніках мінулага года Беларусь заняла шостае месца па аб'ёме знешнегандлёвага абароту вобласці. У 2009 годзе прадукцыю на беларускі рынак пастаўлялі 15 прадпрыемстваў Курганскай вобласці, пры гэтым вывозілася ў асноўным прадукцыя з закончаным цыклам перапрацоўкі. У прыватнасці, у мінулым годзе заўральскімі прадпрыемствамі экспартаваліся ў Беларусь аўтобусы, лекавыя сродкі, медыцынская тэхніка, помпы, даільныя ўстаноўкі, фібра стальная (металічны напаўняльнік у жалезабетонных сумесях), іголкаролікі, электрамантажныя вырабы, абсталяванне і механічныя прыстасаванні. Адзначу, што па выніках 2007—2009 гадоў найбольш актыўнымі ўдзельнікамі гандлю з беларускімі партнёрамі сталі ТАА «Курганскі аўтобусны завод», ААТ «Сінтэз», які вырабляе прадукцыю медыцынскага прызначэння, ААТ «Катайскі помпавы завод», ААТ «Кургансельмаш» і ЗАТ «Курганстальмост». Для ўмацавання гэтага супрацоўніцтва адміністрацыяй Курганскай вобласці і Міністэрствам знешніх эканамічных сувязяў Рэспублікі Беларусь яшчэ ў верасні 1998 года было заключана Пагадненне аб супрацоўніцтве і дзелавым партнёрстве і падпісаны Пратакол да пагаднення, якія дзейнічаюць і сёння. Падчас цяперашняга візіту мы плануем падпісанне Мемарандума з Урадам Рэспублікі Беларусь аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве, а таксама адпаведнага Пратакола мерапрыемстваў на 2010—2011 гады.

— Што можа прапанаваць Курганская вобласць беларускаму боку?

— Ва ўмовах фінансавай нестабільнасці мы зацікаўлены ў надзейных партнёрах. Беларусь — стабільная краіна, з добрай дынамікай развіцця, валодае моцнымі прамысловымі галінамі з прагрэсіўнымі вытворчымі традыцыямі, развітой сельскай гаспадаркай, буйным навукова-тэхнічным і кадравым патэнцыялам. У першую чаргу, як мне здаецца, неабходна наладзіць узаемадзеянне ў прамысловасці — наша вобласць мае важкую базу для машынабудавання. Мы многае маглі б прапанаваць беларускаму бізнэсу. Практычна ўсе прадпрыемствы захаваліся і, нягледзячы на крызіс, працягваюць работу. Доля апрацоўчых вытворчасцяў у структуры прамысловасці Курганскай вобласці складае каля 80 працэнтаў і знаходзіцца на ўзроўні эканамічна развітых краін. Асноўны вынік нашай працы — гэта прадукцыя закончанага цыкла вытворчасці: пажарныя машыны, запорная арматура, маставыя канструкцыі і многае іншае, пра што я ўжо сказаў.

Мы зацікаўленыя ў абмене інавацыйнымі тэхналогіямі — гэта дазволіць Курганскай вобласці павялічыць аб'ём высокатэхналагічнай і канкурэнтаздольнай прадукцыі, а беларускім кампаніям — пашырыць рынкі збыту. І тут магчымыя любыя формы супрацоўніцтва, уключаючы стварэнне сумесных прадпрыемстваў як на нашай, так і на беларускай тэрыторыі. Сярод галінаў, якія мы маем намер сур'ёзна развіваць, знаходзіцца наш будаўнічы комплекс. Запрашаем беларускія будаўнічыя кампаніі да нас у Заўралле на будаўніцтва жылля розных катэгорый: ад эканом-класа да элітнага. Магчыма, беларускіх інвестараў зацікавіць распрацоўка сыравінных рэсурсаў для будаўнічага комплексу. У нас ёсць багатыя запасы высакаякасных глін — для вытворчасці цэглы. Ёсць лес, неабходны для будаўніцтва жылля, вырабу мэблі і для іншых патрэбаў.

Я назаву яшчэ турызм. Рэспубліка Беларусь, якая прапануе недарагі і якасны адпачынак на сваёй тэрыторыі, уяўляе пэўны інтарэс для турыстаў з Курганскай вобласці. У тым ліку і ў плане дзіцячага адпачынку. У вас дзейнічае дзевяць дзіцячых санаторыяў, дзе маглі б адпачыць і нашы дзеці, а вашы маглі б пабываць у заўральскіх здраўніцах. Курганская вобласць мае найбагацейшыя прыродныя рэсурсы для паляўніцкага і рэкрэацыйнага турызму. У Заўраллі можна паляваць круглы год. З усяго свету да нас прыязджаюць, каб павезці з сабой трафей — сібірскую казулю, якая захавалася толькі ў нашай вобласці. У нашых лясах палююць таксама на лася, ваўка, кабана, барсука, лісу, рысь, куніцу, зайца. Таму запрашаем да нас беларускіх амататараў паляванне. У нас — тры тысячы азёраў. Палова з іх — прэснаводныя, на якіх — цудоўная рыбалка. Ёсць некалькі грязевых азёраў з высокімі лекавымі ўласцівасцямі. Па мінералізацыі яны пераўзыходзяць нават Мёртвае мора ў Ізраілі. Да нас едуць з іншых краін, каб прайсці курс аздараўлення на гэтых азёрах. Мы гатовыя развіваць усе гэтыя накірункі.

Дарэчы, развіццю сферы турызму садзейнічае пагадненне паміж нашымі краінамі, якое забяспечвае роўныя правы грамадзянам Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі на свабоду перамяшчэння, выбар месца знаходжання і жыхарства на тэрыторыях дзяржаў — удзельніц Саюзнай дзяржавы, падпісанае 24 студзеня 2006 года ў Санкт-Пецярбургу. Лічым, што гэты механізм дазволіць актывізаваць развіццё турызму на тэрыторыі Беларусі і ў Курганскай вобласці. Хочацца спадзявацца, што дзелавы візіт прадстаўнікоў Курганскай вобласці ў Рэспубліку Беларусь дазволіць умацаваць наша партнёрства, пакладзе пачатак новаму этапу супрацоўніцтва.

— І ў Расіі, і ў Беларусі істотным чынам мяняецца роля малога і сярэдняга бізнэсу, які павінен стаць своеасаблівай «падушкай бяспекі» для радавых грамадзян нашых краін. Якія сумесныя праграмы супрацоўніцтва ў гэтай сувязі маглі б прапанаваць прадстаўнікам беларускага прадпрымальніцтва малыя і сярэднія прадпрыемствы і індывідуальныя прадпрымальнікі Курганскай вобласці?

— У існуючых умовах прадпрыемствы малога і сярэдняга бізнэсу Курганскай вобласці асабліва зацікаўленыя ў пашырэнні рынку збыту сваёй прадукцыі. За межы Расіі, у тым ліку і ў Беларусь, прадпрымальнікі гатовыя пастаўляць шырокі асартымент тавараў, што вырабляюцца ў Курганскай вобласці. Напрыклад, прадукцыю машынабудавання і металаапрацоўкі, лесаперапрацоўкі, харчовай прамысловасці. Курганская вобласць і Рэспубліка Беларусь традыцыйна арыентаваны на вытворчасць прадукцыі сельскай гаспадаркі. У Расіі мы займаем дзявятае месца па збожжы, сёмае — па агародніне, па бульбе — 20-е. Менавіта ў гэтай сферы маецца неацэнны вопыт, якім мы гатовыя абмяняцца з беларускімі калегамі.

У сваю чаргу нам неабходныя інвестыцыі ў глыбокую перапрацоўку сельскагаспадарчай прадукцыі, у тым ліку збожжа, агародніны: кансерваванне, глыбокае замарожванне садавіны. У цяперашні час Курганская вобласць вялікую колькасць гэтай прадукцыі вывозіць у суседнія рэгіёны для наступнай перапрацоўкі. Таму мы гатовыя да супрацоўніцтва з беларускімі кампаніямі не толькі для нарошчвання перапрацоўчых магутнасцяў, але і для распрацоўкі комплекснага падыходу да сельскагаспадарчай галіны Курганскай вобласці.

Ёсць, безумоўна, і праблемы, якія нам яшчэ трэба вырашаць. Возьмем, напрыклад, тыя ж тавары народнага спажывання. Заўральцы добра знаёмыя з беларускай мэбляй, трыкатажам... Тавар добры і недарагі. Але ён для нас мог быць яшчэ больш танным, калі б такімі пастаўкамі займаліся не пасрэднікі, а самі беларускія вытворцы. Праблема? Так. І думаю, што з часам агульнымі

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ УНЯСЕННІ ДАПАЎНЕННЯЎ І ЗМЯНЕННЯЎ У КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АБ ЗЯМЛІ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 9 красавіка 2010 года
Ухвалены Саветам Рэспублікі 19 красавіка 2010 года

Артыкул 1. Унесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб зямлі ад 23 ліпеня 2008 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 187, 2/1522; № 275, 2/1544; 2010 г., № 6, 2/1648) наступныя дапаўненні і змяненні:

1. У артыкуле 1:

у абзацы пятым:

пасля слоў «дэталёвага планавання,» дапоўніць абзац словамі «схем землеўпарадкавання раёнаў,»;

слова «дзяржаўнымі» выключыць;

абзац сёмы выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«дзяржаўны кантроль за выкарыстаннем і аховай зямель — дзейнасць дзяржаўных органаў, накіраваная на прадухіленне, выяўленне і ўстараненне парушэнняў заканадаўства аб ахове і выкарыстанні зямель, якая ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі;».

2. Абзац чацвёрты часткі другой артыкула 3 дапоўніць словамі «(карыстання без загадзя ўстаноўленага тэрміну)».

3. З часткі першай артыкула 9 словы «па прапанове тэрытарыяльных органаў Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь» выключыць.

4. У артыкуле 10:

пасля часткі першай дапоўніць артыкул часткай наступнага зместу:

«Не дапускаецца падзел зямельных участкаў, выдзеленых для будаўніцтва і (або) абслугоўвання аднакватэрных жылых дамоў.»;

частку другую лічыць часткай трэцяй.

5. З частак першай і другой артыкула 11 словы «на падставе рашэння аб адабранні і выдзяленні зямельнага ўчастка» выключыць.

6. У артыкуле 12:

у частцы першай словы «грамадзян Рэспублікі Беларусь, у прыватнай уласнасці замежных грамадзян і асобаў без грамадзянства, якія з'яўляюцца сваякамі спадчынадаўца, у выпадку атрымання імі ў спадчыну зямельных участкаў, выдзеленых спадчынадаўцу ў прыватную ўласнасць, у прыватнай уласнасці» замяніць словам «грамадзян,»;

пасля часткі чацвёртай дапоўніць артыкул часткай наступнага зместу:

«У прыватнай уласнасці грамадзян Рэспублікі Беларусь могуць знаходзіцца зямельныя ўчасткі, выдзеленыя грамадзянам Рэспублікі Беларусь да ўваходжання ў сілу гэтага Кодэкса, зямельныя ўчасткі, права прыватнай уласнасці на якія перайшло да іх у вызначаным парадку, а таксама зямельныя ўчасткі, выдзеленыя ў адпаведнасці з часткай шостай гэтага артыкула.»;

часткі пятую—сёмую лічыць адпаведна часткамі шостай—восьмай;

у частцы шостай:

абзац першы выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Зямельныя ўчасткі могуць выдзяляцца ў прыватную ўласнасць грамадзянам Рэспублікі Беларусь для:»;

абзац трэці дапоўніць словамі «, аддзеленай ад іншых кватэр вертыкальнай сцяной і размешчанай непасрэдна на зямельным участку (далей — кватэра ў блакіраваным жылым доме)»;

абзац чацвёрты выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі ў сельскіх населеных пунктах, пасёлках гарадскога тыпу — зарэгістраваным па месцы жыхарства ў гэтых населеных пунктах;».

7. У артыкуле 13:

назву артыкула дапоўніць словамі «, уласнасць замежных дзяржаў, міжнародных арганізацый»;

у частцы другой:

абзац трэці выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«на тэрыторыях, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджванню (зоны эвакуацыі (адчужэння), зоны першачарговага адсялення і зоны наступнага адсялення, з якіх адселена насельніцтва);»;

абзац пяты пасля слоў «дэталёвага планавання» дапоўніць словамі «, схемамі землеўпарадкавання раёнаў».

8. Артыкулы 14—16 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 14. Пажыццёвае спадчыннае валоданне зямельнымі ўчасткамі

На праве пажыццёвага спадчыннага валодання ў грамадзян Рэспублікі Беларусь могуць знаходзіцца зямельныя ўчасткі, выдзеленыя грамадзянам Рэспублікі Беларусь да ўваходжання ў сілу гэтага Кодэкса, зямельныя ўчасткі, права пажыццёвага спадчыннага валодання на якія перайшло да іх у вызначаным парадку, а таксама зямельныя ўчасткі, выдзеленыя ў адпаведнасці з часткай другой гэтага артыкула.

Зямельныя ўчасткі могуць выдзяляцца ў пажыццёвае спадчыннае валоданне грамадзянам Рэспублікі Беларусь:

для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома — у выпадках, вызначаных Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, калі зямельныя ўчасткі выдзяляюцца без правядзення аўкцыёну;

для абслугоўвання жылога дома, зарэгістраванай арганізацыяй па дзяржаўнай рэгістрацыі кватэры ў блакіраваным жылым доме, якія належаць ім на праве ўласнасці або іншай законнай падставе;

для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі ў сельскіх населеных пунктах, пасёлках гарадскога тыпу — зарэгістраванай па месцы жыхарства ў гэтых населеных пунктах;

для вядзення сялянскай (фермерскай) гаспадаркі;

для калектыўнага садаводства;

для дачнага будаўніцтва;

для традыцыйных народных промыслаў (рамёствaў).

Зямельныя ўчасткі могуць знаходзіцца ў пажыццёвым спадчынным валоданні замежных грамадзян і асобаў без грамадзянства, якія з'яўляюцца сваякамі спадчынадаўца, у выпадку атрымання ў спадчыну зямельнага ўчастка, які знаходзіўся ў спадчынным валоданні, у тым ліку пры атрыманні ў спадчыну размешчанага на такім участку жылога дома, зарэгістраванай арганізацыяй па дзяржаўнай рэгістрацыі кватэры ў блакіраваным жылым доме, дачы, садовага доміка, калі іншае не вызначана заканадаўчымі актамі.

Заканадаўчымі актамі могуць вызначацца і іншыя выпадкі выдзялення зямельных участкаў у пажыццёвае спадчыннае валоданне.

Артыкул 15. Пастаяннае карыстанне зямельнымі ўчасткамі

На праве пастаяннага карыстання ў юрыдычных асобаў Рэспублікі Беларусь могуць знаходзіцца зямельныя ўчасткі, выдзеленыя ім да ўваходжання ў сілу гэтага Кодэкса, зямельныя ўчасткі, права пастаяннага карыстання на якія ў вызначаным парадку перайшло да іх ад іншых юрыдычных асобаў Рэспублікі Беларусь, а таксама зямельныя ўчасткі, выдзеленыя ў адпаведнасці з часткай другой гэтага артыкула.

Зямельныя ўчасткі выдзяляюцца ў пастаяннае карыстанне:

дзяржаўным органам, іншым дзяржаўным арганізацыям (за выключэннем выдзялення зямельных участкаў для будаўніцтва аўтазаправачных станцый) — для ажыццяўлення імі сваіх задач і функцый, прадугледжаных заканадаўствам;

недзяржаўным юрыдычным асобам Рэспублікі Беларусь — для абслугоўвання аб'ектаў нерухомай маёмасці, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці;

сельскагаспадарчым арганізацыям, у тым ліку сялянскім (фермерскім) гаспадаркам, іншым арганізацыям — для вядзення сельскай гаспадаркі, у тым ліку сялянскай (фермерскай) гаспадаркі, а таксама для вядзення падсобнай сельскай гаспадаркі;

навуковым арганізацыям, установам адукацыі — для даследчых і (або) вучэбных мэтаў у галіне сельскай або лясной гаспадаркі;

дзяржаўным лесагаспадарчым установам, арганізацыям мясцовых выканаўчых камітэтаў, у кампетэнцыю якіх уваходзіць вядзенне лесапаркавай гаспадаркі, — для вядзення лясной гаспадаркі;

рэлігійным арганізацыям — для будаўніцтва месцаў пахавання, культавых збудаванняў, у тым ліку будынкаў епархіяльных управленняў, манастырскіх комплексаў, духоўных навучальных устаноў;

юрыдычным асобам — для будаўніцтва шматкватэрных жылых дамоў (за выключэннем жылых дамоў павышанай камфортнасці згодна з крытэрыямі, вызначанымі заканадаўчымі актамі), абслугоўвання шматкватэрных жылых дамоў, будаўніцтва і (або) абслугоўвання гаражоў і аўтамабільных стаянак;

садаводчым таварыствам — для вядзення калектыўнага садаводства (зямельныя ўчасткі агульнага карыстання садаводчых таварыстваў);

юрыдычным асобам, калі патрабуецца выдзяленне ім іншага зямельнага ўчастка ўзамен таго, які забіраецца, у выпадках, калі зямельны ўчастак, які забіраецца, выдзелены такім асобам на праве пастаяннага карыстання;

юрыдычным асобам Рэспублікі Беларусь — пры неабходнасці заняцця дадатковага зямельнага ўчастка, калі ў ходзе рэканструкцыі аб'екта, які існуе, без змянення яго функцыянальнага прызначэння або пры выкананні праектна-разведвальных работ высветлілася, што для будаўніцтва аб'екта патрабуецца зямельны ўчастак большага памеру ў выпадках, калі першапачатковага зямельны ўчастак выдзелены юрыдычнай асобе на праве пастаяннага карыстання.

Заканадаўчымі актамі і рашэннямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь могуць вызначацца і іншыя выпадкі выдзялення зямельных участкаў у пастаяннае карыстанне.

Артыкул 16. Часовае карыстанне зямельнымі ўчасткамі

На праве часовага карыстання ў грамадзян, юрыдычных асобаў Рэспублікі Беларусь могуць знаходзіцца зямельныя ўчасткі, выдзеленыя ім да ўваходжання ў сілу гэтага Кодэкса або ў адпаведнасці з часткай другой гэтага артыкула, а таксама ў юрыдычных асобаў Рэспублікі Беларусь — зямельныя ўчасткі, права часовага карыстання на якія ў вызначаным парадку перайшло да іх ад іншых юрыдычных асобаў Рэспублікі Беларусь.

У часовае карыстанне зямельныя ўчасткі могуць выдзяляцца:

асобам і для мэтаў, названых у частцы другой артыкула 15 гэтага Кодэкса, — на тэрмін да дзесяці гадоў, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі;

грамадзянам Рэспублікі Беларусь для агародніцтва, сенакашэння і выпасу сельскагаспадарчых жывёл — на тэрмін да дзесяці гадоў;

грамадзянам Рэспублікі Беларусь, названым у частцы другой артыкула 41 гэтага Кодэкса, для будаўніцтва (устаноўкі) часовых індывідуальных гаражоў на прысядзібных тэрыторыях — на тэрмін да дзесяці гадоў;

юрыдычным асобам Рэспублікі Беларусь для здабычы агульнараспаўсюджаных карысных выкапняў, у тым ліку торфу, а таксама для выкарыстання геатэрмальных рэсурсаў нетраў — на тэрмін да дваццаці гадоў;

нацыянальным і замежным інвестарам на падставе канцэсійных дагавораў — на тэрмін да дзевяноста дзевяці гадоў у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства аб ахове і выкарыстанні зямель і аб інвестыцыйнай дзейнасці.

Заканадаўчымі актамі і рашэннямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь могуць вызначацца і іншыя выпадкі выдзялення зямельных участкаў у часовае карыстанне.».

9. Частку сёмую артыкула 17 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Выдзяленне ў арэнду зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў прыватнай уласнасці, з размешчанымі на іх жылымі дамамі, зарэгістраванымі арганізацыямі па дзяржаўнай рэгістрацыі кватэрамі ў блакіраваных жылых дамах, дачамі, садовымі домікамі, іншымі капітальнымі збудаваннямі (будынкамі, пабудовамі) дапускаецца толькі разам з гэтымі капітальнымі збудаваннямі (будынкамі, пабудовамі) з захаваннем мэтавага прызначэння зямельных участкаў і пры наяўнасці дакументаў, якія сведчаць права на гэтыя аб'екты нерухомай маёмасці.».

10. У артыкуле 20:

у частцы першай словы «часткай другой» замяніць словамі «часткамі другой і трэцяй»;

у частцы другой:

словы «ў населеных пунктах» замяніць словамі «на прысядзібнай тэрыторыі»;

дапоўніць частку словамі «, за выключэннем выпадкаў заканчэння тэрміну карыстання зямельным участкам, выдзеленым у часовае карыстанне»;

дапоўніць артыкул часткай трэцяй наступнага зместу:

«У выпадку заканчэння тэрміну карыстання зямельным участкам, выдзеленым у часовае карыстанне або арэнду, гэтыя правы лічацца спыненымі з моманту заканчэння такога тэрміну.».

11. У артыкуле 21:

частку першую пасля слоў «гэтага артыкула,» дапоўніць словамі «а таксама спынення права часовага карыстання зямельным участкам або права арэнды зямельнага ўчастка ў сувязі з заканчэннем тэрміну карыстання ім,»;

у частцы другой словы «ў населеных пунктах» замяніць словамі «на прысядзібнай тэрыторыі».

12. У абзацы сёмым артыкула 24 словы «пералік банкаў» замяніць словамі «патрабаванні да банкаў».

13. У артыкуле 25:

абзац дзясяты выключыць;

абзацы адзінаццаты—пятнаццаты лічыць адпаведна абзацамі дзясятым—чатырнаццатым.

14. У артыкуле 26:

у частцы першай:

абзацы сёмы і дванаццаты выключыць;

абзацы восьмы—адзінаццаты і трынаццаты лічыць адпаведна абзацамі сёмым—адзінаццатым;

у частцы другой словы «свае тэрытарыяльныя органы і падпарадкаваныя» замяніць словамі «падпарадкаваныя яму».

15. У частцы першай артыкула 27:

абзац пяты дапоўніць другім сказам наступнага зместу: «. Не дапускаецца змяненне мэтавага прызначэння зямельных участкаў, выдзеленых для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі»;

абзац восьмы выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«могуць прымаць рашэнне аб дазволе растэрміноўкі ўнясення платы за права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў або платы за зямельныя ўчасткі, якія выдзяляюцца ў прыватную ўласнасць, у выпадку, калі імі прынята рашэнне аб выдзяленні зямельных участкаў у арэнду для будаўніцтва і абслугоўвання капітальных збудаванняў (будынкаў, пабудоў) або ў прыватную ўласнасць для будаўніцтва і абслугоўвання аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў, у тым ліку па выніках аўкцыёнаў;»;

пасля абзаца восьмага дапоўніць частку абзацам наступнага зместу:

«прымаюць у адпаведнасці з кампетэнцыяй па адабранні і выдзяленні зямельных участкаў рашэнні, якія з'яўляюцца падставай для дзяржаўнай рэгістрацыі стварэння, змянення, спынення існавання зямельных участкаў, узнікнення, пераходу або спынення правоў, абмежаванняў (абцяжарванняў) правоў на іх;»;

абзацы дзявяты—трынаццаты лічыць адпаведна абзацамі дзясятым—чатырнаццатым;

абзац адзінаццаты дапоўніць словамі «непасрэдна і (або) праз свае землеўпарадкавальныя службы».

16. У частцы першай артыкула 28:

абзац чацвёрты дапоўніць другім сказам наступнага зместу: «. Не дапускаецца змяненне мэтавага прызначэння зямельных участкаў, выдзеленых для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі»;

абзац сёмы выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«могуць прымаць рашэнне аб дазволе растэрміноўкі ўнясення платы за права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў або платы за зямельныя ўчасткі, якія выдзяляюцца ў прыватную ўласнасць, у выпадку, калі імі прынята рашэнне аб выдзяленні зямельных участкаў у арэнду для будаўніцтва і абслугоўвання капітальных збудаванняў (будынкаў, пабудоў) або ў прыватную ўласнасць для будаўніцтва і абслугоўвання аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў, у тым ліку па выніках аўкцыёнаў;»;

пасля абзаца восьмага дапоўніць частку абзацам наступнага зместу:

«прымаюць рашэнне аб дазволе растэрміноўкі ўнясення платы за права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў або платы за зямельныя ўчасткі, якія выдзяляюцца ў прыватную ўласнасць, у выпадку, калі імі прынята рашэнне аб выдзяленні зямельных участкаў у арэнду для будаўніцтва і абслугоўвання капітальных збудаванняў (будынкаў, пабудоў) або ў прыватную ўласнасць для будаўніцтва і абслугоўвання аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў, у тым ліку па выніках аўкцыёнаў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, выдзеленых імі;»;

прымаюць рашэнні аб падзеле, зліцці, змяненні межаў і стварэнні ў дачыненні да зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, узнікнення, пераходу або спынення правоў, абмежаванняў (абцяжарванняў) правоў на іх;

прымаюць рашэнні аб падзеле, зліцці, змяненні межаў і стварэнні ў дачыненні да зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, выдзеленых імі;»;

абзацы шосты—дзявяты лічыць адпаведна абзацамі восьмым—адзінаццатым.

19. У артыкуле 31:

у частцы першай слова «адзінаццатай» замяніць словам «дзясятай»;

у частцы пятай словы «выдзялення зямельных участкаў у прыватную ўласнасць па выніках аўкцыёну» замяніць словамі «, прадугледжаных часткамі чацвёртай і дзясятай гэтага артыкула»;

часткі сёмую і дванаццатую выключыць;

часткі восьмую—адзінаццатую лічыць адпаведна часткамі сёмай—дзясятай;

часткі сёмую—дзясятую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«За права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці і выдзяляюцца ў арэнду без правядзення аўкцыёну, уносіцца плата, вызначаная на падставе кадастравага кошту гэтых участкаў, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткай дзясятай гэтага артыкула. Парадак вызначэння памеру платы за права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў або платы за зямельныя ўчасткі, якія выдзяляюцца ў дзяржаўнай уласнасці і выдзяляюцца без правядзення аўкцыёну на права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў, вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Плата за права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці і выдзяляюцца ў арэнду па выніках аўкцыёну, вызначаецца па выніках аўкцыёну і не можа быць ніжэй за пачатковую цану права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў, вызначанай на падставе кадастравага кошту зямельных участкаў з прымяненнем каэфіцыентаў у залежнасці ад тэрміну іх арэнды, вызначаных Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь для вызначэння платы за права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў, якія выдзяляюцца без правядзення аўкцыёну на права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў.

Калі прыняцце рашэння аб выдзяленні зямельных участкаў у арэнду для будаўніцтва і абслугоўвання капітальных збудаванняў (будынкаў, пабудоў) або ў прыватную ўласнасць для будаўніцтва і абслугоўвання аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў, у тым ліку па выніках аўкцыёнаў, уваходзіць у кампетэнцыю абласных, Мінскага гарадскога, гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання), раённых выканаўчых камітэтаў, імі можа быць прынята рашэнне аб дазволе растэрміноўкі ўнясення

МУС УРУЧЫЛА СВАІМ ВЕТЭРАНАМ «ФРАНТАВЫЯ ПАСЫЛКІ»

ВА ўсіх органах і падраздзяленнях Міністэрства ўнутраных спраў ушанавалі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны — наведалі дома, уручылі юбілейныя медалі, кветкі і «франтавыя пасылкі», у кожнай з якіх — стылізаваны нумар газеты «Красная звезда» ад 10 мая 1945 года з паведамленнем аб Перамозе.

Днямі ў Дзяржаўным экспертна-крыміналістычным цэнтры МУС адбыўся гала-канцэрт пераможцаў агляд-конкурсаў мастацкай самадзейнасці супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і вайскоўцаў унутраных войскаў «Ёсць месца подзвігу». Цёплыя словы ў адрас ветэранаў прагучалі на мерапрыемстве і ад міністра ўнутраных спраў Анатоля Куляшова, які, у прыватнасці, сказаў, што вайна стала сур'ёзным экзаменам на мужнасць і гераізм для беларускай міліцыі, і гэты экзамен быў з гонарам вытрыманы. На ўрачыстасцях прысутнічалі таксама госці з МУС Расіі, якія прыехалі ў Беларусь у межах сумеснай патрыятычнай акцыі «Эстафета Подзвігу», арганізаванай рэдакцыямі друкаваных выданняў міністэрстваў абедзвюх краін — «На страже» і «Щит и меч». Напярэдадні, пасля наведвання Брэсцкай крэпасці, гасцям перадалі капсулу з зямлёй гэтага праслаўленага месца. Расійскія калегі ў сваю чаргу перадалі беларускай ветэранскай арганізацыі МУС капсулу з маскоўскай зямлёй, на якой вяліся некалі жорсткія баі з нямецкім праціўнікам.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ПЕРАМОГА Ў АСОБАХ

У сталічным Палацы ветэранаў чакае сваіх наведнікаў фотавыстава «Жаночы твар Перамогі». Адчынілася гэта экспазіцыя яшчэ напярэдадні святочных дзён у гарадской ратушы, дзе прысутнічалі ветэраны і ўдзельнікі вайны, а таксама актывісты моладзевых і грамадскіх арганізацый — а ўчора пераехала ў Палац ветэранаў, дзе працягне работу да 3 ліпеня.

Ініцыятарам выставы выступіла гарадская арганізацыя ГА «Беларускі саюз жанчын» пры падтрымцы Мінгарвыканкама. Героямі ж фотагалерэі сталі 35 мінчанак-удзельніц Вялікай Айчыннай вайны, многія з якіх дайшлі да Берліна. «На фронт некаторыя з гэтых дзяўчат трапілі зусім юнымі, бо наўмысна прыпісвалі сабе лішнія гады, але ва ўсіх іх хапіла моцы прайсці праз усю вайну, вярнуцца і перадаць памяць сваім дзецям і ўнукам, — расказала на адкрыцці экспазіцыі старшыня Мінскай гарадской жаночай рады Ірына Аляксанава. — Не хацелася б, каб гэта экспазіцыя проста прайшла і забылася, таму плануем, што пасля завяршэння яе работы фотапартрэты будуць змешчаныя ў грамадскай прыёмнай нашай арганізацыі».

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Наведаць выставу і ўзгадаць гісторыю

У Мінску прайшла прэзентацыя «Энцыклапедыі вайны»

...Першай друкарняй, якая з'явілася ў Мінску ва ўмовах падполля, стала друкарня «Звязды». Яе працу арганізавалі ў 1941 годзе, і ўжо хутка выйшаў першы нумар газеты ў падполлі. «Чырвоная змена» друкавалася ў вёсцы Сасноўка на Палессі. Партызаны распаўсюджвалі яе на ўсіх акупаваных тэрыторыях, расклейваючы асобнікі газеты на тэлеграфных слупах...

Гэтыя і іншыя старонкі гісторыі ваеннай прэсы прапаноўвае ўзгадаць Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа пры Акадэміі навук. Днямі ў ёй адкрылася новая выстава «Паклонімся вялікім тым гадам».

На экспазіцыі можна прасачыць гісторыю з'яўлення і развіцця беларускай прэсы ваенных гадоў, убачыць насценныя газеты і лістоўкі, якія распаўсюджваліся ў невялікіх партызанскіх атрадах, а таксама паглядзець малюнкі, фотаздымкі і шаржы, змешчаныя ў газетах тых часоў. Асаблівая цікавасць да асабістых архіваў пісьменнікаў: на выставе прэзентаваныя іх ваенныя рукапісы. Усяго на экспазіцыю выстаўлена 178 дакументаў з фонду бібліятэкі.

Напярэдадні 9 мая на выставе адбылася прэзентацыя кнігі «Энцыклапедыя Перамогі: Беларусь — Масква». Выданне, падрыхтаванае сумесна з «Беларускай энцыклапедыяй імя П. Броўкі» і ўрадам Масквы, распавядае пра пачатак вайны, партызанскі і падпольны рух, пра асноўныя этапы вызвалення Беларусі. Кніга прысвечаная 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 65-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і 75-годдзю з часоў заснавання звання Героя Савецкага Саюза.

Як расказаў «Звяздзе» **галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі» Уладзімір САЛАМАХА**, калектыў кнігі быў створаны з дзяцей, унукаў і праўнукаў ветэранаў вайны. Складальнікі — беларусы Барыс Даўгатовіч і Ларыса Языковіч, з расійскага боку — прадстаўнік выдавецтва «Армпрэс» Анатоль Дакучаеў. Першымі чытачамі новага выдання сталі акадэмік Ігнацій Антонаў, Героі Савецкага Саюза Іван Кустаў, Васіль Мічурын і Віктар Лівенцаў.

— Самае галоўнае, што кніга ўжо працуе, — гаворыць Уладзімір Саламаха, — яна пайшла ў школы. А на кніжнай выставе ў Санкт-Пецярбургу сакратарыят Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі адзначыў яе пісьмом-падзякай.

Азнаёміцца з новым выданнем, а таксама з выставай, можна ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па вул. Сурганава, 15. Выстава будзе працаваць да канца мая.

Ілья ЛАПАТО.

Парламент

ХТО ЎЗЫХОДЗІЦЬ НА ВЯРШЫНЮ

Інтэрв'ю «Звяздзе» Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ

— Уладзімір Паўлавіч, у чарговым штогадовым Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка зноў засяродзіў увагу парламентарыяў на праблеме якасці і эфектыўнасці заканадаўства. Ці значыць гэта, што яна па нейкіх прычынах абвастрылася? Як вы лічыце?

— Справа не ў абвастрэнні гэтага пытання, а ў тым, што рэалізацыя акрэсленых Прэзідэнтам прыярытэтаў патрабуе ад парламента і ўсіх удзельнікаў нарматворчасці шырэй паглядзець на заканадаўчую работу. Паглядзець шырэй менавіта праз прызму якасці, паколькі якасць вызначана асноўным арыенцірам як у эканоміцы, так і ў іншых сферах дзейнасці. Па вобразным выказванні Прэзідэнта, заканадаўства мусіць стаць адным са стаўпоў пераходу на новы якасны ўзровень вытворчасці тавараў і паслуг, на новы ўзровень кіравання і ў выніку — забяспечыць новую якасць жыцця ў нашай краіне. Так што перад дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў вялікі абсяг работы ў рэчышчы рэалізацыі ідэй Паслання. Сваю адказнасць мы разумеем. Разам з Саветам Рэспублікі, Саветам Міністраў, Адміністрацыяй Прэзідэнта і іншымі нашымі партнёрамі па заканатворчым працэсе будзем нарошчваць напрацаваны вопыт удасканалення прававога ландшафту. Задача ж ва ўсіх нас агульная — фарміраванне новага заканадаўства пад выкананне пастаўленых у Пасланні задач развіцця Беларусі.

— Вы звязваеце павышэнне якасці нарматыўнай прававой базы з умацаваннем заканатворчага партнёрства?

— У першую чаргу. Гэта краевугольны камень, на якім трымаецца ўся заканатворчая піраміда. Без яго трываласці ўсур'ёз разлічваць на павышэнне якасці і эфектыўнасці законаў немагчыма.

— Трываласці ў сэнсе ўзгодненых дзеянняў заканадаўчай і выканаўчай галін улады?

— Так, бо законы прымае парламент, а праектуюцца і дапрацоўваюцца яны агульнымі намаганнямі ўсіх зацікаўленых бакоў. Чым больш канструктывізму ў адносінах удзельнікаў заканатворчага працэсу, тым больш прадуктыўная заканадаўчая дзейнасць.

— На якім узроўні, на вашу думку, планка дзелавога супрацоўніцтва па стварэнні законаў знаходзіцца цяпер?

— Мы навучыліся супрацоўнічаць даволі нядрэнна, што паспрыяла прыняццю шэрагу асабліва важных для краіны і грамадства законаў. Нагадаю, сярод іх законы аб мясцовым кіраванні і самакіраванні, аб асновах дзяржаўнай моладзевай палітыкі, аб статусе ваеннаслужачых, Асаблівая частка Падатковага кодэкса, пакет законаў аб ратыфікацыі дагавораў па стварэнні Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі, змяненні і дапаўненні, унесеныя ў заканадаўства па пытаннях ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур, бюджэтных, зямельных адносінаў, рэгулявання навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, аховы навакольнага асяроддзя, працы, абароту лекавых сродкаў. Менавіта дзякуючы шчыльнаму заканатворчаму ўзаемадзеянню з суб'ектамі нарматворчасці забяспечана пераемнасць напрацовак нашых папярэднікаў у Палаце прадстаўнікоў ранейшых скліканняў і зроблены істотныя крокі наперад па ўмацаванні прававой базы дзяржаўнага будаўніцтва, нацыянальнай бяспекі, сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і міжнародных сувязяў.

Фота БЕЛТА.

У ходзе гэтай вясновай сесіі нацыянальнае заканадаўства папоўніцца новымі нарматыўнымі прававымі актамі, якія, у тым ліку, рэгулююць адносіны ў прамысловасці, аграрнай сферы, пытанні гаспадарчай дзейнасці, фінансаў, будаўніцтва, прыватызацыі, энергетыкі і іншыя. Крайне важна, каб яны былі максімальна адаптаванымі да новай эканамічнай сітуацыі ва ўмовах выхаду з сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу і працавалі на развіццё айчыннай эканомікі і павышэнне яе канкурэнтаздольнасці. Такую адаптацыю, зразумела, можна адбудаваць толькі салідарным патэнцыялам усіх зацікаўленых заканатворчых інстытутаў. Гэты патэнцыял даволі значны — як арганізацыйны, юрыдычны, так і інтэлектуальны. Я думаю, што яго выкарыстанне па каардынатах ідэй Паслання кіраўніка дзяржавы дазволіць зрабіць механізмы партнёрскага ўзаемадзеяння ў заканатворчым працэсе больш дзейснымі.

— А ў чым Палата прадстаўнікоў бачыць свой рэсурс уплыву на павышэнне якасці законаў?

— Ён праектуецца зноў-такі на тэхналагічныя сувязі ў заканатворчасці. Маю на ўвазе тры асноўныя напрамкі. Перш за ўсё — удзел дэпутатаў у абмеркаванні законапраектаў яшчэ да іх унясення ў парламент, так званае нулявое чытанне асабліва важных для грамадства або той ці іншай сферы ці галіны новых заканадаўчых ініцыятыў, якое праводзіцца ўсё больш актыўна. Гэтую практыку мы паглыбляем, прычым як на ўзроўні работы з міністэртвамі і ведамствамі, Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававых даследаванняў, так і Савета Міністраў. Другі накірунак, на якім мы канцэнтруем нашу ўвагу — этап экспертнага абмеркавання законапраектаў высокакваліфікаванымі спецыялістамі-практыкамі, навукоўцамі, юрыстамі нашага Сакратарыята, прафільнымі камісіямі Палаты прадстаўнікоў, у тым ліку на пашыраных і выязных пасяджэннях. І яшчэ адзін, трэці напрамак, — свайго роду выверка заканадаўчых рашэнняў, якія маюцца і ўжо дзейнічаюць у рэгіёнах, працоўных калектывах, у дыялогу з рознымі грамадскімі аб'яднаннямі. Тут, трэба сказаць, добрую справу служыць наш пастаянны семінар па вывучэнні практыкі прымянення заканадаўства і ўзаемадзеяння з мясцовымі органамі кіравання.

— Але ж гэта толькі фармат работы, і на заканадаўстве ён наўрад ці адлюстроўваецца напрамую.

— Я гэтага і не сцвярджаю. Соль — у змястоўным напаўненні, змястоўнай інтэнсіфікацыі гэтай работы па траекторыі параметраў Пасланняў Прэзідэнта народу і парламенту, а таксама ў дыверсіфікацыі яе формаў, чым мы і займаемся і будзем уважліва займацца на працягу ўсяго перыяду нашых дэпутацкіх паўнамоцтваў.

— Значыць, нягледзячы на тое, што заканадаўчы механізм правераны і адладжаны, парламентарыі працуюць не так дагматычна, як можа здавацца збоку?

— Патрэба ў творчым падыходзе і свежых ідэях ёсць, я ўпэўнены, у кожнай справе, а ў стварэнні законаў гэта абавязковая ўмова выніковасці. За карпатлівасцю заканатворчага працэсу, якую называюць руцінай, насычана складаная, інтэлектуальна напружаная і арганізацыйна разнастайная праца многіх людзей. Абмеркаванні, дыскусіі, кансультацыі, зноў абмеркаванні, удакладненні, нярэдка працяглыя ўзгадненні — і толькі пасля ўсяго гэтага законапраекты па рашэнні Савета нашай палаты трапляюць у Авальную залу. Што-што, а разумныя думкі і абгрунтаваныя ідэі ў парламенце запатрабаваны найперш.

— Думкі ж могуць быць хоць і разумнымі, аднак супрацьлеглымі і нават узаемавыключальнымі, а прапановы — ілюзорнымі...

— Не праблема, важна, каб яны бруілі, тады ёсць з чаго выбіраць, каб рухацца наперад у развіцці заканадаўства.

— Ну а калі інтарэсы галін улады альбо органаў дзяржаўнага кіравання, зацікаўленых у прыняцці законапраекта, перасякаюцца? Узнікае канфлікт?

— Канфлікт — тут не тое слова. Канфлікт інтарэсаў паміж галінамі ўлады ўзнікнуць не можа, паколькі мы дзяржаўныя людзі і сумесна працуем на інтарэсы дзяржавы і грамадства. Іншая справа — адрозненні ў бачанні шляхоў вырашэння тых ці іншых праблем. Гэта натуральна. Яны павінны быць. Хоць агульнага «адабрамса» няма, нярэдка мы дыскутуем, аднак гэтыя дыскусіі скіраваныя не на зацятае, безапеляцыйнае адстойванне свайго пункту гледжання, а на пошук супадаючых пазіцый, збалансаванага, прымальнага для ўсіх зацікаўленых бакоў рашэння. Зразумела, яно дасягаецца не без разумных кампрамісаў.

— Рэгіёны маюць магчымасць выказацца па законапраектах?

— Новыя заканадаўчыя ініцыятывы ў абавязковым парадку ўзгадняюцца з абласнымі, Мінскім гарадскім выканкамамі і Саветамі дэпутатаў па пытаннях іх кампетэнцыі. Акрамя гэтага, асабліва значныя для грамадства ці пэўнага сектара эканомікі і сацыяльнай сферы законапраекты абмяркоўваюцца ва ўстановах і арганізацыях, у тым ліку грамадскіх. Заўваг і прапаноў нярэдка выказваюцца сотні. Як, напрыклад, па праектах Кодэкса аб адукацыі і Закона «Аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва», якія атрымалі шырокі грамадскі рэзананс і цяпер дапрацоўваюцца да разгляду ў другім, завяршальным чытанні.

Працуючы ў сваіх выбарчых акругах, дэпутаты інфармуюць ідэалагічны і гаспадарчы актыў, а таксама працоўныя калектывы аб прынятых заканадаўчых рашэннях і праектах законаў, унесеных у Палату прадстаўнікоў, абмяркоўваюць пытанні прававога рэгулявання. Дэпутатам ахвотна даюць слова на сесіях мясцовых Саветаў дэпутатаў і пасяджэннях выканкамаў. Гэта дапамагае нам фарміраваць і ўдакладняць пазіцыі па асабліва адчувальнай эканамічнай і сацыяльнай тэматыцы права, больш грунтоўна ўзважваць мяркуемыя заканадаўчыя рашэнні. З другога боку, мы бачым праблемы вобласці, раёна ці горада буйным планам, набываем дакладнае ўяўленне пра тое, у чым рэгіёну трэба, як кажуць, паднацяснуць, прыбавіць, а ў чым неабходна падмога вышэйшых органаў кіравання, у тым ліку і на нарматыўна-прававым трэку.

— Пра што звычайна парламентарыі вядуць гаворку, сустракаючыся з простымі людзьмі?

— Пра іх жыццёвыя клопаты, пра тое, чым яны незадаволеныя і што іх радуе. Не абыходзім эканамічныя і сацыяльныя праблемы рэгіёнаў і тэрыторый. Пасля такіх шчырых размоў значна лягчэй разбірацца ў прэтэнзіях і папроках, калі яны выказваюцца ў адрас мясцовых кіраўнікоў. Аператыўна здымаюцца многія пытанні.

— Асабіста вам, Уладзімір Паўлавіч, рэгулярныя выезды ў рэгіёны даюць падставу для роздуму аб наспелых праблемах, у тым ліку прававога рэгулявання?

— Мяркую, што не толькі мне. Канкрэтныя пытанні парламентарыяў, на якія ў Авальнай зале адказваюць міністры і іншыя кіраўнікі высокага рангу, бяруцца не са столі. Гэта датычыцца і дэпутацкіх запытаў, якія накіроўваюцца ў міністэрствы і ведамствы. А рэкамендацыі дзяржаўным органам пасля праведзеных падчас трэцяй сесіі парламенцкіх слуханняў па ўдасканаленні дзейнай сістэмы паляпшэння жыллёвых умоў грамадзян? Гэта таксама плён не проста кабінетнага разважання, а глыбокага вывучэння дэпутатамі механізму фінансавання жыллёвага будаўніцтва ў краіне. Праца ў рэгіёнах і сваіх выбарчых акругах дапамагае нам рабіць прадуманыя, узважаныя высновы, як працуе заканадаўства і што неабходна абнавіць ці падправіць у прававой базе. Ролю рэгіянальнай пляцоўкі ў маніторынгу заканадаўства і правапрымянальнай практыкі, на мой погляд, цяжка пераацаніць. Работу з рэгіёнамі мы будзем развіваць і далей.

— Заканадаўства ўсё больш становіцца «папраўчым», бо прававыя нішы ў асноўным запоўнены. Прэзідэнт у сваім Пасланні параіў парламентарыям не гнацца за колькасцю прынятых законапраектаў, а забяспечваць сістэмнасць і комплекснасць заканадаўчага масіву. Што вы скажаце наконт гэтага?

— «Папраўчы» характар большасці законапраектаў, што прымаюцца, не азначае, што змяненні і дапаўненні, якія ўносяцца ў заканадаўства, хаатычныя, хоць гэта павышае складанасць сістэматызацыі як упарадкавання сукупнасці нарматыўных прававых актаў, стварэння ўзгодненага і несупярэчлівага заканадаўчага комплексу. Мы ўжо набылі пэўны вопыт расчысткі заканадаўчага поля ад састарэлых прадпісанняў, надання яму большай узгодненасці, аптымальна магчымай канкрэтызацыі законаў, памяншэння ў іх колькасці адсылачных нормаў, кадыфікацыі заканадаўства. Працягваецца работа па спрашчэнні адміністрацыйных працэдур, стварэнні найбольш спрыяльных умоў для разняволення прадпрымальніцкай ініцыятывы і па іншых пытаннях. Мяркую, што ў рэчышчы Паслання Прэзідэнта народу і парламенту вельмі важна разглядаць сістэматызацыю як механізм вырашэння няпростых праблем якасці прававой базы, паскаральнік руху да даступнасці і зразумеласці законаў кожнаму чалавеку. Менавіта таму я і падкрэсліваю, што забеспячэнне сістэмнасці і комплекснасці заканадаўства напрамую залежыць ад сістэмы ўзаемадзеяння ўсіх удзельнікаў заканатворчага працэсу.

— Вышыня новых задач па павышэнні якасці і эфектыўнасці заканадаўцяперашняму складу парламента пад сілу?

— На вяршыню можа ўзысці толькі той, хто ўпарта пераадольвае перашкоды і не палохаецца цяжкасцяў. Так і ў заканатворчасці. Калі дэпутаты расходуюць свой порах не на пустапарожнія спрэчкі і высвятленне асабістых адносінаў, не губляюць жывой сувязі з выбаршчыкамі, з эканамічнай, сацыяльнай і палітычнай рэальнасцю, то іх энергія траціцца не ўхаластую, а ўвасабляецца ў заканадаўчых рашэннях, якія прыносяць карысць грамадству і дзяржаве.

Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.

Помніце нас такімі:
мы вызналі ўсе дарогі
Камбрыгамі і радавымі
салдатамі Перамогі.
Помніце нашы словы:
што у жыцці больш трэба —
Толькі б світанкам вясновым
вайна не зацемрыла неба.
У гарадах і вёсках
помніце, землякі,
гэты Праспект Пераможцаў
і баявыя сцягі.

(Мінск, 9 Мая 2010 года. Праспект Пераможцаў.)

«ЦЯПЕР ІХ УЖО НІКОГА НЯМА Ў ЖЫВЫХ, АЛЕ МЫ, ДЗЕЦІ ГЕРОЯЎ, ІХ ПАМЯТАЕМ, І НАМ БЫ ХАЦЕЛАСЯ, КАБ ПРА ІХ ВЕДАЛІ І ВЫ: ТАКІЯ ЛЮДЗІ ВЫЙГРАЛІ ТУЮ ВАЙНУ»

Амаль на ўсіх афіцыйных мерапрыемствах, прысвечаных Перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне, які-небудзь выступоўца абавязкова скажа, што ветэранаў становіцца ўсе меней і меней. У прынцыпе, ён будзе мець рацыю, але давайце глядзець з іншага боку: ветэраны, удзельнікі вайны, працаўнікі тылу, былыя ваеннапалонныя і вязні канцлагераў, партызаны, падпольшчыкі... Беларусаў, якія перажылі тую страшную вайну і перамаглі ў ёй, яшчэ шмат. Гэта пацвярджае і нашая рэдакцыйная пошта: у «Звязду», як газету-падпольшчыцу і партызанку, прыходзіць шмат лістоў успамінаў пра ваеннае ліхалецце, пра подзвігі, пра зверствы фашыстаў, пра гора і роспач...

Максім ГАЦАК піша нам пра вёску Казулічы Кіраўскага раёна, якая была спаленая немцамі ў 1942 годзе: «Агулам у вёсцы было знішчана 318 чалавек, гэта ўдвая болей, чым у сусветна вядомай Хатыні. Але Казулічы застаюцца і сёння амаль невядомымі ў Беларусі, не кажучы ўжо пра ўвесь свет. Найбольш актыўных карнікаў пакаралі даўно, напрыклад, аднаго з удзельнікаў аперацыі Рольфа Бурхарда павесілі 30 студзеня 1946 года, а вось іх ахвяры так і не былі ўшанаваныя годным чынам: на месцы іх пахавання дагэтуль стаіць тыповы савецкі помнік, які абязлічвае пакутнікаў беларускай зямлі...». Максім Гацак піша, што нядаўна мясцовыя жыхары вырашылі ўзвесці новы, больш варты памяці землякоў мемарыял — капліцу і пліты з імёнамі спаленых. Зараз ідзе збор ахвяраванняў, і калі нехта хоча дапамагчы матэрыяльна, то можна звяртацца да старасты вёскі Казулічы Валянціны Міхайлаўны Кісель.

Наш сталы чытач **Уладзімір СОДАЛЬ** даслаў нам занатаваныя ўспаміны двух удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, з якімі ён пазнаёміўся ў бараўлянскім шпіталі ветэранаў вайны імя Пятра Машэрава. «Максім Кур'ян нарадзіўся ў Рудабелцы. Прайшоў усю вайну, быў паранены, ляжаў у шпіталі на Браншчыне. Яго трохі «падлаталі» і зноў адправілі на фронт. А тым часам яго сям'і прыйшло паведамленне, што Максім Кур'ян загінуў і пахаваны ў брацкай магіле... Але ён быў жывы, у 1945 годзе дайшоў да Вісы. Там атрымаў і весткі з радзімы: аказалася, што шмат каго з яго землякоў немцы расстралялі ў лесе, сярод іншых — і яго матулю і сястрычку. Як даведаўся пра гэта, падумаў: «Усё! Будзем бязлітасна ў Германіі помсціць за нашых родных і блізкіх!». Але як дайшло да справы, то рука не падымалася: у чым былі вінаватыя нямецкія жанчыны і дзеці?..» Напісаў Уладзімір Содаль і пра Кастуся Жывіна, які вайну перажыў зусім малым хлопчыкам: «Жылі мы ў лесе, недалёка ад вёскі Падкоссе на Пухаўшчыне. У маі 1944 года немцы ўсіх згрэблі, пазапіхвалі ў таварныя вагоны і павезлі ў Германію. Было шмат дзяцей, людзі думалі: чаго нас вязуць? А потым здагадаліся: у цягніку было шмат немцаў пасля шпіталёў, і, каб застрахаваць іх ад партызанскіх дыверсій, цягнік набілі і нашымі людзьмі... Гэтак мы «шчасліва» дабраліся да Лукенвальда, дзе сустрэлі 9 Мая. Там убачылі і першага савецкага воіна. Як жылося ў Лукенвальдзе — асобная гісторыя, але самае галоўнае, што нашае жыццё было асвечанае нашай Перамогай!»

Віталь НАВАК з вёскі Снядзін Петрыкаўскага раёна даслаў нам свае ўпаміны пра тое, як яны абяскшоджвалі нямецкія міны. Прынамсі, у сваім лісце ён піша пра дзень 1 студзеня 1945 года, калі жанчыны пайшлі збіраць вакол былых куранёў кінутыя вазы і сані. З імі пайшлі і два хлопцы — Міша і Віктар. Яны адышлі ад жанчын і пайшлі збіраць міны — у выніку Міхаіл падарваўся на адной з іх. «Яшчэ здалёк было чутно, як галосяць сёстры, — піша ў лісце Віталь Навак і расказвае далей, як яны выносілі цела Мішы з міннага поля. — Я добра ведаў, што метраў за сто ад канавы міны ўжо знятыя, таму, узяўшы палку, пайшоў туды сам, метраў за 30-40 злева ад мін. Потым, асцярожна абмацваючы палкаю перад сабою траву, падаўся ў бок мін. Час цягнуся марудна, з непрывычкі балела спіна. Я баяўся спатыкнуцца і рвануць дрот на сябе. Але доўга так ісці не прыйшлося — убачыў месца ад выбуху, а ў трох метрах ад яго — нябожчыка...». Далей Віталь Навак піша пра тое, як ён угаворваў брыгадзіра дапамагчы яму, але той вельмі баяўся мін і не хацеў ісці далей за канаву: «Ніколі не думаў, што мёртвыя людзі такія цяжкія. Я толькі змог Мішу прыпадняць, каб адцягнуць далей ад мін... Пасля зразумеў, што ў нас не было ні вяроўкі, ні саней, як жа прыцягнуць нябожчыка дадому? Высеклі бярозку, але замацаваць цела на яе вершаліне было немагчыма. Прыйшлося мне зноў ісці на міннае поле, на гэты раз, каб зняць дрот. Безумоўна, мяне не пускалі, але рызыкі я не адчуваў, бо здымаў дрот там, дзе мін ужо не было. Нарэшце, дротам звязалі дзве бярозкі, на іх вершалінах замацавалі нябожчыка і адправіліся дадому. Сёстры ні на хвілінку не заціхалі і галасілі, а я ўсё думаў: чаму так наканавана было здарыцца? Мішу ўжо два разы выклікалі ў райваенкамат для адпраўкі ў армію, але два разы адпраўлялі назад... Няўжо ж гэта тая мясціна, дзе яму на раду было напісана памерці і якую ніколі не абмінуць і не аб'ехаць?..».

Некаторыя чытачы заходзяць да нас у рэдакцыю і асабіста. Так, напрыклад, завіталіда нас у госці два сцярэчныя браты — **Анатоль і Яўген ДЗЯДЗІЧКІНЫ**. Іх бацькі — Фёдар Несцеравіч і Аляксандр Несцеравіч — разам з яшчэ шасцю братамі ваявалі супраць фашыстаў. Яны ж прынеслі ў рэдакцыю і ліст ад яшчэ аднаго свайго стрыечнага брата, Несцера Трафімавіча, які жыве цяпер у Санкт-Пецярбургу і займаецца зборам інфармацыі пра гісторыю сям'і Дзядзічкіных: «У майго дзядулі, Дзядзічкіна Несцера Яфімавіча, які жыў у вёсцы Прудок Хоцімскага раёна, да пачатку вайны было восем дарослых сыноў. З пачаткам вайны сем з іх трапілі на фронт. Самага старэйшага, Трафіма, майго бацьку, на фронт не ўзялі, бо ён ужо і па ўзросце не падыходзіў, і меў шэсць дзяцей. Аднак ён па даручэнні Хоцімскага раёна ў ліпені і жніўні 1941 года займаўся адпраўкай на ўсход дзяржаўнай і калгаснай маёмасці, а перад прыходам немцаў эвакуяваўся ў тыл у Варонежскую вобласць, дзе працаваў у калгасе для фронту». Расказвае Несцер Трафімавіч і пра лёсы іншых братоў свайго бацькі. Другі па старшынстве брат, Фёдар, быў кадравым ваенным і служыў у Чырвонай Арміі з 1925 года. Ён служыў у горадзе Шаўляй (сучасная Літва), у 1941 годзе патрапіў у палон, прайшоў шэсць канцэнтрацыйных лагераў, у тым ліку і ў Нарвегіі, адкуль быў у 1945-м рэпатрыяваны на Радзіму. Брат Іван прайшоў усю вайну з 1941 года па лістапад 1945-га, быў шафёрам у 5-ай Гвардзейскай мінамётнай дывізіі. Брат Мікалай таксама ваяваў да лістапада 1945 года, у тым ліку і ў складзе 66 арміі на Сталінградскім фронце, дзе быў паранены. Брат Ягор змагаўся на Волхаўскім фронце, але ў 1943 годзе быў цяжка паранены і да звальнення ў запас у 1946 годзе быў намеснікам камандзіра дарожна-каменданцкага ўчастка № 12 ваенна-аўтамабільнай дарогі. Брат Аляксандр у 1939 годзе ўдзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі, у пачатку Вялікай Айчыннай вайны патрапіў у акружэнне, вярнуўся на радзіму і да жніўня 1943 года быў сувязным у 2-й Клятнянскай партызанскай брыгадзе. Ну а потым ізноў пайшоў на фронт, у тым ліку ўдзельнічаў у баях і за Кёнігсберг. Брат Сямён быў прызваны Хоцімскім РВК Магілёўскай воласці і з фронту не вярнуўся — прапаў без вестак... Не вярнуўся з вайны і восьмы брат Ануфрый — 7 верасня 1943 года пры штурме вышыні пад вёскай Варашылаўка на Украіне яго танк быў падбіты, і ён разам з экіпажам згарэў у танку... «Як бачна з напісанага, у гісторыі адной сям'і адлюстраваныя ўсе бакі той страшнай вайны — і акружэнне, і палон, і смерць, і прапажа без звестак, а таксама гераізм на франтах і ў тыле. Цяпер іх ужо нікога няма ў жывых, але мы, дзеці герояў, іх памятаем, і нам бы хацелася, каб пра іх ведалі і вы: такія людзі выйгралі тую вайну». Анатоль і Яўген Дзядзічкіны расказалі, што яны, як і астатнія сыны герояў, стараліся стаць дастойнымі грамадзянамі той краіны, якую абаранялі іх бацькі. Таму нашчадкі Дзядзічкіных працавалі і працуюць і ва ўстановах адукацыі, і ў шахтах Данбаса, і ў народнай гаспадарцы Беларусі, і ў міліцыі, і ў органах дзяржбяспекі, і ў пагранічнай службе, і ў сельскай гаспадарцы, а Несцер Трафімавіч, радкі якога мы цытавалі вышэй, працаваў у Ленінградскім тэхналагічным інстытуце, кандыдат эканамічных навук.

...Напрыканцы варта адзначыць, што ў гэтай публікацыі мы працытавалі толькі некалькі лістоў ад вас, нашы чытачы. Але гэта не значыць, што мы пра кагосьці забыліся ці не хочам друкаваць. Усе вашы ўспаміны, лісты, апавяданні, дасланыя з усіх куткоў Беларусі, а таксама Расіі і іншых краін-суседзяў, ляжаць у нас вялізным-вялізным стосам, і мы па магчымасці будзем іх друкаваць. Няхай не адразу, няхай паступова, але ж пра вайну трэба пісаць заўсёды, а не толькі напярэдадні юбілею, праўда?

Дарагія нашы ветэраны, дарагія нашы ўдзельнікі вайны, працаўнікі тылу, дзеці вайны, вязні канцлагераў, партызаны, падпольшчыкі і ўсе, хто зведаў жахі ваеннага ліхалецця! Мы віншуем вас са святам і зычым перш за ўсё здароўя, яно вам цяпер патрэбна больш за ўсё іншае. Ну і вядома, пішыце нам, газета-партызанка і падпольшчыца «Звязда» заўсёды рада весткам ад вас!

Павел БЕРАСНЕЎ.

Дзень Перамогі ў Малькавічах

Угорадзе, як правіла, святкаванні на 9 мая праходзяць па ўжо адпрацаваным сцэнарыі: шэсце ветэранаў, ускладанне вянкоў, канцэрт... А што адбываецца ў гэты дзень у глыбінцы?

Вёска Малькавічы знаходзіцца ў Ганцавіцкім раёне, амаль на мяжы з Лунінеччынай. Вёска не самая «глухая» на Палессі, але да райцэнтра далекавата.

Напярэдадні даведаўся, што ў Малькавічах будуць свае святочныя мерапрыемствы, і раніцой 9 мая сеў на дызель Баранавічы — Гарынь.

Ветэранаў вайны ў Малькавічах усяго пяць чалавек, але да помніка-абеліска на брацкай магіле прыйшлі толькі двое — 90-гадовая Ганна Жукоўская і Антон Ермалінскі, астатнія ўжо нямоглыя.

Калона з вянкамі да помніка яшчэ не падышла, і быў час паразмаўляць з людзьмі. Пачаў з ветэранаў.

Ганна Трафімаўна аказалася чалавекам гаваркім, но таму, што 44 гады адпрацавала настаўніцай.

— А «Звязда» мяне павіншавала з 90-годдзем, — паведаміла Жукоўская, — прыемна было.

— Вайна ўспамінаецца?

— Я на фронце не была, партызаніла ў брыгадзе Гудкова на Віцебшчыне. Не страляла і нікога не забіла, а прыводзіла ў партызанскі атрад нашых салдатаў, палонных. Неяк ехала ў Мінск і ў Баранавічах рабіла перасадку, выйшла на перон, а каля кіёска да мяне кідаюцца дзяды: «Ганначка, а ты памятаеш нас? Гэта ты?» Пазналі, а затым кажуць: «А можа, ты адна? То ў нас ёсць тут чалавек». А я кажу: «У мяне вунь якая сям'я!»

— А сёння як жывецца?

— Добра. У мяне тры сыны: Віктар — доктар фізіка-матэматычных навук, выкладае ў БДУ, на Анатоля і Генадзя таксама не скарджуся. Маю сем унукаў і шэсць праўнукаў. І на нагах яшчэ, то чаго скардзіцца. І да пенсіі колькі тысяч падкінуць, жывём добра. Вось перад тым як ісці сюды, чарачку выпіла з сынам, праўда, адну кроплю...

Тут да размовы падключылася Тацяна Шымчык, у мінулым начальнік пошты.

— Вы абавязкова напішыце, што мы ніколі так добра не жылі, як цяпер. Трымай што хочаш — свінні, каровы... Вунь якое раздолле — касі дзе хочаш.

— Каб на Палессі і раздолля не было?! Але ў Малькавічах усяго 130 кароў, і гэта на 600 двароў з гакам?

— Ляпуюцца, рабіць не хочуць.

Крыху пазней старшыня

Погляд

«Хто мог падумаць, што дажывём да таго часу, калі пра герояў вайны будуць гаварыць са знявагай?..»

ТРЭБА ж так спланаваць падзеі, каб менавіта перад нашым светлым усенародным святам — 65-годдзем з Дня Перамогі, аж у дзевяці нумарах газеты «Народная воля», па чатыры калонкі ў кожным, надрукаваць матэрыял, які стане горкім «падарункам» тым, хто заяваў. Я пра матэрыял «Нябышына. Вайна», аўтарам якога з'яўляецца наш зямляк Ілля Копыл, былы афіцэр Савецкай Арміі. Такую ваяўнічую няпраўду, а дакладней, проста паклёп, сустрэў упершыню.

Нябышына — вёска нашага раёна, да вайны ў ёй было 120 двароў, праходзіла каля яе дзяржаўная мяжа. У гады Айчыннай вайны яе людзі бралі ўдзел у барацьбе з акупантамі.Тут дзейнічала падпольная арганізацыя, якую ўзначальваў Андрэй Фрол. 25 нябышынцаў прайшлі дарогамі вайны, 10 загінулі ў барацьбе з ворагам у партызанах, 25 — на франтах у Чырвонай Арміі, 47 чалавек мірнага насельніцтва было загублена ў час карных аперацый фашыстамі. Чамусьці гэта не знайшло адлюстравання ў матэрыялах аўтара. Я не думаю, што аўтар не ведае станаўлення партызанскага руху на Бягомлышчыне. Ведае, але піша пра іншае.

На тэрыторыі Бягомльскага раёна дзейнічаў падпольны райкам партыі, падпольныя арганізацыі на месцах. У першыя месяцы вайны сталі з'яўляцца групы партызан, якія затым аб'ядналіся ў партызанскія атрады, а потым — у брыгаду «Жалязняк». Выходзіла газета «Савецкі патрыёт». Падпольную работу ўзначаліў сакратар райкама, а потым камісар брыгады, Герой Савецкага Саюза С.С. Манковіч.

Да снежня 1942 года былі разгромленыя ўсе нямецкія гарнізоны, у канцы снежня — апошні з іх у Бягомлі. У раёне была ўсталявана савецкая ўлада ў тыле ворага. Вясной 1943 года бягомльскі аэрадром стаў прымаць самалёты і планеры з-за фронту. Паступала зброя, боепрыпасы, медыкаменты і іншыя грузы, а назад вывозіліся некаторыя цяжкапараненыя партызаны. Узбраенне давала магчымасць папаўняць склад партызанскай брыгады. Грузы самалётамі паступалі і для іншых партызанскіх атрадаў і брыгад Мінскай і Вілейскай абласцей. Пра дзейнасць партызанскай брыгады «Жалязняк» аўтар не расказвае. Між тым акупанты не маглі карыстацца дарогамі, што ішлі праз Бягомль на Мінск і Віцебск. Давялося вытрымаць некалькі карных аперацый фашыстаў па знішчэнні партызан з удзелам франтавых і эсэсаўскіх часцей з танкамі і самалётамі, партызаны прарывалі акружэнне і выходзілі ў нямецкі тыл. Не далі партызаны магчымасці скарыстаць раку Бяроза ў якасці агнявога рубяжа. А ён быў бы выгадны для немцаў. Левы бераг, адкуль чакалі прыходу Чырвонай Арміі, балоцісты, а правы — сухі і высокі. Колькі было б ахвяраў! Наша брыгада падрыхтавала пераправу для наступаючых часцей Чырвонай Арміі і ўтрымлівала яе да наступлення. А ў час пераправы дапамагала аднаўляць яе пры бамбёжках праціўніка.

Пры наступленні ў час вызвалення раёна ад акупантаў праз гэту пераправу ішлі савецкія танкі. Пра гэта ні слова. Пра дзейнасць брыгады выйшла кніга Героя Савецкага Саюза І.П. Ціткова «Брыгада Жалязняк». Кінааператары, якія прыляцелі з фронту, выпусцілі фільм «Бягомльская легенда». Ён ёсць у раённым музеі, пра многае расказвае раённая кніга «Памяць».

У гады Вялікай Айчыннай вайны, хоць аўтар супраць такой назвы, Бягомльшчына была зонай партызанскай славы. Гарадскі пасёлак Бягомль, тады раённы цэнтр, у жніўні 2009 года Указам Прэзідэнта быў узнагароджаны вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гадоў». Гэта не простыя словы. За імі — смерць людзей, абяздоленыя сіроцкія сем'і, знявечаныя людзі...

Пра гэта ні слова ў аўтара «Нябышына. Вайна». Што толькі ён ні пісаў пра партызан і якімі словамі ні называў, як іх толькі ні чарніў. Дзіву даешся. Як нашым партызанам і сем'ям загінулых гэта чытаць і слухаць? Затое знайшлося месца на старонках газеты «Народная воля». Аўтар піша, што ў злачынствах супраць насельніцтва ў час акупацыі партызаны адыгралі не апошнюю, а можа галоўную ролю. Да чаго дадумацца: каб знішчыць вёску з людзьмі, яны пры прыбліжэнні немцаў рабілі некалькі стрэлаў у паветра, а потым уцякалі ў бок вёскі. Скажыце, які камандзір мог даць такі загад? А ці толькі гэта напісана!

А пра Чырвоную Армію, чырвонаармейцаў, якія ішлі на смерць, на подзвігі дзеля будучыні? Вось некаторае з напісанага. Што не было мабілізацыі на вайну, у арміі апынуліся толькі тыя, хто па нейкіх справах быў у Бягомлі: іх там «пахапалі» і павезлі ў Барысаў. Што неабучаных і няпоўнагадовых узялі на фронт і кідалі ў бой. Пра запасныя палкі ніводнага слова. Дадумацца да таго, што яго землякоў у арміі нават не пераапранулі ў ваенную форму, не кожнаму выдалі зброю. З іх сфарміравалі батальён і правялі разведку боем. Што камандаванне ператварыла нашых землякоў у гарматнае мяса. Што дзень Перамогі ён піша наўмысна з малой літры. Або такое, што звесткі пра Перамогу, пра канец вайны землякі сустрэлі без бачнага трыумфу. Ён не бачыў, каб людзі кідаліся да вызваліцеляў у абдымкі.

Адступленне Чырвонай Арміі называе ўцёкамі. Ні слова пра абарончыя баі Брэсцкай крэпасці, пад Магілёвам, пад Масквой і ў іншых месцах, ахайвае подзвіг Матросава. Што ніякага вызвалення Мінска не было, што немцы пакінулі яго. Што з ліпеня наляцела савецкая авіяцыя і ўшчэнт разбамбіла яго. Што ўсенародны ўздым, масавы патрыятызм — проста міфы... А чаго толькі ні напісана пра тых, хто служыў у органах Народнага камісарыята ўнутраных спраў.

А што пішацца ў газеце пра камандаванне брыгады «Жалязняк» Героя Савецкага Саюза І.П. Ціткова і С.С. Манковіча — маўляў, яны тэрарызавалі насельніцтва. Што ў час блакады маці-адзіночка паведаліся сваю маленькую дачку, а ў другой групе дзве жанчыны задушылі сваіх дзетак. Ці гэта праўда?

А як піша пра свайго брата, які быў вучнем ФЗН у Ленінградзе і памёр у блакаду ад голаду, таму што не мог есці чалавечае мяса і мяса мышэй. Быў не раз у гэтым горадзе, ніхто пра людаедства не ўспамінаў. Што СССР граміў беларусаў больш адчувальна, чым Германія.

Затое якая пахвала немцам-акупантам! У першую чаргу гаўляйтару Беларусі ў час акупацыі Кубэ, нямецкай уладзе ў Мінску. Ён немцаў паказвае ледзь не анёламі. Што яны далі людзям зямлю. Добра ставіліся да савецкіх палонных, якіх гналі ў Докшыцы. А ці так было? Іх замучылі там голадам і холадам. Што калі ў бацькі ўкралі каня, дык немцы знайшлі каня і вярнулі. Бацька аўтара з цеплынёй гаварыў пра нямецкага афіцэра, які не прызначыў яго старастам.

Землякі пры немцах убралі ўраджай. Бульбу, лён і грэчку забралі немцы. Здавалі ім па кабану у год і хапала сабе мяса на кожны дзень. Пры немцах жылі лепш, пакуль не з'явіліся партызаны. Лагодна абышліся ў другую блакаду з насельніцтвам...

Што гады акупацыі ў параўнанні з тым, што было пасля вызвалення, былі раем. Што з рук немцаў можна было атрымаць незалежнасць.

Што немцы ніколі не штурхалі, не прыгняталі, не крычалі, як паказваюць у кіно. Добра было ў Германіі яго дзядзьку і яго дзецям, якія былі вывезеныя туды...

Як у казцы: якія добрыя акупанты! А колькі нашых людзей былі расстраляныя, павешаныя, спаленыя жывымі, як у Вольберавічах, і іншыя зверствы акупантаў. Колькі на Бягомльшчыне помнікаў, абеліскаў і іншых знакаў, якія як бы гавораць «Помніце, людзі».

Не забыў аўтар пахваліць тыя арганізацыі, якія былі пры акупантах. СБМ (Саюз Беларускай Моладзі), БСА (Беларускі Саюз Аховы), што сапраўднымі партызанамі былі акаўцы (Арміі Краёва).

Такое вось «віншаванне» напярэдадні свята. Хто мог падумаць, што мы дажывём да гэтага, што на Бягомльшчыне з'явіцца такі знаўца ўсіх падзей, аўтар «Нябышына. Вайна». Як у яго з сумленнем?

І.М. ПЯРЭДНЯ,
старшыня Докшыцкага раённага Савета ветэранаў.

Погляд з Масквы

Дзяржаўны падыход або дзяляцкі прагматызм?

ПА праўдзе кажучы, як і многія расіяне, я быў у збянтэжанасці, калі даведаўся, што Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка запрасіў у краіну звергнутага кіргізскага лідара К. Бакіева. Не вельмі прыслухоўваюся да нашых расійскіх сродкаў масавай інфармацыі, асабліва тэлебачання, якое часта скажае па ўказцы палітычных вярхоў рэальную сітуацыю. Куды больш давяраю думцы рускіх, якія пражываюць у Кіргізіі, — у мяне там ёсць добрыя сябры, а яны сцвярджаюць, што пры Бакіеве ў рэспубліцы дапускалася нямала беззаконня і беспарадкаў, якія ён сам асуджаў, калі ўдзельнічаў у адхіленні ад улады свайго папярэдніка А. Акаева. Ды і самі паводзіны Бакіева, які не здолеў пры ўсіх вялікіх магчымасцях прэзідэнцкага паста ўтрымаць сітуацыю і даволі хутка адрокся ад улады, калі яна выйшла з-пад кантролю, сімпатый не выклікаюць. Аднак паразважаўшы над сітуацыяй, што стварылася, прыйшоў да цвёрдай высновы: ваш прэзідэнт заняў адзіна правільную пазіцыю. Што зробіш — у палітыцы часта даводзіцца выбіраць меншае зло, каб пазбегнуць большага.

Расійскія СМІ, асабліва тэлебачанне, якое жорстка кантралюецца Крамлём, вядома ж, не прамінулі скарыстацца прынятым А. Лукашэнкам рашэннем, каб у чарговы раз кінуць камень у агарод і без таго не вельмі «любімага» імі беларускага кіраўніка. Каго, маўляў, узяў пад сваё крыло, правільна, маўляў, кажуць, «скажы хто твой сябар, і я скажу, хто ты». Лукашэнка ж абараняе не Бакіева, не яго дзеянні і палітыку, аб чым адкрыта і прама заяўляў, а элементарныя прававыя асновы існавання любой дзяржавы. Занятая ім пазіцыя адпавядае інтарэсам нашай Расіі не менш, а, хутчэй, нават больш, чым Беларусі, і вельмі шкада, што расійскія кіраўнікі гэтага не разумеюць, дакладней не хочуць зразумець.

Насамрэч, у нас у Расіі ў адрозненне ад Беларусі аб сапраўднай сацыяльнай стабільнасці прыходзіцца толькі марыць. Пагроза «аранжавай рэвалюцыі», гэта значыць звяржэння законна выбранай улады вулічна-бунтарскім шляхам, як гэта адбывалася ва Украіне, у Грузіі, ды і той жа Кіргізіі, зусім не з галіны гіпатэтычных меркаванняў. Калі хтосьці не ведае, нагадаю. У Расіі ўжо былі сур'ёзныя сацыяльныя хваляванні з перакрыццем федэральных чыгуначных і аўтамабільных трас, не раз здараліся сутыкненні насельніцтва з міліцыяй, улады вымушаныя былі нават пайсці на замену ненадзейных падраздзяленняў міліцыі — гэта адбылося ва Уладзівастоку — «надзейнымі» атрадамі АМАП, перакінутымі з цэнтральных раёнаў, каб не дапусціць масавых выступленняў пратэсту. Невыпадкова ж расійскія кіраўнікі надаюць усё большую ўвагу сацыяльным пытанням. На пагашэнне рэальных і патэнцыйных ачагоў напружанасці ідуць значныя сродкі з рэзервовых фондаў, назапашаных за кошт «узляцелых» у апошнія гады цэнаў на расійскую сыравіну, перш за ўсё нафту. Моладзевае крыло кіруючай партыі «Адзіная Расія» — так званы рух «Нашы» — распрацавала нават цэлую праграму супрацьдзеяння вулічным хваляванням і беспарадкам, калі яны выльюцца ў спробы «аранжавай рэвалюцыі». «Не дазволім!», «Не дапусцім!» — сцвярджаюць на сваіх з'ездах, канферэнцыях і летніх зборах моладзевыя лідары, ведаючы, які прыемны бальзам льюць на душы сваіх высокіх заступнікаў у Крамлі. Ну а гэтыя заступнікі з рэкордная хуткасцю даюць сваё адкрытае «адабраем» чарговай «аранжавай рэвалюцыі» ў Кіргізіі, якую і рэвалюцыяй можна назваць нават з вялікай націжкай. Такога выбуху дзікай, нястрымнай стыхіі з пагромамі, падпаламі, грабяжамі і масавым марадзёрствам, якое доўга не маглі спыніць так званыя «апазіцыянеры», якія заявілі аб прыходзе да ўлады, не было яшчэ на тэрыторыі ні адной з былых савецкіх рэспублік. Хіба гэта не фактычнае заахвочванне новых падобных рэвалюцый у іншых постсавецкіх краінах, ды і нашай жа Расіі? Сапраўды, правая рука не ведае, што робіць левая. А беларускага прэзідэнта, які спрабуе звярнуць увагу на недапушчальнасць, разбуральнасць для любой дзяржавы такіх бандыцка-варварскіх дзеянняў, абвінавачваюць у тым, што ён, даючы прытулак Бакіеву, перашкаджае «нармалізацыі» сітуацыі ў Кіргізіі... «Нармальным» аб'яўляюць тое, што ненармальна, што парушае элементарную законнасць і правапарадак, пра прыхільнасць якім на нашым расійскім палітычным Алімпе любяць пагаварыць, бадай, больш за ўсё...

Кур'ёзнасць сітуацыі яшчэ і ў тым, што ў беларускага прэзідэнта ў адрозненне ад расійскіх кіраўнікоў з Бакіевым не было пастаянных кантактаў, ён практычна не кантактаваў з ім, бы і ўвогуле дрэнна яго ведаў. Расія ж, як вядома, менш як год таму актыўна падтрымала кіргізскага кіраўніка, калі ён выйграў прэзідэнцкія выбары, атрымаўшы больш як 60 працэнтаў галасоў, выдзеліла Кіргізіі буйныя крэдыты, аказала і іншую дапамогу. Пры гэтым шмат гаварылася пра «брацкую дружбу», усяляк падкрэслівалася непахіснасць і трываласць саюзніцкіх адносінаў, якія ўсталяваліся. Але як толькі ў Бакіева ўзніклі сур'ёзныя непрыемнасці, расійскія кіраўнікі адразу ж адвярнуліся ад яго. Тут жа прызналі як фактычную ўладу апазіцыйных дзеячаў, якія па суцнасці выпадкова апынуліся ля руля і якіх ніхто, у адрозненне ад Бакіева, не выбіраў і якія самі кажуць, што зусім не яны накіроўвалі ў рэчышча звяржэння законнага прэзідэнта вулічную стыхію, што разбушавалася. Дайшло да таго, што выдалі самазваным уладам кіргізскага міністра ўнутраных спраў, які ўцёк у Маскву і які быў прызначаны на сваю пасаду законным парадкам. Няўжо не разумеюць, што стварающь сваімі дзеяннямі вельмі небяспечны прэцэдэнт? Як пасля гэтага будуць ставіцца да Расіі яе і без таго нешматлікія сябры і саюзнікі? Ці будуць яны ўсур'ез успрымаць заявы яе кіраўнікоў аб вернасці сваім саюзніцкім абавязацельствам і імкнуцца да збліжэння з ёю? І хіба гэта не падрывае ўсю сістэму саюзніцкіх адносінаў, якія склаліся ў рамках СНД, АДКБ, іншых арганізацый, якія аб'ядноўваюць былыя савецкія рэспублікі? Бо падзеі ж у Кіргізіі так у іх і не абмяркоўваліся, не было зроблена ніякіх спробаў выпрацаваць сумесную пазіцыю, аказаць на шматбаковай аснове неабходную дапамогу кіргізскаму народу, які апынуўся ў крызіснай сітуацыі. Замест гэтага расійскія кіраўнікі палічылі за лепшае прывычна дамаўляцца з... Вашынгтонам, падключыўшы для бачнасці ў страшнай спешцы да гэтай змовы — іншага слова няма — Казахстан. На якія ж адносіны пасля гэтага да сябе яны могуць разлічваць з боку сваіх саюзнікаў у вышэйназваных арганізацыях? Тым больш, што падобнае грэбаванне іх думкай дэманструюць ужо не першы раз.

Падзеі ў Кіргізіі ў чарговы раз паказалі слабасць і некампетэнтнасць расійскай знешняй палітыкі. Нашы кіраўнікі не ведаюць рэальнасць сітуацыі ў краінах, з якімі звязаныя саюзніцкімі абавязацельствамі, пра элементарнае яе прадбачанне і гаварыць не даводзіцца. Не здольныя яны і колькі-небудзь правільна выкарыстоўваць свае патэнцыйна вельмі эфектыўныя рычагі ўплыву нават там, дзе пазіцыі Расіі заўсёды былі традыцыйна моцнымі. Але гэта асобная тэма. Больш небяспечна іншае, на што і звярнуў увагу беларускі прэзідэнт. Хвалёны «прагматызм» сённяшняга крамлёўскага кіраўніцтва абарочваецца на паверку злачыннай палітычнай блізарукасцю, расплачвацца за якую давядзецца не толькі нашай Расіі, але і яе партнёрам па міждзяржаўных арганізацыях. І здзіўляцца яго, кіраўніцтва, мякка кажучы, несяброўскаму стаўленню да лідара Беларусі, свайго, адзінага, бадай, надзейнага саюзніка, не варта. Праўда ж вочы коле.

В. ДАБРОЎ-ЮДЗІН.

Інфарм-укол

СТАНДАРТНЫЯ МЕДАБСЛЕДАВАННІ ДЛЯ МУЖЧЫН

У кожным канкрэтным выпадку спіс абследаванняў вызначае лечачы ўрач, які бярэ пад увагу ўзрост, індывідуальныя асаблівасці, хранічныя захворванні і спадчынную схільнасць пацыента. Наступны — стандартны — пералік нагадвае, як добра самому сачыць за станам уласнага здароўя з дапамогай рэгулярных медабследаванняў. Апошнія дазваляюць выявіць захворванні, якія працякаюць бессімптомна, а таксама абмеркаваць з урачом сваю дыету, фізічную нагрузку і г.д.

Праверка артэрыяльнага ціску. Мераць ціск пажадана мінімум раз на год. Пры наяўнасці паказчыкаў вышэй за 120/80 мм рт. сл. варта звярнуцца да ўрача. У выпадку пагрозы развіцця гіпертаніі ўрач парэкамендуе рэгулярныя медагляды і хатні маніторынг ціску.

Праверка ўзроўню халестэрыну. Пасля 20 гадоў рэкамендуецца кожныя 5 гадоў правяраць узровень ліпапратэінаў («карыснага» і «шкоднага» халестэрыну, трыгліцэрыдаў) у крыві. Пры наяўнасці рызыкі развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў урач можа парэкамендаваць больш частыя праверкі.

Аналіз крыві на цукар. Асобам пасля 45 гадоў з павышанай рызыкай развіцця дыябету 2-га тыпу рэкамендуецца правяраць узровень цукру ў крыві 1 раз на 1-2 гады. Фактары рызыкі — лішняя вага, маларухомы лад жыцця, спадчынная схільнасць. Пры павышаным артэрыяльным ціску або ўзроўню халестэрыну крыві варта абавязкова здаваць аналіз крыві на цукар, паколькі дыябет значна павышае рызыку інфаркту. Асобам з групы рызыкі пачынаць праверкі трэба пасля 45 гадоў.

Спецыяльныя даследаванні. Рэкамендуюцца пры наяўнасці схільнасці да анказахворванняў (напрыклад, пры дрэннай спадчыннасці, запаленчых хваробах кішэчніка, паліпах, злаякасных пухлінах пэўнага тыпу, лячэнні прамянёвай тэрапіяй).

Абследаванне на наяўнасць раку прастаты. Шэраг спецыялістаў рэкамендуюць усім здаровым мужчынам ва ўзросце пасля 50 гадоў штогод здаваць аналіз на прастатспецыфічны антыген і праходзіць пальцавае рэктальнае абследаванне.

Абследаванне на наяўнасць раку кішэчніка. Ва ўрачоў няма адзінага меркавання адносна яго частаты. Гэта пытанне варта вырашыць з лечачым урачом.

Аналіз крыві на ВІЧ-інфекцыю. Раз на год рэкамендуецца здаваць пры наяўнасці гомасэксуальных кантактаў, у выпадку ўнутрывеннага прыёму наркотыкаў, усім астатнім — падчас рэгулярнага медагляду.

Стаматалагічныя праверкі. Рэгулярныя візіты да стаматолага дазваляюць захаваць здароўе не толькі зубоў, але і ўсяго арганізма. Як правіла, рэкамендуюцца 2 прафілактычныя візіты на год.

Праверка зроку. Ва ўзросце 40 гадоў варта прайсці комплекснае абследаванне вачэй. Потым зрок трэба правяраць 1 раз на 1-4 гады. Пры наяўнасці захворванняў, якія ўплываюць на зрок — дыябет, хранічныя хваробы вачэй і інш. — абследаванне лепш праходзіць часцей.

Агляд скуры. Не варта забываць пра самастойныя праверкі стану скуры. Пры гэтым трэба звяртаць увагу на пачырваненні, якія доўга не праходзяць і змяшчаюцца на адкрытых участках скуры. Да ўрача неабходна звяртацца пры наяўнасці любых змен памеру, колеру і формы радзімак, а таксама пры з'яўленні новых.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ТРЫ САМАРОБНЫЯ ВЫБУХОВЫЯ ПРЫЛАДЫ

асколачнага дзеяння прадаў 32-гадовы жыхар Мазыра. Праўда, ён не ведаў, што пакупнікамі сталі супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй УУС Гомельскага аблвыканкама. Як паведамілі ў прэс-службе арганізацыі, дома ў непрацуючага грамадзяніна канфіскавана шкляная бутэлька са слядамі рэчыва серабрыстага колеру, прадметы, якія нагадваюць выбуховы пакет і самаробную выбуховую прыладу. Усё пералічанае накіравана на экспертызу.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
21 мая 2010 г.

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

		Лот
1	Адрес земельного участка	Ждановичский с/с, д. Тарасово, ул. Ключевая
2	Кадастровый номер	623681709601001885
3	Площадь земельного участка	0,1604 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 668 893
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	44 000 000
7	Задаток (рублей)	4 100 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 21.05.2010 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов 17.04.2010 г. в 17.00. Контактные телефоны: (8 025) 92 761 92, 204 11 62, 204 35 25.

Задаток за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет Ждановичского сельисполкома № 3600621030059 ГУ МФ РБ по Минской области (УНК 103), ф-л № 614 АСБ «Беларусбанк», код 520, УНП 600537220, назначение платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении ему земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 процентов, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта).

3.1 Представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.



НА ЛАЎЦА...

Гэтую гісторыю мне распавёў наш вясковец, былы партызан Міхаіл Рыгоравіч Марчанка.

...У 1942-м (казаў ён) немцы цярпелі паразы адну за другой, бо многія цягнікі, якія дастаўлялі ім усё, што трэба для вядзення баёў, сталі ляцець пад адхоны — дзейнічалі народныя мсціўцы.

Вось і ў той раз ім, партызанам, стала вядома, што паліцаі гойсаюць па хатах (чамусьці пад пільным наглядам немцаў), гвалтам, спешна адбіраюць у людзей жывёлу, цёплую вопратку, абутак.

Камандаванне атрада вырашыла даведацца, што за гэтым стаіць, і надзеі, як і заўжды, усклала на разведку: ёй трэба было захапіць «языка» — пажадана ціха, без стрэлаў. А вось як гэта зрабіць?..

— Мы ведалі, — расказваў мне Міхаіл Рыгоравіч, — што немцы ў вёсках ганяліся за курамі, адбіралі, збіралі яйкі. Да іх яны дужа ласыя... Вось гэтую слабіну і вырашылі скарыстаць — узяць на прынаду ім атраднага пеўня.

Аднак узяць бы ўзялі, ды хто ж аддасць?! «Наш гадзіннік? На згубу... Ды каму, — ворагу? — узбунтавалася кухарка Фрося. — Вы што? Ды самі падумайце: хто ж нам час падкажваць будзе? Асабліва ноччу...

Давялося ісці да камандзіра. І ўжо той неяк угаварыў жанчыну пазычыць певуна — для выканання асабліва важнага, баявога задання...

Уначы разведчыкі прабраліся ў вёску, заселі побач з пустой хатай. Дзень прасядзелі — руху ніякага. Але ж пад вечар бачаць — ідуць два немцы. Яны тут жа пеўня на плот... Той ад страху: «Ку-ка-рэ-ку!...» І крыламі — лоп-лоп-лоп.

Немцы з рогатам да яго — лавіць. Жывое ж мяса...

А тут нашы, пісталеты ім пад нос і «Хэндэ хох! Паразіты!.. Кураеды!..»

Карацей, узялі «языкоў», як кажуць цяпер, без шуму і пылу. Пецьку на кухню вярнулі — жывым і непашкоджаным.

А кіраўніцтва атрада ад тых «языкоў» даведалася, што немцы паліцаям больш не даверяюць, таму і кантралююць кожны іх крок.

Заставалася дзейнічаць далей — каб яны і самі сабе верыць перасталі.

Сямён Руднікаў,
в. Агародня, Добрушскі раён.

НЕ ПРАЙШЛО І ПАЎГОДА...

Так, мусіць, заўсёды бывае — калі разам з чалавекам працуеш, міжволі назіраеш яго жыццё. Прычым — у развіцці.

...Гады тры назад у нашу брыгаду прыйшоў малады хлапец. Біяграфія, як у многіх: нарадзіўся ў вёсцы, скончыў школу, адслужыў у арміі, прыехаў у горад.

Далей зноў нічога арыгінальнага — завод, ложак-месца ў інтэрнаце.

Праўда, у ім ён не затрымаўся, бо нашаму Косцю, як сам казаў, «дзіка» пашанцавала: панёс у хімчыстку касцюм і пазнаёміўся там з прыёмшчыцай. Спадабалася, што яна не «агаліўшыся», як другія, а ўсё роўна прыгожая, што не п'е, не курыць, што можна пагаварыць...

Немалаважна, мусіць, і тое было, што дзяўчына — мінчанка, што ў яе бацькоў (Косця потым сказаў) трохпакаёвая кватэра, машына, дача...

Карацей: мы разумелі, што ад гэткага знаёмства да вяселля — рукою падаць, і месяцаў праз колькі нават згулялі. Адно — у яго бацькоў: хлопцы ездзілі, другое — у Мінску, у рэстаране.

Адзначылі гэтую падзею і ў інтэрнаце — «прапілі» хлапца, з'ехаў. І ледзь не праз тыдзень усім заявіў, што цяпер ён проста не пацерпіць аніякіх дурных анекдотаў пра цешчу, бо яна для чалавека — другая мама. А ягоная вось — дык нават лепшая за першую, за родную!

— Ты з чаго гэта ўзяў?! — здзівіўся нехта з нашых.

— А дома, — прызнаўся новаспечаны зяць, — хоць пяць разоў на ноч уставай, мама рэдка калі пачуе ды папытаецца, што зрабілася, чаму я не сплю? А вось цешча — дык гэта заўсёды. Толькі падхаплюся — калі пакуруць захочацца, калі вады папіць альбо наадварот, толькі скірую ў бок кухні, — яна за мной: «Што здарылася, Косця? Можа, баліць што? Можа, таблетачку даць?». Во які, значыцца, чалавек! Святы...

Што ж — яно і такія людзі бываюць, пагадзіліся мы, але ж нехта такі зазначыў, што хоць жонку, хоць цешчу на трэцім тыдні сумеснага жыцця хваліць яшчэ рана, а вось на трэцім годзе...

— Я і тады буду! — цвёрда заявіў зяць.

Аднак выйшла ўсё не так. Не прайшло і паўгода, як ён з'явіўся на працу нейкі кіслы, злы, як сто сабак. Пытаюся сам-насам, з чаго гэта, што зрабілася?

— Помніш, — ён пачынае, — я казаў, што цешча ноччу за мной устае?

— Ну чаму ж не помніць? Помню.

— Дык я цяпер ведаю, чаго... Учора з палучкі мы ж разам па дзве «пластмаскі» «Аліварыі» бралі? Ну дык я адну адразу ў халадзільнік паставіў, другую за вячэрай выпілі. Селядзец якраз быў. Саланаваты — ноччу стала смага душыць. Прачнуўся і ў кухню. Думаю: ну чаго той бутэльцы да заўтра стаяць? Я ж яе зараз... Толькі халадзільнік адчыняць, цешча тут як тут: а ты чаго туды?! Мы ж павячэралі... Ды піва, кажу. А яна мне (ведаеш — як г... па зубах): «Піва — на сёння до!.. А калі смажыць, можаш вады з-пад крана папіць...»

І спіной халадзільнік закрыла.

...Пакуль піў воду, Косця, напэўна ж, думаў, што родная мама так бы не зрабіла. Але закончыць гэту гісторыю я хачу тым, што ўчора на працы адзін з нашых мужыкоў анекдот расказаў. Ідзе, значыць па вуліцы пахавальная працэсія — ціхая-ціхая: ні табе музыкі, ні плачу... Нейкі сустрэчны ў крайняга мужыка пытаецца: «А каго хаваюць?» — «Ды цешчу маю». — «А чаму так ціха?» — «Ды баюся, каб не прачнулася».

Косця смяяўся разам з намі. Хоць ад вяселля трох гадоў яшчэ не прайшло.

А. Ш., *г. Мінск.*

ХАЦЕЎ — ДАБРА...

Гэта зусім нядаўна было: майскай сонечнай раніцай заходзіў я ў паліклініку — аналізы здаць. Іх — тры, кабінетаў — столькі ж. На розных паверхах. З якога пачаць?

— Спачатку, — заўважыўшы разгубленасць, параіў мне нейкі дзядок, — трэба «прыляпіцца» да абедзвюх чэргаў на здачу крыві: з вены — у 54-м кабінеціку, з пальца — у 58-м...

Народу — паглядзеў — і там, і там — о-го-го: як пры развітым сацыялізме за мойвай ці ліверкай... А вось на здачу астатняга — люба паглядзець: заторыў няма, усё, што трэба, людзі з дому нясуць...

Што ж, раблю ўсё так, як дзед падказаў. Пытаюся, хто апошні, стаю крыху для прыліку ў адной чарзе, каб мяне запомнілі, каб самому потым не зблытацца, потым — у другой, кірую да дзвярэй з надпісам «Лабараторыя».

Дзед, бачу, чэша за мной. І чэрці з вока ў вока ў яго так і гойсаюць, так і гойсаюць. Мусіць, подмазку з'еў? Ці анекдот хто з ночы расказаў, а да яго, як да жырафа, толькі цяпер дайшло?..

Я так думаю, а дзед пытае цішком:

— Слухай, чалавеча, у цябе, выпадкам, слоічкаў пустых не знойдзецца?

— Не, — кажу. — А што ў вас зрабілася? Не іначай, аналізы на асфальт упусцілі, і яны разбіліся?

— Упусціў, браток, упусціў! — рагоча стары. — І напэўна ж, ужо разбіліся!.. Я іх гэта... Зранку абедзве баначкі запоўніў, газетай абгарнуў, а паверх — анучкай яшчэ... Бо ці мала што — з людзьмі ж у аўтобусе еду. А потым выйшаў, асцярожненька іду сабе... І тут, каля самай паліклінікі, нейкі чорт з-за спіны на коўры... Наляцеў, торбу з рукі вырваў — і ходу...

— Дык вам жа, мусіць, не да смеху цяпер? — дзіўлюся я. — У міліцыю хоць звярнуліся?

— Не... Бо што я там буду казаць? Што ў мяне г... трошкі скралі? У торбе ж нічога апроч не было...

Цяпер ужо смяяўся і я. А потым думаў: як добра было б, каб кожны, хто квапіцца на чужое добро, хоць раз ды разжыўся так, як той злодзей на коўры!

Анатоль Бігайдараў, *г. Гомель.*

ПАДМАНУЎ!

Першы дакументальны ўпамін пра наш Лучын датуецца 1136 годам. Якая яшчэ з нашых вёсак можа пахваліцца нечым падобным?..

Мо па гэтай прычыне ўсе лучынцы — і тыя, што некалі жылі, і тыя, што цяпер, і тыя, што будуць — ну страшэнна ганарыстыя...

А яшчэ мы любім пасмяяцца і другіх пасмяшыць, «нейкі жарт састроіць».

Хоць, як сведчыць жыццё, іх, гэтыя жарты, і «строіць» не трэба. Яны неяк самі...

То ў нас у вёсцы жанчына была (светлай памяці!), Нінаю звалі... Дужа энергічная: ёй што працаваць, што песню зацягнуць, — усюды першая... А вось прозвішча ў яе на літару «ш». Гэта значыць, шчыруе яна ў брыгадзе (гэта па-нашаму ў раслінаводстве), хваляць яе на калгасных сходах, але ж спісы перадавікоў састаўляюцца па алфавіце. Адпаведна — першая стаханаўка з яе літарай «ш» — у саменькім хвосціку: яе апошняй агучваюць. Прычым з году ў год.

Цярпела яна гэта, цярпела, ды неяк не вытрымала — на адным са сходаў з месца падхапілася ды і кажа: «Чым апошняй, лепш не пішыце мяне зусім!». Дзвярыма ляп і ходу — сышла...

А выраз — пакінула: гэта значыць, што час ад часу ў Лучыне ды ваколіцах ён гучыць.

Зрэшты — вось гэ

МОДА. ШОУ. МЛЫН.

На свае вочы

У Мінску завяршыўся XIX фестываль моды і фота «Млын моды-2010»

Даўно мінулі тыя часы, калі паказы новых калекцый ладзіліся ў атэлье і Дамах быту. Манекеншчыцы больш не выходзяць на словы «а гэта сукенка ідэальная для паходу ў кіно», а жанчыны больш не стаяць у чэргах, калі ў ЦУМ прывозяць сінія валёнкі з матылькамі. Сёння, каб быць модным, неабавязкова капіраваць іншых. Моду можна ствараць самому. 234 беларускія дызайнеры так і зрабілі.

Вы калі-небудзь бачылі нявесту, якая танчыць у вясельнай сукенцы і ў гумовых ботах? А жаніха, які носіць штаны-бананы з шынялём? На фестывалі «Млын моды-2010» эксперыментавалі не толькі з гэтым. Я нават не ўзгадваю «пра сюрпрыз ад MTV» Таццяну Алейнікаву і гурт Litesound, якія з усёй моцы спрабавалі трапіць у гукі фанаграмы, мяне ўразіла іншае. Калекцыі з намінацыі «Стылізацыя беларускага нацыянальнага саслоўнага і прафесійнага касцюма». Шапка-вушанка ў спалучэнні з кедамі, какошнікі для мужчын, рэйтузы, пашытыя з жаночай хусткі...

Трусы з нацыянальным узорам

Калекцыі «стылізацыі» з першага млынарскага дня апынуліся ў цэнтры ўвагі. Гэта іх вышуквалі ў сваіх каталогах пільныя журналісты, гэта пра іх шапталіся ў кулуарах цікаўныя гледачы, і ў многім дзеля іх прыехалі на «Млын» замежныя госці. Са слоў Сашы Варламава, каб стварыць усю гэту прыгажосць, дызайнерам давялося «вывучыць вялікую колькасць матэрыялаў, зазірнуўшы да суседзяў — у Польшчу, Літву, Расію, Украіну». Зазіранні не прайшлі дарма — беларускі розум нашыў 54 калекцыі. І як завярае гуру беларускай моды, гэты накірунак будзе працягнуты і надалей — як адзін з вядучых.

У стылізацыі няварта паўсюль вышукваць толькі валошкавы ўзор, альбо клін журавоў на ільняной тканіне. Усё роўна не знойдзеце. Беларускімі матывамі прасякнута кожная калекцыя. Іншая рэч, калі матывы беларускія мяжуюць з матывамі гуцульскімі ці казацкімі. Шапкі, шаблі, хусткі, боты, какошнікі...

Асабліва запомнілася калекцыя Алены Ліпкінай «Different» з ААТ «Алеся». Падчас гэтага паказу справа ад сябе я пачуў голас — нішто сабе, вось табе і Алеся... Спрачацца не буду — трусы з нацыянальным узорам я таксама бачыў упершыню. Але затое як сядзелі!

— Фальклорныя калекцыі — гэта жах. Але такі класны жах! — прызнаецца ў эксклюзіўным інтэрв'ю «Звяздзе» **дырэктар чэшскага агенцтва «Nari Models» Ёзаф ЧЭРНАК**. — Я вельмі паважаю такіх дызайнераў, бо і сам люблю эксперыментаваць.

— Вельмі спадабалася ідэя нацыянальнай часткі, — дзеліцца ўражаннямі **загадчык кафедры дызайну касцюма Вільнюскай мастацкай акадэміі Іаланта НАЗАЛІНСКЕНЕ**. — Яна асабліва моцная, цікавая і арыгінальная. І я заўважыла, што не толькі мы, але і іншыя замежныя эксперты звярнулі ўвагу на гэтыя калекцыі.

Між іншым, не толькі замежнікі, але і айчынныя прыхільнікі высокай моды не абмінулі ўвагай калекцыі беларускіх куцюр'е. **Дырэктар Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Сяргей ВЕЧАР,** пахваліўшы дызайнераў за вяртанне да нацыянальных вытокаў, узрадаваў усіх прысутных навіной — у Мінску будзе стварацца музей беларускага касцюма!

— У беларускай сталіцы яшчэ няма музея беларускай моды, але пачынаць яго фарміраванне ўжо можна, — падзяліўся радасцю спадар Вечар. — Два касцюмы з гэтых калекцый ужо перададзены ў наш музей. Яшчэ шэраг калекцый нашы супрацоўнікі выбралі для прэзентацыі на ночы музеяў 15 мая.

Дзве дзіцячыя калекцыі (таксама з серыі стылізаваных убораў) патранажны савет фестывалю выкупіў для выхаванцаў сталічнага дзіцячага дома № 5.

— Усе калекцыі парадавалі сваёй незвычайнасцю і ўменнем спалучаць абсалютна розныя матэрыялы, фактуры і формы, — гаворыць «Звяздзе» **модны партугальскі куцюр'е СЭЛЬСУ**. — Выпучыць кагосьці персанальна вельмі цяжка. У мяне склалася вельмі добрае ўражанне пра беларускую моду.

— Як звычайна — рабілі адно, атрымалася другое, — гаворыць «Звяздзе» дэбютантка «Млына моды», **адна з аўтарак стылізаванай калекцыі «На пероне» Аня ЛЕВІНА**. — Праца над калекцыяй заняла некалькі месяцаў. Перараблялі па некалькі разоў.

— Чаго, па-вашаму, беларускай модзе не хапае, і што вы можаце прапанаваць ёй новага?

— Калі я скажу, мяне выганяць з інстытута, — дзяўчына смяецца і дадае, — беларускай модзе не хапае моды. Мы яшчэ не выйшлі на еўрапейскі ўзровень, але мы туды ідзём. Гэта радуе.

І на нас паглядзець, і сябе паказаць

А калі заяўленыя калекцыі пачаткоўцаў беларускай моды скончыліся, зала падрыхтавалася да новага шоу, еўрапейскага.

Першай свае калекцыі паказала старэйшая (існуе з 1874 года) школа моды ў Берліне **«Lette Verein»**. Белыя лебядзіныя сукенкі мадэлі прэзентавалі басанож. Тут чыталася толькі адно слова — лёгкасць. І стварылі яе студэнткі-першакурсніцы «Lette Verein»...

— Я прыехала сюды з маімі маладымі дызайнерамі, — расказала «Звяздзе» **выкладчыца школы моды «Lette Verein» Анэта ХОФМАН**. — Падчас кожнага семестра ў нас адмысловы іспыт, калі студэнт атрымлівае заданне — стварыць касцюм. У залежнасці ад курса, на якім студэнт вучыцца, колькасць касцюмаў вагаецца. Старшакурснікі ствараюць ужо адмысловыя калекцыі. Што датычыцца беларускіх дызайнераў, то ідэі вельмі цікавыя, а ўвасабленні незвычайныя. Іншая эстэтыка, іншая культура. Адчуваецца іншы тып жанчыны, прыхільнасць да яркіх колераў, большая феміністычнасць. Галоўнае, што нам даў «Млын моды» — гэта сімвалы і арнаменты, якія мы пасля выкарыстаем у сваіх калекцыях.

Следам за немцамі ішлі калекцыі студэнтаў з універсітэта Уэльса (Брытанія). Мінімум колераў, гармонія і аднароднасць. Не хапала толькі аднаго — свежасці. Свежасць была ў іншым паказе — паказе Бертрана Соція з Бельгіі (**кампаніі IDress**). Вясенняя свежасць прымусіла гледачоў літаральна не дыхаць, захапляючыся прыгажосцю ўбораў.

Літоўскія дызайнеры прывезлі адразу некалькі калекцый. Тут, як і ў беларусаў, касцюмы былі рознымі: ад бясколерных празрыстых ботаў да вялікага рэспіратара, які больш паходзіў на наморднік...

Найбольшую ўвагу на сябе звярнулі Чэхія і Партугалія. І калі ад чэшскага куцюр'е публіка ўжо ведала чаго чакаць (мужчынскі касцюм з глыбокім выразам на сцёгнах двухгадовай даўніны дагэтуль жыве ў галовах гледачоў), то малады і таленавіты партугалец Сэльсу стаў сапраўдным адкрыццём «Млына-2010».

— Мае калекцыі заўсёды суправаджаюцца харэаграфіяй, гукам і святлом, — у інтэрв'ю «Звяздзе» прызнаецца малады **дызайнер і стваральнік аднайменнай кампаніі «Celsus», Кантаніа СЭЛЬСУ з горада Авейра (Партугалія)**. — Калекцыя, якую я прывёз, навеяна фільмам «Горад грахоў». Асноўныя колеры — шэры, чорны і чырвоны.

— А я сваімі паказамі заўсёды правакую, — распавядае **гуру чэшскай моды Ёзаф ЧЭРБАК**. — Мой паказ на «Млыне» называецца «крызіс». Ідэя простая. На подыум выйдуць пяць хударлявых хлопцаў і дзяўчат — нібыта беспрацоўных, якія яшчэ нідзе не ўкралі. Яны простыя і бедныя, але адзін аднаго паважаюць. Яны будуць трымаць у руках агонь — сімвал мужнасці...

Тэатралізаванае шоу. Вось што адрознівала калекцыі чэха і партугальца ад калекцый іншых дызайнераў. Вось што так падабалася публіцы і чаго так неставала маладым куцюр'е з Беларусі.

Ад «модных казак» да «сапраўднага дэфіле»

Галоўны беларускі «млынар» Саша Варламаў шоу усё ж зрабіў. Толькі ў адрозненне ад «модных казак» мінулага года сёлета гледачы убачылі іншую казку. Казку пад назвай «Сапраўднае дэфіле». 32 вядомыя беларускія персоны — тэлевядучыя, акцёры, спартсмены, шоумэны — прайшліся па подыуме ў касцюмах, спецыяльна пашытых для іх вядомымі беларускім дызайнерамі, якія некалі таксама пачыналі з «Млына».

Творчы тандэм маладых дызайнераў у складзе Ксеніі Кішчук, Наталлі Жураўскай, Таццяны Гнядзёнак, Анастасіі Мірановіч, Таццяны Марозавай і Вольгі Пад'ельскай папрацаваў на славу. Чаго толькі вартая сукенка, пашытая для заслужанай артысткі Беларусі Зінаіды Зубковай — жанчына ў ёй літаральна расцвіла. А народнай артыстцы Беларусі Наталлі Гайдзе не хапала толькі чырвонай дарожкі. Быццам народжаныя для подыуму аказаліся тэлевядучыя Ганна Эйсмант, Вольга Курышка і Вікторыя Сянкевіч...

❑ ❑ ❑

— Я ўпершыню на «Млыне моды», — дзеліцца ўражаннямі **намеснік кіраўніка місіі Пасольства Германіі ў Мінску Петэр ДАТМАР**, якога нечакана для сябе я сустрэў на фестывалі. — Я глыбока ўражаны актыўнасцю беларускіх дызайнераў. Паказы мяне прыемна здзівілі (асабліва нацыянальны каларыт), гэта сапраўды былі вельмі прафесійныя калекцыі. І я не здзіўлюся, калі праз пэўны час некаторыя з дызайнераў стануць знакамітымі на ўвесь свет.

— Цікава, вельмі цікава, — дапаўняе мужа **спадарыня Ілка ДАТМАР**. — Адчувалася дынаміка ў калекцыях. Магу зазначыць, што гэта нешта зусім адрознае ад еўрапейскай моды. Нешта сваё, але вельмі арыгінальнае.

Мода — гэта як дзіцячая гульня, у якую гуляюць па ўсім свеце. У ёй ёсць тканіна, нажніцы і нітка з іголкай. Задача — пашыць сукенку. Умовы ва ўсіх аднолькавыя. А вось вынік — розны. Дзевятнаццаць гадоў існуе «Млын», дзевятнаццаць гадоў маладыя беларускія дызайнеры гуляюць у моду. Гуляюць усе, перамагаюць адзінкі.

Ілья ЛАПАТО.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«Млын» у лічбах:

***234 беларускія дызайнеры,** у т. л. **18 дызайнераў-мужчын,** прынялі ўдзел у **XIX фестывалі** «Млын моды-2010». За **3 дні** было прэзентавана **207 калекцый у 9 намінацыях**. На праекце працавалі **1 вядучы, 6 цырульнікаў і 8 стылістаў**. У паказах прынялі ўдзел **60 беларускіх мадэляў,** кожная з якіх прайшла па подыуме **каля 6 кіламетраў**. **2 хвіліны** доўжыўся ў сярэднім паказ адной калекцыі, **13 гадзін** спатрэбілася ў выніку, каб паглядзець выхады ва ўсіх намінацыях, **7 калекцый** паказала ў сярэднім адна мадэль, **15 чалавек** — максімальная лічба мадэляў, якія знаходзіліся на подыуме адначасова. **Каля двух метраў тканіны** пайшло ў сярэднім на пашыў аднаго касцюма. **26 беларускіх калекцый** было адабрана ў выніку замежнымі куцюр'е, **28 дызайнераў** паедуць на стажыроўку ў вядучыя школы моды Еўропы. На фестываль прыехалі госці з **9 краін** свету, для якіх працавалі **3 перакладчыкі**. **32 персоны** ўдзельнічалі ў паказе «Сапраўднае дэфіле». **25 тысяч** каштаваў для гледачоў буклет са здымкамі прэзентаваных калекцый. Акрэдытацыю на фестываль атрымалі **54 журналісты**, сярод якіх **2 карэспандэнты «Звязды»**.*

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.14	20.59	15.45
Віцебск —	4.59	20.54	15.55
Магілёў —	5.04	20.49	15.45
Гомель —	5.07	20.39	15.32
Гродна —	5.30	21.12	15.42
Брэст —	5.37	21.07	15.30

Месяц

Маладзік 14 мая.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Ганны, Жанны, Марыі, Яны, Аўсея, Віталя, Кірылы, Максіма.*

К. *Міры, Ігната, Кірылы, Францішка, Якуба.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



11 мая

Дзве даты

1939 год — пачаўся ўзброены канфлікт паміж СССР і Японіяй ля ракі Халхін-Гол на тэрыторыі Манголіі. Баявыя дзеянні працягваліся да канца жніўня і закончыліся поўным разгромам 6-й асобнай арміі Японіі. Гэтае паражэнне стрымала японцаў ад уступлення ў вайну супраць Савецкага Саюза на баку фашысцкай Германіі ў 1941 годзе.

1937 год — Сталін атрымаў пасланне ад прэзідэнта Чэхаславакіі Э. Бенеша аб змове, якая быццам бы рыхтуецца супраць яго кіраўніцтвам Чырвонай Арміі. Літаральна праз некалькі дзён пачнуцца «чысткі» сярод ваенных, адной з першых ахвяр стане маршал Тухачэўскі. Пазней, пасля вайны, будзе высветлена, што інфармацыю аб «змове» прэзідэнту Бенешу падкінулі германскія спецслужбы, якія ўсё правільна для сябе разлічылі.

Цытата дня:

«Людзі ў большасці сваёй жыва цікавяцца ўсім на свеце, за выключэннем таго, што сапраўды трэба было б ведаць».

Оскар Уайльд (1854—1900), англійскі пісьменнік.

ЗАБАРОНЫ ДЛЯ ЦЯЖАРНАЙ

Свет і сусвет

Практычна ўсе абмежаванні і забароны або рэгламентацыі для цяжарнай жанчыны аб'яднаныя адным і тым жа прынцыпам: адбываецца фарміраванне новага чалавека, і пакуль новае жыццё не заявіць пра сябе ў час нараджэння, жанчыне катэгарычна забараняецца «кантактаваць» з усімі рэаліямі зямнога існавання, якія мелі пераходны статус. Парог — сімвалічная мяжа паміж жывымі і продкамі; узмежак — пераходная зона паміж сваім і чужым; скрыжаванне дарог — рытуальная зона паміж «тым» (зноў-такі чужым) і гэтым светам; новабудоўля — стан незакончанасці; млын і гумно ў міфалогіі славян былі функцыянальна-статусна збліжаныя з балотам — зонай існавання (гуртавання) усіх «цёмных» сілаў.

● Цяжарнай жанчыне пад страхам смерці забаранялася прысутнічаць падчас абмывання, пераапранання і іншых рытуальных дзеянняў, якія выконваліся у дачыненні да памерлага.

● Лічылася, што дзіця будзе плаксівым, калі маці есць на хаду, глядзіць на агонь, разбурае птушыныя гнёзды. Калі яна есць што-небудзь кіслае, часта злуецца або сварыцца з кім-небудзь, малое будзе нястрыманым і злым. Каб пазбегнуць разумовых парушэнняў дзіцяці, нельга было заглядваць у труну. Цяжарнай не пажадана было браць ваду ў калодзежы: расплясканая з вядра вада справакуе адляванне дзіцем выпітага малака.

● Вядома шмат прадпісанняў, выкананне якіх магло спрыяць нараджэнню прыгожага дзіцяці. Лічылася, што дзіця будзе падобным на таго, на каго паглядзіць цяжарная, калі пачуе першае варушэнне плода. Ёй раілі даесці крошкі хлеба, якія не даела прыгожае дзіця. Каб дзіця не было «белым як смерць», нельга глядзець на нябожчыка, затое трэба часцей глядзець на іконы.

● Неабходна звярнуць увагу на тое, што ў славянскай традыцыі цяжарная жанчына не магла быць хроснай маці (пампрэ ці яе дзіця, ці яе хрэснік), свахай або дружкай на вяселлі (маладым пагражала няшчасце), ёй забаранялася прысутнічаць і падчас апранання нявесты.

● Парады сучасным маладым жанчынам, якія хочуць нарадзіць дзіця. У кожнай рэчцы ёсць два берагі. Адзін пакаты, засыпаны цёплым драбнюткім жвірам. Па ім з асалодай зойдзеш у ваду, пакупаешся і выйдзеш абноўленым. Другі бераг — высокі, пакручасты, з рэзкімі непрадказальнымі паваротамі, побач з якімі павольная плынь пучыцца жудаснымі вірамі. Ніводны нармальны чалавек не пажадае нырнуць з такога берага, бо нельга прадказаць вынік эксперымента.

Жыццёвая плынь таксама віруе між двума берагамі. Таму, калі вы збіраецеся нарадзіць дзіця, за некалькі месяцаў да зачацця пастаўце сябе ў жорсткія рамкі звычайнага права і маралі, максімальна выкарыстайце вопыт сваіх бабуль — і на свет з'явіцца здаровы і прыгожы чалавечак, які ўсё жыццё будзе прыносіць радасць.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Маці з дачкой.
— Ты што — піва піла?!
— Не!
— А я па выразе твару бачу, што так!
— Мама, я чубок падстрыгла...

☺

Апошнія даследаванні паказалі: меркаванне, што карова дае малако і мяса — памылковае! І тое, і іншае ў яе адбіраюць!

☺

У Іванава падчас белага танца затапталі мужчыну!

☺

Адэская аптэка.
— Выбачайце, а колькі ў вас каштуе снатворнае?
— Тры долары, і то — выключна для вас, мадам!
— Вой, не смяшыце мяне! За такія грошы я наогул ніколі не засну!

ДЛЯ МУЖЧЫНСКАГА ЗДАРОЎЯ НЕБЯСПЕЧНЫЯ ПРЫГАЖУНІ

Як высветлілі іспанскія навукоўцы, усяго 5 хвілін стасункаў з вельмі прывабнай жанчынай нясуць мужчыну гэткі ж стрэс, што і скачок з парашутам. Сустрэча з прыгажуняй выклікае значны ўсплёск узроўню стрэсавага гармону картызолу ў крыві мужчын, а пастаянныя кантакты ўвогуле пагражаюць развіццём такіх небяспечных хвароб, як цукровы дыябет, гіпертанія і нават імпатэнцыя!

Навукоўцы з Дзяржаўнага ўніверсітэта Валенсіі прыцягнулі да свайго эксперымента 84 студэнты. Кожны з удзельнікаў павінен быў рашыць папулярную галаваломку «судоку», знаходзячыся ў пакоі з двума незнаёмцамі — мужчынам і жанчынай. Назіраючы за ўзроўнем картызолу ў крыві падвыпрабавальных, вучоныя выявілі цікавую ўзаемасувязь: калі ў пакоі знаходзілася прыгожая жанчына, узровень гармону стрэсу быў высокім. Варта было ёй выйсці, як ён зніжаўся да нормы, аднак пры вяртанні жанчыны — імгненна ўздымаўся зноў да максімальных значэнняў. Даследчыкі прыйшлі да высновы, што большасць мужчын у прысутнасці маладой прывабнай асобы абдумваюць магчымасць пачаць заляцацца да яе — асабліва калі гэта незнаёмая жанчына. Дастаткова пяці хвілін, каб у крыві мужчыны адбыўся значны ўсплёск картызолу, які сведчыць аб стрэсе.

Лішак картызолу, між тым, прыводзіць да збою клетачнага метабалізму і можа выклікаць такія захворванні, як дыябет ці гіпертанія. Між тым у невялікіх дозах той жа гармон аказвае на арганізм станоўчае ўздзеянне: адказвае за дастаўку глюкозы ў кроў, звужэнне венаў у асобных участках, стымуляцыю апетыту, а таксама мае супрацьзапаленчыя і супрацьалергічныя ўласцівасці.

МАЛА СПАЦЬ — ШКОДНА! МНОГА ТАКСАМА

Людзі, якія трацяць на сон не менш за шэсць, але не больш за восем гадзін у суткі, менш за астатніх падвержаныя рызыцы заўчаснай смерці. Да такой высновы прыйшлі спецыялісты з універсітэта Уорвіка і ўніверсітэта Фрыдрыха II у Неапалі.

Навукоўцы прааналізавалі звесткі 16 розных даследаванняў працягласці жыцця і рэжыму сну, у якіх удзельнічалі больш за 1,3 мільёна жыхароў Еўропы, ЗША і Азіі, і ўстанавілі, што аптымальная працягласць сну, не звязаная з магчымымі негатыўнымі наступствамі для здароўя і жыцця чалавека, складае ад 6 да 8 гадзін за суткі.

«Стабільны рэжым аптымальны для здароўя чалавека, — прыводзіць прэс-служба ўніверсітэта Уорвіка словы кіраўніка даследавання Франчэска Капучыа. — Працягласць сну трэба разглядаць як дадатковы паводзінскі фактар рызыкі, на які ўплывае вонкавае асяроддзе і які, пэўна, можна змяніць з дапамогай мераў сістэмы аховы здароўя». Так, статыстычны аналіз звестак паказаў, што для тых людзей, хто пастаянна спаў менш за 6 гадзін за ноч, рызыка заўчаснай смерці на працягу 25 гадоў была на 6—18 % вышэйшая, чым для тых, хто адводзіў для сну 6—8 гадзін. У той жа час для тых, хто рэгулярна спаў больш за 9 гадзін за суткі, рызыка заўчаснай смерці павышалася на 22-38 %, прычым, як мяркуюць аўтары даследавання, працяглы сон у гэтым выпадку можа быць сімптомам, а не прычынай розных захворванняў і агульнага пагаршэння здароўя.

ХАВАЙЦЕ ВАШЫ ГРОШЫКІ... З ФАНТАЗІЯЙ

З надыходам цёплых дзён большасць гараджан імкнецца хутчэй трапіць на дачу. У гэты час рэзка павялічваецца колькасць кватэрных крадзяжоў. Пры гэтым, як паказвае практыка, рабаўнікі звычайна правяраюць адзін і той жа набор «тайнікоў» — прыкладна палову крадзяжоў здзяйсняюць зладзеі, якія добра валодаюць тактыкай бобыску.

У сувязі з гэтым, напрыклад, расійскія спецыялісты МУС нават склалі памятку для суграмадзян, дзе не трэба хаваць грошы і каштоўныя рэчы:

— найгоршымі тайнікамі з'яўляюцца люстэркі, карціны, насценныя дываны — яны лёгкадаступныя, кідаюцца ў вочы і «прамацваюцца» дамушнікамі ў першую чаргу. Дарэмна выкарыстоўваць з гэтай мэтай і бачок унітаза — ён хоць і патрабуе часу на ўскрыццё, але як тайнік гэта занадта відавочны выбар. Дрэнным выбарам лічыцца таксама відэа-, аўдыёапаратура і бытавая тэхніка — ёсць верагоднасць, што яе вынесуць з кватэры разам з каштоўнасцямі;

— больш за чвэрць (26 %) расіян чамусьці лічаць самым надзейным месцам для захоўвання каштоўнасцяў бялізну і вопратку — адпаведна, менавіта шафы і камоды з ёй не забываюць праверыць злачынцы;

— такая ж колькасць гараджан, паводле статыстыкі, выбірае ў якасці тайнікоў мэблю і музычныя інструменты — горкі, пісьмовыя сталы, тумбачкі, піяніна і г.д.;

— 20 % расіян хаваюць грошы ў кнігах або паміж імі, а таксама ў відэакасетах і кампакт-дысках;

— 10 % спадзяюцца, што ў зламыснікаў не дойдуць рукі да антрэсоляў, таму кладуць грошы і каштоўнасці ў рэчы на гэтых паліцах;

— 7 % расіян давяраюць свае грошы... матрацу — хаваюць унутры або пад ім;

— 6 % гарадскіх жыхароў выбіраюць у якасці схованак кухонную тэхніку і посуд — халадзільнік, духоўку, слоікі з крупамі і нават хатнімі нарыхтоўкамі (так і ўзгадваецца несмяротная камедыя «Брыльянтавая рука»);

— 4 % падыходзяць да справы адказна і выкарыстоўваюць для міні-тайнікоў падлогу і сцены — на іх рабаўнікі звяртаюць увагу ў апошнюю чаргу.

ДЫЯГНАЗ «ШАЛЕНСТВА» ПАЦВЕРДЗІЎСЯ

Яшчэ 24 красавіка ў вёсцы Куцянята Валожынскага раёна ў СВК «Лоск» загінула цялушка з мяркуемым дыягназам «падазрэнне на шаленства». Усяго на ферме ўтрымлівалася 171 галава маладняку буйной рагатай жывёлы.

Лабараторныя даследаванні пацвердзілі дыягназ. Ферма абвешчаная неспрыяльнай па шаленстве.

Увогуле, па вынніках мінулага года ў краіне было зарэгістравана 984 выпадкі шаленства сярод жывёлы, у тым ліку 643 выпадкі сярод дзікай, 200 — сярод хатняй (сабак, катоў, уключаючы і бадзяжных) і 141 выпадак — сярод сельскагаспадарчай жывёлы. У параўнанні з 2008 годам колькасць захворванняў шаленствам жывёлы скарацілася на 6,6 працэнта. У эпізаатычны працэс было ўцягнута 93 працэнты (120 са 129) адміністратыўных тэрыторый краіны (раёны, вылучаныя гарады). Сярод абласцей найбольшая колькасць захворванняў шаленствам была зарэгістраваная ў Гродзенскай вобласці (293 выпадкі), самая спрыяльная была Брэсцкая вобласць (63 выпадкі). Асноўнымі прычынамі актывізацыі эпізаатыі прыроднага шаленства сталі, па-першае, некіруемы рост колькасці ліс — асноўнага прыроднага рэзервуара рабічнай інфекцыі, па-другое, недастатковасць і неэфектыўнасць імунізацыі дзікай драпежнай жывёлы — асноўнага мерапрыемства па заглушэнні прыроднага шаленства. Плошчы паляўнічых угоддзяў, ахопленыя прынадамі з вакцынай для імунізацыі летась склалі 36,6 тысячы квадратных кіламетраў замест 100 тысяч квадратных кіламетраў (каля 17,6 працэнта ад плошчы краіны).

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 2239. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12